Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

Б Е Л А Р У С К А Я Г А З Е Т А

7 САКАВІКА 2007 г.
СЕРАДА

№ 45 (25910)

Кошт 400 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 Г.

Дзякуй за сардэчнасць, цярпенне і любоў!

Дарагія жанчыны!

Ад усяго сэрца віншую вас з цудоўным веснавым святам — Днём жанчын.

Сваёй абаяльнасцю і душэўнасцю, дабрынёй і спагадлівасцю вы ўпрыгожваеце жыццё і напаўняеце цяплом любові сэрцы родных і блізкіх.

Год дзіцяці, які прыйшоў на змену Году маці, зноў нагадвае нам, што ў гэтым свеце няма нічога больш святога, чым жанчына, якая падарыла жыццё дзецям і навучыла іх першым крокам.

Беларускія жанчыны па праву з'яўляюцца ўвасабленнем хараства, пяшчоты і вернасці.

У гэты святочны дзень жадаю вам здароўя і шчасця, кветак і ўсмешак. Няхай вам спадарожнічаюць удача, дабрабыт, добры настрой, радасць адкрыццяў і творчасці. Няхай вакол вас будуць уважлівыя і клапатлівыя мужчыны.

Дзякуй вам, мілыя жанчыны, за сардэчнасць, цярпенне і любоў!

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь
Аляксандр ЛУКАШЭНКА.

Беларусь і ААЭ: праекты папярэдне ацэньваюцца ў $100 млн

Беларусь і Аб'яднаныя Арабскія Эміраты на вышэйшым узроўні прадэманстравалі гатоўнасць істотна пашырыць двухбаковае ўзаемадзеянне і актывізаваць супрацоўніцтва ў многіх сферах. Такі галоўны вынік візіту Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі ў ААЭ, які праходзіў 4—6 сакавіка.

6 сакавіка, у завяршальны дзень знаходжання ў гэтай краіне, Аляксандр Лукашэнка наведаў маўзалей першага прэзідэнта ААЭ шэйха Заіда бен Султана Аль Нахаяна, які адыграў ключавую ролю ў стварэнні ўнікальнай федэрацыі эміратаў, што стала за кароткі тэрмін адной з найбольш эканамічна развітых дзяржаў свету. У маўзалеі беларускі лідар пакінуў запіс у Кнізе ганаровых гасцей.

Перад адлётам з Абу-Дабі ў Мінск кіраўнік дзяржавы адказаў на пытанні прадстаўнікоў СМІ. «Уражанні надзвычайныя. Гэта казачна багатая краіна, дзяржава вельмі дынамічна развіваецца. Пры гэтым сёння ў іх самыя вялікія даходы не ад нафты, а ад інвестыцый за мяжу. І яны ўкладваюць сродкі толькі ў значныя праекты», — сказаў Прэзідэнт.

Падводзячы вынікі праведзеных перагавораў, беларускі лідар выказаў задавальненне іх вынікамі. У Беларусі Аб'яднаныя Арабскія Эміраты цікавяць вельмі многія напрамкі ўзаемадзеяння і праекты. Пры гэтым беларускі бок не выключае ніякіх сфераў: размова ідзе як аб магчымасці развіцця кантактаў у навуцы і ваенна-тэхнічнай галіне, так і аб інвестыцыях у інфраструктуру і нафтаперапрацоўку, растлумачыў кіраўнік дзяржавы.

Цяпер ідзе прадметны дыялог аб прапановах і праектах, якія папярэдне ацэньваюцца ў $100 млн. Частка з іх ужо рэалізуецца, заявіў Прэзідэнт.

Паводле слоў беларускага лідара, у свой час у яго склаліся дружалюбныя і даверлівыя адносіны з папярэднім лідарам ААЭ — шэйхам Заідам бен Султанам Аль Нахаянам, які карыстаўся безумоўным аўтарытэтам у ісламскім свеце. Сустрэчы з цяперашнім вышэйшым кіраўніцтвам таксама прайшлі канструктыўна. «Гэта краіна для нас зразумелая, дзе на чале ўлады людзі, якія паважаюць Беларусь і наш народ», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

«Самае галоўнае — нам не трэба адзін да аднаго прыглядацца. На Усходзе доўга вывучаюць краіну, людзей — проста так грошы ніхто не ўкладвае. Цяпер, як мы канстатавалі, гэты працэс скончыўся, і Эміраты вельмі задаволены стабільнасцю ў нашай краіне. Яны б з вялікім задавальненнем прыйшлі ў Беларусь», — дадаў Прэзідэнт.

Дасягнута дамоўленасць аб тым, што ў маі гэтага года наследны прынц эмірата Абу-Дабі, намеснік Вярхоўнага галоўнакамандуючага Узброенымі Сіламі ААЭ шэйх Мухамед бен Заід Аль Нахаян наведае Беларусь. Плануецца падпісаць 3—4 вельмі важныя буйныя пілотныя пагадненні. Цяпер яны прапрацоўваюцца. Немалаважны факт — у ходзе візіту Прэзідэнта Беларусі ў ААЭ створана сумесная камісія, якую з беларускага боку ўзначаліў Дзяржаўны сакратар Савета Бяспекі Віктар Шэйман. Камісія пачала ўжо сваю дзейнасць. Кіраўніку дзяржавы было таксама зададзена пытанне наконт прыцягнення ў беларускую эканоміку расійскага крэдыту ў памеры $1,5 млрд. Аляксандр Лукашэнка растлумачыў, што пытанне аб крэдыце было ўзнята, калі Беларусь і Расія «вельмі моцна спрачаліся і дайшлі да канфлікту па нафтагазавых пытаннях». «Тады я прама і шчыра сказаў расійскаму кіраўніцтву: вы можаце ўзнімаць цэны да неймаверных памераў, але майце на ўвазе, што мы не зможам хутка, пакуль эканоміка не адбудуецца, з вамі разлічыцца за прыродны газ і нафту. Мы сказалі ўраду Расіі, каб яны нас падтрымалі (а праз нас — фактычна свае кампаніі) за нармальныя працэнты. Расійскі бок заявіў, што разгледзіць гэта пытанне», — адзначыў беларускі лідар.

Разам з тым, паводле слоў Прэзідэнта, сітуацыя «не так катастрафічна складваецца, як мы чакалі». «Ніякай катастрофы няма, мы нават ВУП трымаем на ўзроўні амаль 10 працэнтаў прыросту. Тым не менш, гэты крэдыт дапаможа не дапусціць у далейшым магчымай дэстабілізацыі па нейкіх напрамках нашай эканомікі. Дзякуй Богу, абышлося, але ад крэдыту мы не адмаўляемся», — дадаў ён. На думку Аляксандра Лукашэнкі, выдзяленне крэдыту Беларусі выгадна і самім расіянам. «Вы бачыце па Эміратах: яны грошы ў скарбонцы не трымаюць, а ўкладваюць ў нерухомую маёмасць, праекты, крэдытуюць іншыя дзяржавы», — сказаў на заканчэнне Прэзідэнт.

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

Прэзідэнт павіншаваў з 70-годдзем першую жанчыну-касманаўта Валянціну Церашкову

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка 6 сакавіка павіншаваў з 70-годдзем першую жанчыну-касманаўта Валянціну Церашкову.

«Вы належыце да слаўнай плеяды людзей, якія маюць найлепшыя чалавечыя якасці. Ваша плённая грамадская дзейнасць прынесла вам сусветную павагу», — сказана ў пасланні.

Кіраўнік дзяржавы пажадаў Валянціне Церашковай здароўя, даўгалецця і веры ў ажыццяўленне задуманых спраў.

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Любімыя жанчыны

Даніка Волкава

Прабабуля Соф'я Максімаўна Пліско, бабуля Наталля Барысаўна Позняк і маці Галіна Іванаўна... в. Камень, Лепельскі раён.

У Беларусі для спынення каналаў гандлю рабамі створаны дакладны каардынацыйны механізм

У Беларусі створаны дакладны каардынацыйны механізм на чале з МУС для выяўлення і спынення каналаў гандлю рабамі. Аб гэтым паведаміла намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Наталля Пяткевіч на тэматычным форуме ў рамках міжнароднай канферэнцыі «Гандаль жанчынамі і дзяўчынкамі: вырашаем праблему разам». Мерапрыемства адбылося 5 сакавіка ў Нью-Йорку ў штаб-кватэры ААН.

Канферэнцыя была арганізавана пастаяннымі прадстаўніцтвамі Беларусі і Філіпін пры ААН, Упраўленнем ААН па наркотыках і злачыннасці і буйнейшай міжнароднай няўрадавай арганізацыяй «Вайтл Войсіз». Як паведамілі ў МЗС, на міжнароднай канферэнцыі Беларусь прадстаўлялі Наталля Пяткевіч і міністр унутраных спраў Уладзімір Навумаў. У сваім выступленні Наталля Пяткевіч адзначыла, што Беларусь першая на постсавецкай прасторы разгарнула маштабную барацьбу з гандлем людзьмі, зрабіла шэраг захадаў у мэтах прадухілення ўцягнення самых неабароненых слаёў насельніцтва — жанчын і дзяўчынак — у злачынны бізнэс. У Беларусі на нацыянальным узроўні створаны дакладны каардынацыйны механізм для выяўлення і спынення каналаў гандлю рабамі, пакаранні арганізатараў гэтых злачынстваў і рэабілітацыі былых ахвяр гандлю людзьмі. Беларусь імкнецца да стварэння такога ж дакладнага каардынацыйнага механізма і на міжнародным узроўні пад эгідай ААН. Выказана надзея на тое, што канферэнцыя дасць пачатак міжнароднаму працэсу, які прывядзе да распрацоўкі стратэгіі ААН па барацьбе з гандлем людзьмі. Многія ўдзельнікі канферэнцыі падкрэслілі, што форум у ААН унясе важкі ўклад у падрыхтоўку Глабальнай міжнароднай канферэнцыі па барацьбе з гандлем людзьмі, правядзенне якой запланавана ў Вене ў лістападзе 2007 года.

БЕЛТА.

Ці зменяцца ўзаемаадносіны Беларусі і ПАСЕ?

2—5 сакавіка старшыня Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Генадзь Навіцкі знаходзіўся з рабочым візітам у Рыме. Падчас візіту старшыня верхняй палаты беларускага парламента прыняў удзел у міжнароднай канферэнцыі «Роля парламентаў у вызначэнні палітыкі развіцця інфармацыйнага грамадства».

Падчас візіту ў Рым адбылася сустрэча Генадзя Навіцкага з віцэ-прэзідэнтам Парламенцкай асамблеі Савета Еўропы Андрэа Рыгоні. Гэты дэпутат італьянскага парламента быў нядаўна абраны новым дакладчыкам па Беларусі ў ПАСЕ.

На думку старшыні Савета Рэспублікі, гэтае прызначэнне можа пачаць «растопліваць лёд» ва ўзаемаадносінах Беларусі і ПАСЕ, бо новы віцэ-прэзідэнт гэтай арганізацыі не мае надзвычай крытычнага стаўлення да ўнутрыпалітычнай сітуацыі ў Беларусі. Дагэтуль жа, паводле слоў Генадзя Навіцкага, «нам «шанцавала» на гэтых дакладчыкаў. Яны былі з самага пачатку вельмі агрэсіўна настроены супраць Беларусі...»

«У нашай гутарцы ён заявіў пра тое, што заступіў на пасаду, каб паспрабаваць рэальна змяніць сітуацыю ў адносінах Беларусі з Парламенцкай асамблеяй. Бо, паводле яго слоў, палітыка, якую да гэтага часу праводзілі Еўрасаюз і Парламенцкая асамблея, з'яўляецца тупіковай і трэба выходзіць з гэтай сітуацыі», — дадаў Генадзь Навіцкі.

Сяргей КУЗНЯЦОЎ.

ЭКАНОМІКА ПАТРАБУЕ ІНВЕСТЫЦЫЙ

ВА УРАДЗЕ

Сёлета прадугледжваецца, што ў рэспубліцы тэмп росту інвестыцый у асноўны капітал складзе 114,5—117 працэнтаў. Як плануецца, будзе прыцягнута ў эканоміку 24 трыльёны рублёў інвестыцый, або ў эквіваленце прыкладна каля 11 мільярдаў долараў. Гэта істотная сума, зазначыў на пасяджэнні Прэзідыума Савета Міністраў, на якім разглядаўся праект пастановы «Аб інвестыцыйнай дзейнасці ў Рэспубліцы Беларусь на 2007 год», міністр эканомікі Мікалай Зайчанка.

Паводле слоў міністра, спецыялістамі ў чарговы раз прааналізаваны асноўныя прычыны, па якіх сёння замежныя інвестыцыі, што прыцягваюцца ў беларускую эканоміку, не адпавядаюць яе інвестыцыйным патрабаванням. Сярод прычын, якія стрымліваюць інвестыцыйны працэс, Мікалай Зайчанка ўзгадаў неабходнасць правядзення конкурсаў, тэндараў, патрабаванне аб выплаце пазычальнікам уваязных мытных пошлін, наяўнасць у патэнцыйных пазычальнікаў запасычанасці перад бюджэтам і банкамі. Каб падобныя праблемы не перашкаджалі працаваць, Мінэканомікі падрыхтавала праект Указа Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь «Аб мерах па прыцягненню крэдытных рэсурсаў Кітайскай Народнай Рэспублікі»: на прыкладзе вырашэння праблем па кітайскай крэдытнай лініі можа быць выпрацаваны пэўны механізм, які дазволіць вырашаць у будучым праблемы па пытаннях інвеставання пры працы з іншымі крэдытнымі лініямі.

На 2007—2010 гады Міністэрства эканомікі фарміруе пералік прыярытэтных інвестыцыйных праектаў. Сёння, падкрэсліў Мікалай Зайчанка, ёсць ужо 150 такіх праектаў на суму 3 мільярды долараў. Дарэчы, каб стымуляваць прыток замежных інвестыцый у рэспубліку, Міністэрства эканомікі распрацавала і шэраг мераў для гэтага. У прыватнасці, неабходна, адзначыў міністр, унесці змяненні ва ўмовы функцыянавання свабодных эканамічных зон. Гэта і забеспячэнне стабільнасці заканадаўства ў СЭЗ, і адпрацоўка працэдуры па строгай рэгламентацыі тэрмінаў рэгістрацыі рэзідэнтаў СЭЗ і інш.

Ігар ШЧУЧЭНКА.

ДЛЯ САШЫ — АДЗІН ВУЧЭБНЫ ПЛАН, ДЛЯ КАЦІ — ДРУГІ, А ДЛЯ АНТОНА — ТРЭЦІ

З першых крокаў па прасторных калідорах гімназіі № 1 г. Ліды складваецца ўражанне, што ты знаходзішся не ў школьным будынку, а ў вялікім і цёплым, утульным доме. Усмешлівыя твары гімназістаў, настаўнікаў, дываны на падлозе, карціны на сценах, куткі адпачынку ствараюць нейкую асаблівую атмасферу. Гімназія ж, хоць і аснашчана згодна з існуючымі стандартамі тымі ж камп'ютарамі, але зусім не лідар па матэрыяльнай базе на Гродзеншчыне. Зрэшты, як толькі дырэктар гімназіі, член Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі Наталля Зайцава пачынае расказваць пра сваіх выхаванцаў і калег па настаўніцкай працы, то нейкія сумныя ноткі адыходзяць убок.

З 1998 года практычна ўсе выпускнікі гімназіі паступаюць у ВНУ, а з 2004 года студэнтамі сталі ўсе лідскія гімназісты, прычым больш за 80 працэнтаў з іх займаюцца на бюджэтнай форме навучання. Ужо традыцыйна яны і сярод тых лічаных чалавек у краіне, хто набраў 100 балаў па таму ці іншаму прадмету на цэнтралізаваным тэсціраванні. Плюс першы на працягу шэрагу гадоў радок у абласным рэйтынгу сярэдніх школ і навучальных устаноў новага тыпу (гімназіі, ліцэі) па колькасці пераможцаў раённых, абласных і рэспубліканскіх алімпіяд. Толькі за апошнія тры гады 31 лідскі гімназіст першынстваваў у рэспубліканскіх, 83 — у абласных і 111 чалавек — у раённых прадметных алімпіядах. Вось і ў гэтым навучальным годзе 27 выхаванцаў гімназіі № 1 г. Ліды сталі пераможцамі абласных алімпіяд, у тым ліку 12 адзінацыкласнікаў — практычна кожны пяты выпускнік 2007 года.

Навуковае таварыства навучэнцаў гімназіі ўдастоена прэміі спецыяльнага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па сацыяльнай падтрымцы адораных вучняў і студэнтаў. Лідскія гімназісты 80 разоў атрымлівалі прэміі гэтага фонду, 14 чалавек — стыпендыю імя Аляксандра Дубко Гродзенскага аблвыканкама, 41 — стыпендыі Лідскага райвыканкама. Гімназія была двойчы ўзнагароджана Падзячнымі пісьмамі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Аляксандра Лукашэнкі. Імя дырэктара гімназіі занесена ў Кнігу Славы Гродзенскай вобласці.

(Заканчэнне на 2-й стар.)

А на мой погляд...

«Не бачыў чалавека 10-20 гадоў і раптам ён знаходзіць твой тэлефон і віншуе»

Што для вас 8 Сакавіка: адно з самых любімых святаў ці проста выхадны дзень? Ці ўдалося ў апошнія гады здзівіць вас сваімі віншаваннямі і падарункамі мужчынам у сям'і, калегам на працы? Ці ёсць самы дарагі для вас падарунак, які вам дарылі на 8 Сакавіка?

Аляксандра ЧАРНЯК, генеральны дырэктар РУП «Белпошта»:

— Я лічу гэты дзень святам. У маёй сям'і тры мужчыны і толькі адна я жанчына, і кожнае 8 Сакавіка ў мужчын маёй сям'і атрымліваецца здзівіць мяне. Прыемна, калі ў гэты дзень вызваляюць ад усіх праблем, ад усёй руціны. Ды яшчэ раніцай дораць кветкі. А на працы... У «Белпошце» ў асноўным працуюць жанчыны. І нам прыемна, што нас віншуюць кліенты. Які падарунак я лічу самым дарагім? У дзіцячым садку маё дзіця зрабіла сваімі рукамі падарунак і я яго захоўваю да сённяшняга дня. Хоць маім дзецям зараз ужо па трыццаць гадоў.

Зінаіда БЯРЭЗІНА, намеснік генеральнага дырэктара ЗАТ «Пінскдрэў»:

— Гэта свята не толькі для жанчын, але і для ўсіх жыхароў Беларусі. А здзівіцца на свята мяне прымушалі прыгожыя букеты кветак.

Вольга АБРАМАВА, член Камісіі па дзяржаўнаму будаўніцтву, мясцоваму самакіраванню і рэгламенту Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу:

— 8 Сакавіка — гэта агульнае свята. Бо ў асноўным у гэты дзень людзі святкуюць прыход вясны, абуджэнне прыроды, а таксама абуджэнне сваіх надзей на будучае. Часам мяне здзіўляе, хто віншуе са святам. Бывае, што не бачыў чалавека 10—20 гадоў і раптам ён знаходзіць твой тэлефон і віншуе. Асобныя выбаршчыкі лічаць магчымым патэлефанаваць у час, калі ўся мая сям'я ўжо спіць. І часам здзіўляюць выпадкі, калі дораць кветкі, якіх у магазінах няма і быць не можа.

Сяргей КУЗНЯЦОЎ.

Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

У інтэр'ерах Брэсцкага ААТ «Савушкін прадукт» прыбавілася кветак — знак блізкага свята 8 Сакавіка. У адным з пакояў фотааб'ектыў убачыў за вялікім букетам прыгожы добразычлівы твар — гэта начальнік планава-эканамічнага аддзела Таццяна Ігнацюк. Яе і ўсю жаночую палову калектыву прадпрыемства калегі шчыра віншуюць са святам.

БЕЛАРУСБАНК

Сделайте себе и близким подарок!

АСБ «Беларусбанк» информирует, что прием денежных средств на срочный банковский вклад в белорусских рублях «Падарунак» и срочный банковский вклад в иностранной валюте «Праздничный» продлевается на период с 8 марта по 8 мая 2007 года включительно.

Новый срочный банковский вклад в белорусских рублях
«ПАДАРУНАК».

Срок хранения вклада — 3 месяца.
Фиксированная ставка — 12 % годовых.
Минимальная сумма для открытия вклада — не ограничена.

Особые условия вклада «Падарунак»:

- Вклад может быть открыт на имя другого лица.
- Неизменная процентная ставка до конца срока вклада.
- Без права пополнения вклада.
- Ежемесячная капитализация дохода и его выплата.

Новый срочный банковский вклад в иностранной валюте
«ПРАЗДНИЧНЫЙ».

Срок хранения вклада — 2 месяца.
Фиксированная ставка — 7 % годовых.
Минимальная сумма для открытия вклада — не ограничена.
Валюта вклада — доллары США или евро.

Особые условия вклада «Праздничный»:

- Вклад может быть открыт на имя другого лица.
- Неизменная процентная ставка до конца срока вклада.
- Без права пополнения вклада.
- Ежемесячная капитализация дохода и его выплата.

Новая услуга АСБ «Беларусбанк» сберегательный сертификат
НА ПРЕДЪЯВИТЕЛЯ

Достоинства сберегательного сертификата:

- простота оформления;
- срок обращения — 3 месяца;
- фиксированная ставка дохода (12 % годовых) на протяжении всего срока обращения;
- оплата сертификата в любом отделении банка, независимо от места его приобретения;
- хороший подарок по случаю дня рождения, окончания школы, вступления в брак;
- использование в качестве залога при получении кредита в банке.

АСБ «Беларусбанк» предоставляет услуги по хранению сертификатов.

Сберегательный сертификат на предъявителя АСБ «Беларусбанк» — удобство и надежность Ваших сбережений.

Также предлагаем воспользоваться другими услугами, имеющимися в банке.

БУДЕМ РАДЫ ВИДЕТЬ ВАС КЛИЕНТАМИ АСБ «БЕЛАРУСБАНК».

Дополнительную информацию можно получить в любом учреждении АСБ «Беларусбанк» или на веб-сайте банка

http://www.belarus-bank.by

Лицензия на осуществление банковской деятельности № 1 от 27.10.2006 г., выданная Национальным банком Республики Беларусь.

БЕЛПРОМСТРОЙБАНК

ОТКРЫТОЕ АКЦИОНЕРНОЕ ОБЩЕСТВО

«ОАО «Белпромстройбанк» сообщает об установлении с 7 марта 2007 года следующих процентных ставок по вновь привлекаемым и действующим депозитам физических лиц:

В белорусских рублях:

Сроки привлечения	Процентные ставки (годовых)	Минимальная сумма (рублей)
на 1 месяц *с переоформлением*	8	50 000
на 1 месяц	8	50 000
на 3 месяца	11	50 000
на 6 месяцев *с капитализацией*	12	50 000
на 6 месяцев	12	50 000
на 9 месяцев	12	50 000
на 1 год *с правом досрочного востребования*	13	50 000
на 1 год «Копилка»	13	100 000
на 1 год «Надежный»	13	100 000
на 2 года «Успешный»	13	150 000

Возврат средств физических лиц в белорусских рублях в ОАО «Белпромстройбанк» гарантируется в соответствии с законодательством Республики Беларусь

В иностранной валюте:

1. Срочный банковский депозит на 4 месяца в иностранной валюте «К отпуску»

Срок привлечения	Сумма депозита, дополнительного взноса	Процентная ставка (годовая) Доллары США, евро
4 месяца	любая	6

2. Срочный банковский депозит в иностранной валюте «Дифференцированный доход»

Срок привлечения	Сумма депозита	Шкала процентных ставок (годовых) Доллары США, евро					
		за 1-й	за 2-й	за 3-й	за 4-й	за 5-й	за 6-й
6 месяцев	любая	3	4	5	7	9	11

3.Срочный банковский накопительный депозит с капитализацией в иностранной валюте

Срок привлечения	Сумма депозита, дополнительного взноса	Процентная ставка (годовая)	
		Доллары США, евро	Российские рубли
3 месяца	любая	4	5
6 месяцев		6	6
1 год		7,5	8
2 года		8,5	8,5
3 года		9	9

шкала процентных ставок при досрочном востребовании депозита

Период размещения до даты востребования	Процентная ставка (годовая)	
	Доллары США, евро	Российские рубли
до 3 месяцев	ставка текущих счетов физических лиц *	ставка текущих счетов физических лиц
от 3 месяцев до 6 месяцев	3	4
от 6 месяцев до 1 года	5	5
от 1 года до 2 лет	6	6,5
от 2 лет	7,5	8

4. Срочный банковский депозит на 1 год в иностранной валюте «Динамичный»

Срок привлечения	Сумма депозита дополнительного взноса	Процентная ставка (годовая)	
		Доллары США, евро	Российские рубли
1 год	любая	7,5	7,5

Дополнительную информацию можно получить в любом учреждении ОАО «Белпромстройбанк» или по телефону в г. Минске 289-46-06.

Возврат средств физических лиц в иностранной валюте ОАО «Белпромстройбанк» гарантируется государством в полном объеме.

Лицензия Национального банка Республики Беларусь № 4 от 13.02.2007 года на осуществление банковской деятельности.

КУП «Минский областной центр учета недвижимости»

проводит открытый аукцион по продаже здания столовой (кафе) общей площадью 580,6 кв.м, расположенного по адресу: Дзержинский район п. Энергетиков, ул. Интернациональная, 7. Площадь земельного участка 0,0866 га. Начальная цена — 387 660 000 бел. руб. с НДС. Подробное извещение опубликовано в газете «Звязда» от 06.01.2007 г. № 3. Аукцион состоится 27.03.2007 г. в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, ком. 321. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по 26.03.2007 г. до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 322.

Контактный телефон (8-017) 224-61-34.
Наш сайт в Интернете: www.rlt.by.

ISSN 1990-763X

9 771990 763015

КУРСЫ ВАЛЮТ

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 06.03.2007 г. (для б/н разлікаў)

1 долар ЗША	2 142,00
1 еўра	2 810,30
1 латвійскі лат	3969,97
1 літоўскі літ	813,95
1 чэшская крона	99,83
1 польскі злоты	720,12
1 расійскі рубель	81,62
1 украінская грыўня	424,79

Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў

Цэнтрабанк РФ

USD	26,2432
10 UAH	51,8313
1000 BYR	12,2118
EUR	34,4180

Курс у гандлёвых кампаніях (на 07.03.2007 г.)

USD	2210 / 2320

Падпішыцеся на часопіс «Главный бухгалтер. ГБ» на 2007 год у рэдакцыі па самай выгаднай цане. Тэлефон рэдакцыі: 209-69-01.

Хто ў доме гаспадар?..

Напярэдадні Дня Жанчын грамадскі прэс-цэнтр Дома прэсы правёў пасяджэнне «круглага стала» на не зусім звычную для пачатку сакавіка тэму: «Калі галоўны ў сям'і мужчына...».

Экспертамі і «дзейнымі асобамі» былі шэсць шчаслівых сямейных пар.

Паколькі абмен думкамі і дыскусіі працягваліся каля дзвюх гадзін, мы выкладзем, так бы мовіць, квінтэсенцыю, своеасаблівы «рэцэпт шчасця» сучаснай сям'і.

1. Сям'я Кузняцовых

Тамара Усеваладаўна — член Грамадскага аб'яднання «Беларуская асацыяцыя шматдзетных бацькоў», маці чацвярых дзяцей.

Іван Рыгоравіч — слесар-сантэхнік РУП «Белмедпрэпараты», бацька чацвярых дзяцей.

Для яе жаночае шчасце — гэта здароўе дзяцей, разуменне ў сям'і. Дзеці — сэнс жыцця. А жаночая хітрасць — гэта ўменне выйсці з любой сітуацыі.

— У нас чацвёра сыноў, і бацька для іх — узор. У нашай сям'і няма падзелу на жаночую і мужчынскую работу... 12 гадоў назад мы ўсынавілі хлопчыка. Усяго адзін кілаграм ён важыў, калі я забірала яго з раддома. Выхадзілі, але аказалася, што ён вельмі хворы, ДЦП. Работу давялося пакінуць... Усе сілы ўкладваем у сына... Але я шчаслівая жанчына: для мяне 8 Сакавіка не раз на год, а кожны дзень, — прызнаецца Тамара.

— 25 гадоў нашай сям'і. Мая жонка — моцны чалавек, — дадае Іван.

2. Сям'я Лісіцкай—Ялфімава

Тамара Рыгораўна Лісіцкая — тэлевядучая праграмы «Вось такія пірагі», ды-джэй «Альфарадыё», пісьменніца.

Віталь Юр'евіч Ялфімаў — ды-джэй радыё «Радыус-FM» (творчы псеўданім — Глеб Марозаў).

Для яе жаночае шчасце — гэта сям'я, муж, любімая справа і адэкватная ацэнка гэтай справы, а таксама здароўе. Жаночая хітрасць — гэта мужчынская хітрасць, толькі ў жанчыны. Любімыя кветкі — тыя, якія не адразу асыпаюцца.

— Нашай сям'і тры гады. Ёсць пытанні, за якія я ніколі не вазьмуся, — прызнаецца Віталь. — Навошта перашкаджаць: адзін чалавек павінен і варыць, і саліць... Калі я не валодаю пытаннем, з задавальненнем яго абмяркую. Увогуле ўсё канкрэтна: мужчына сказаў — мужчына зрабіў.

— Па статыстыцы замужнія жанчыны жывуць менш, чым незамужнія. А жанатыя мужчыны — даўжэй, чым халасцякі, — гаворыць Тамара. — Сумяшчаць сямейнае жыццё з работай вельмі цяжка, нічога не паспяваеш, стамляешся... Але мой муж — для мяне яшчэ і муза!

— Мая жонка — неверагодна прыгожая! І наколькі яна прыгожая, настолькі і разумная! Мне пашанцавала ўсё, што яна робіць. Тамара — добры псіхолаг. Можна бясконца назіраць, як гарыць агонь, як цячэ вада і як гаворыць мая жонка, — дадае Віталь.

3. Сям'я Лобач—Багданава

Марына Вікенцьеўна Лобач — заслужаны майстар спорту, алімпійская чэмпіёнка па мастацкай гімнастыцы ў Сеуле-1988.

Дзмітрый Анатольевіч Багданаў — менеджар па продажах кампаніі «Асбіс».

Муж прыхварэў, і таму на «круглым стале» Марыне давялося даваць справаздачу за дваіх.

— Галоўнае ў сямейным жыцці — цярпенне. Не бывае дрэнных мужа ці жонкі. Збудаваць сям'ю — гэта значыць штодзень па крупінках «збіраць» яе, — перакананая Марына. — У гэтым годзе 15 гадоў нашай сям'і. У нас дзве дачушкі, Ірына і Надзея. Малодшай 6 гадкоў, старэйшай — 11. У нашай сям'і нельга вызначыць «галоўнага» — абсалютнае ўзаемаразуменне. Муж і жонка дапаўняюць адно аднаго. Калі некаму аддаць «кіраўнічыя лейцы», дык другі будзе адчуваць сябе абдзеленым. Прынамсі, жанчыны заўсёды змагаюцца за свае правы, а мужчыны лічаць, што менавіта яны — галоўныя *(усміхаецца)*. Жанчыне трэба зрабіць усё магчымае, каб муж лічыў сябе галоўным і той жа час каб ён усяляк падтрымліваў жонку.

4. Сям'я Матульскіх

Тамара Уладзіміраўна — лагапед Рэспубліканскага навукова-практычнага цэнтра «Маці і дзіця».

Раман Сцяпанавіч — дырэктар Нацыянальнай бібліятэкі Рэспублікі Беларусь.

Яна перакананая: «галава» сям'і той, хто прымае рашэнні і нясе за іх адказнасць. А жаночае шчасце — «быў бы мілы побач». Жаночая хітрасць — ласкавае кіраўніцтва для дасягнення сваіх жаданняў (ацэнім гэту мудрасць, жанчыны!). Галоўнае сямейнае свята — дзень вяселля...

Іх сыну Тарасу — 24, дачцэ Аксане — 20. А маці, Тамара, такая абаяльная і прывабная, — цяжка паверыць, што такія дарослыя дзеці!

— Усе праблемы вырашаем разам, — адзначае Тамара.

— Сям'я — той асяродак, дзе цябе заўсёды зразумеюць і падтрымаюць — нават калі праўда не на тваім баку, — Раман Матульскі быў гранічна шчыры. — Нядаўна жаніўся наш сын. А ёсць такая даўняя хрысціянская традыцыя: праводзіць маладых у царкву павінна шчаслівая сямейная пара, бо сям'я павінна нараджацца ў шчаслівай ауры. Мы не знайшлі... Не, сярод нашых знаёмых шмат шчаслівых сем'яў — але не ў першым шлюбе... Галоўнае ў сям'і — гэта адказнасць адзін за аднаго. На жаль, некаторыя сучасныя маладыя сем'і нагадваюць магазіны «сэканд-хэнд»: узяў — панасіў — зноў здаў у магазін...

5. Сям'я Чуйко

Вера Аляксееўна — бібліятэкар СШ № 212 г. Мінска.

Рыгор Пятровіч — генеральны дырэктар УП «Агракамбінат «Ждановічы».

Жаночае шчасце для яе — бачыць сваё адлюстраванне ў вачах каханага. Жаночая хітрасць — ва ўменні прамаўчаць. А прафесія жонкі — гэта хобі (адзначым: апошняе і здзівіла, і ўразіла яе супруга).

— Якая несправядлівасць: пераважная большасць творыць мастацтва прысвечана нешчаслівым сем'ям! — недаўмявае Рыгор Чуйко. — Не разумею, чаму пра шчаслівыя сем'і гаварыць не тое што не прынята, але лічыцца... нецікавым. Мы 26 гадоў разам, жонка — раўнапраўны партнёр у сям'і. Я — гаспадар, яна — гаспадыня. Кожны заняты сваёй справай, у нас няма часу на нейкія сямейныя «разборкі»... Увогуле чалавеку нельга рабіць дзвюх галоўных памылак у жыцці: пры выбары прафесіі і пры выбары спадарожніка жыцця.

— Жонка павінна стварыць такую абстаноўку, каб мужу хацелася ісці дадому, — адкрывае свой сакрэт шчасця Вера. — І перш за ўсё трэба палюбіць хобі мужа. «Хварэць» за яго на тэнісным корце, разам хадзіць на футбол, у басейн, у лазню...

6. Сям'я Швец

Юлія Алегаўна — хатняя гаспадыня.

Аляксандр Іосіфавіч — кіраўнік прадстаўніцтва кампаніі «XEROX».

Яе жаночая хітрасць — нічога не патрабуючы, атрымліваць усё. А прафесія жонкі — штодзённая, штомінутная праца па ўласным жаданні...

— У нас двое дзяцей, Настассі 7 гадоў, Алегу — 3. Быць гаспадыняй дома — гэта вельмі вялікая праца... Магчыма, менавіта я ў доме гаспадар — калі так думае жонка, — гаворыць Аляксандр.

— Я замужам — сапраўды за мужам. Выхоўваю дзяцей, кар'ерныя амбіцыі для мяне пакуль не актуальныя. Але добрыя, выхаваныя дзеці — хіба не галоўная «кар'ера» для жанчыны? — міркуе Юлія.

Уладзя ТАЦЦЯНЧЫК.
Фота Марыі ЖЫЛІНСКАЙ.

Прамая лінія

Зянон ЛОМАЦЬ:

«ДА АНАНІМНЫХ ЗВАРОТАЎ ТРЭБА БЫЦЬ ВЕЛЬМІ ЎВАЖЛІВЫМІ»

Як паведамляла «Звязда», днямі ў Мінгарвыканкаме прайшла «прамая лінія» старшыні Камітэта дзяржаўнага кантролю Зянона Ломаця. За тры гадзіны ён паспеў адказаць на 53 тэлефанаванні. Сёння наша газета падрабязна распавядае пра многія з іх.

«ГЛАБАЛЬНЫХ» пытанняў, якія датычацца жыцця ўсяго горада, старшыні Камітэта дзяржкантролю паступіла зусім няшмат. Так, адзін з жыхароў горада, пенсіянер сістэмы МУС, паскардзіўся на тое, што адзінае ў Мінску дзяржаўнае прадпрыемства па абслугоўванню дамафонных сістэм з 1 студзеня адмаўляецца праводзіць іх рамонт без дадатковай аплаты, не прадугледжанай заключанымі раней дамовамі. «Нас наўмысна штурхаюць у рукі «прыватнікаў». Мы не хочам гэтага», — заявіў ён.

Паводле слоў Зянона Ломаця, упраўленне жыллёва-камунальнай гаспадаркі Мінгарвыканкама займаецца зараз гэтай праблемай. «У сакавіку ўсе кропкі над «і» будуць расстаўлены».

Жанчыну, якая патэлефанавала на «прамую лінію», цікавіла, як можна вырашыць праблему значнага недахопу месцаў у інтэрнатах некаторых мінскіх ВНУ. Паводле слоў Зянона Ломаця, такая праблема сапраўды існуе і яна знаходзіцца на кантролі кіраўніка дзяржавы. Пры гэтым старшыня Камітэта дзяржкантролю дадаў, што актуальнай з'яўляецца і праблема арганізацыі харчавання студэнтаў.

Яшчэ адна жыннчына абуралася тым, што некаторыя ЗАГСы сталіцы не даюць залу з шампанскім у рамках аплаты ўрачыстай рэгістрацыі шлюбу, патрабуючы дадатковай аплаты. У той жа час іншыя ЗАГСы «паступаюць сумленна» і не патрабуюць дадатковай аплаты. Старшыня Камітэта дзяржкантролю даў даручэнне чыноўнікам гарвыканкама разабрацца ў сітуацыі.

ШМАТ пытанняў ад жыхароў Мінска датычылася жыцця пэўных гарадскіх тэрыторый. Так, жыхарка мікраёна Сцяпянка цікавілася, ці варта чакаць у бліжэйшы час добраўпарадкавання ляснога масіву, размешчанага ў мікраёне. Паводле слоў чыноўнікаў Мінгарвыканкама, якія прысутнічалі на «прамой лініі», канкрэтных тэрмінаў пачатку добраўпарадкавання зараз няма, гэтае пытанне знаходзіцца ў стадыі прапрацоўкі.

Работніца аднаго з мінскіх прадпрыемстваў скардзілася на дрэнную работу наземнага грамадскага транспарту ў раёне вуліцы С. Кавалеўскай. Зянон Ломаць даў даручэнне адпаведным структурам гарвыканкама вывучыць гэтае пытанне.

Жыхар сталіцы, які патэлефанаваў на «прамую лінію», паведаміў, што ў бліжэйшы час на месцы велізарнай аўтастаянкі на перасячэнні праспекта Дзяржынскага і вуліцы Голубева павінна пачацца будаўніцтва жылых дамоў. «Дзе ставіць аўтамабіль у такім выпадку?», — пытаўся ён.

Як паведамілі чыноўнікі Мінгарвыканкама, усім уладальнікам месцаў на аўтастаянцы будуць прапанаваны месцы на паркоўках, якія знаходзяцца побач. Адначасова з будаўніцтвам дамоў па другі бок праспекта Дзяржынскага будзе таксама весціся будаўніцтва шматпавярховага паркінга на 1 тыс. месцаў.

Некалькі пытанняў датычыліся рамонту дарог у горадзе. Так, жыхарка Паўночнага пасёлка Заводскага раёна скардзілася на вельмі нездавальняючы стан дарог у наваколлі. Па гэтаму і іншых аналагічных зваротах будуць праводзіць праверкі гарадскія чыноўнікі.

Жыхарка мікраёна Дражня пацікавілася, ці плануецца будаўніцтва лыжаролернай трасы з асвятленнем у лясным масіве, які знаходзіцца ў мікраёне. Паводле яе слоў, такая траса была б вельмі запатрабавана, бо побач знаходзіцца шмат інтэрнатаў, дзе пражывае моладзь, узводзяцца новыя дамы. Паводле слоў чыноўнікаў гарвыканкама, будаўніцтва лыжаролернай трасы ў Дражні не плануецца, аднак там будзе весціся будаўніцтва тэнісных кортаў.

Яшчэ аднаго мінчаніна цікавіла, калі скончацца работы па ачыстцы Лошыцкага водасховішча. Паводле слоў гарадскіх чыноўнікаў, гэта плануецца зрабіць да мая сёлета.

ВЕЛЬМІ шмат пытанняў, якія паступілі на «прамую лінію», датычылася прыватных праблем грамадзян. У першую чаргу жылля. Нехта скардзіўся на тое, што дом быў здадзены з бракам, нехта — на тое, што гарадскія ўлады не ўлічваюць пры адсяленні патрэбы жыльцоў дома, які павінен быць знесены.

Адразу тры пытанні паступілі адносна лёсу дома па вуліцы Громава, які быў пабудаваны членамі ЖБК «Маладыя грамадзяне». Будаўніцтва гэтага дома пачалося ў 1999 годзе і з вялікімі цяжкасцямі завяршылася ў 2005-м. Аднак забудоўшчыкі ніяк не могуць засяліць яго.

Паводле слоў Зянона Ломаця, «тыя, хто стаяў ля вытокаў гэтага кааператыва, панясуць крымінальную адказнасць». Пры гэтым старшыня Камітэта дзяржкантролю адзначыў, што праблема з засяленнем дома знаходзіцца на кантролі кіраўніка дзяржавы.

ПАДЧАС «прамой лініі» Зянон Ломаць закрануў пытанне паступлення ў дзяржаўныя структуры ананімных зваротаў жыхароў краіны. Паводле слоў старшыні Камітэта дзяржкантролю, «да ананімных зваротаў трэба быць вельмі ўважлівымі. Калі там узнімаюцца пытанні, звязаныя з хабарніцтвам, карупцыяй, безгаспадарнасцю, то яны абавязкова павінны разглядацца».

«Павінны разглядацца заявы грамадзян, якія паступаюць па электроннай пошце. Хоць сёння законам гэта не агаворана. Я магу прывесці шэраг прыкладаў, калі звароты грамадзян па электронай пошце прывялі да крымінальных спраў. І на асобных дзеячаў, аб якіх паведамілі грамадзяне, надзелі наручнікі», — дадаў старшыня Камітэта дзяржкантролю.

Сяргей КУЗНЯЦОЎ.

Валянціна й

Берагчы!

Два мужыкі сустрэліся. Адзін пытае ў другога:

— Слухай, Пятрок, ты сваёй бабе што купіў на восьмае сакавіка?

— А калі ў яе восьмае сакавіка?

Нагадаю — заўтра. І не толькі ў яе. Ва ўсіх жанчын і мужчын, хоць асобныя і ўпарцяцца. Кажуць, што не нашае гэта свята, надуманае. І ўсё ж напярэдадні (сведчу!) сноўдаюць з крамы ў краму, топчуцца ля прылаўкаў, раяцца і выбіраюць. Што? Ды тут яны, мусіць, як дзеці. Настаўніца адна перад тым, як развучваць песню, спытала ў першакласнікаў:

— Што вы дорыце 8 сакавіка сваім мамам і бабулям?

— Кветкі!

— Малюнкі!

— Цукеркі!

— Духі! — зашумелі дзеці.

— Можна і песню, — адзін хлопчык сказаў. — Калі больш няма чаго.

Вось і я (з дазволу?..) нешта падобнае... Да Дня абаронцаў злажылася:

Кожны ранак ёсць прычына
Дыфірамбы пець мужчынам
І прасіць іх, дарагіх
Ад бяды і адзіноты,
Ад нястачы і самоты,
Берагчы найперш малых,
Берагчы сваю Айчыну,
Берагчы сваю жанчыну
І йшчэ парачку чужых!

А паколькі ад мужчынскага свята да жаночага (сёння ж можна казаць?), як ад першай чаркі і да другой, — верш «перапісаўся» і загучаў так:

Кожны ранак ёсць прычына
Дыфірамбы пець ***жанчынам***
І прасіць іх, дарагіх,
Ад бяды і адзіноты
Ад нястачы і самоты
Берагчы найперш малых
Берагчы сваю Айчыну,
Берагчы свайго мужчыну
І йшчэ парачку чужых!

Усміхнуліся? Цудоўна! Так і хадзіце! Бо ўсмешка (гэта навукова даказана) ёсць самы лёгкі, самы танны і ўніверсальны спосаб упрыгожыць сябе.

...Калі ж апроч гэтага (хоць у некага) і насамрэч умацавалася альбо з'явілася жаданне БЕРАГЧЫ — нашых малых, нашых бабулек і дзядуль, нашых мам і тат, нашых каханых і любімых, НАШ КРАЙ шматпакутны і родны, я асабіста згодна зняць капялюш.

Перад памяццю жанчын, «з падачы» якіх з'явілася гэтае наша і не наша свята.

Валянціна ДОЎНАР.

Тэлесеткі

Тры, два, адзін... Бокс!

Працягваючы серыю трансляцый з баксёрскіх арэн свету, 10 сакавіка канал «ЛАД» прапануе сваім гледачам прамую трансляцыю бою за званне чэмпіёна свету ў суперцяжкай вазе па версіі IBF (Міжнародная федэрацыя бокса). Аспрэчваць гэты тытул будуць яго цяперашні ўладальнік, украінец Уладзімір Клічко і новы прэтэндэнт — амерыканец Рэй Осцін. Рашаючы паядынак пройдзе ў нямецкім горадзе Мангейме.

Як водзіцца, бокс — гэта не толькі спорт, але і шоу. Таму напярэдадні бою, каб зацікавіць публіку, абодва баксёры па традыцыі «абмяняліся камплімента-мі» і зрабілі прадказанні наконт выніку сустрэчы. Так, 36-гадовы Осцін (правёў на прафесійным рынгу 31 бой, у 24 — перамог) ганарліва абвясціў: «У Кліч-ко слабае падбароддзе і зусім няма храбрасці, і я збіраюся накаўціраваць яго. Я зусім не адзін з нявопытных і «дробных» прэтэндэнтаў. Я сапраўдны суперцяжкавагавік!». У сваю чаргу, чэмпіён Еўропы і свету па версіях IBF, IBO, NABF Уладзімір Клічко, празваны «Доктар Сталёвы Молат» (правёў 50 паядынкаў, 47 з якіх выйграў), паведаміў, што не збіраецца недаацэньваць праціўніка, аднак «на рынгу да яго не будзе ніякай літасці».

Чый прагноз спраўдзіцца і чые прэтэнзіі на перамогу будуць задаволены — убачым у суботу, 10 сакавіка. Трансляцыя бою Клічко—Осцін пачнецца на «ЛАДзе» ў 23.10.

«J:Морс» расколе лёд пачуццяў на СТБ

Добры канцэрт — заўжды свята, гэта кожны меламан ведае. Калі канцэрт не проста добры, а яшчэ і доўгачаканы — гэта сапраўдны падарунак для слухачоў. Такі падарунак зробіць СТБ 8 сакавіка, паказаўшы тэлеверсію нядаўняга выступлення гурта «J:Морс» з праграмай «Ледаколы» ў Мінску.

Канцэрт выклікаў у публікі сапраўдны ажыятаж — некалькі соцень людзей не змаглі трапіць на пляцоўку, а яшчэ некалькім дзесяткам арганізатары вымушаны былі вярнуць білеты, бо ўсе жадаючыя проста не змясціліся ў клубе... Але гэта несправядлівасць будзе выпраўлена — выступленне «гурта года» Беларусі цяпер зможа ўбачыць уся краіна.

Здымкі тэлеверсіі, між іншым, рыхтаваліся з восені — прадумвалася канцэпцыя праграмы, афармленне сцэны, нават парадак песень.

Вікторыя ЦЕЛЯШУК.

ЛЮБІ МЯНЕ, ЯК Я ЦЯБЕ,

АБО З ДНЁМ АБАРОННІЦ АЙЧЫНЫ!

У далёкім 1911 годзе гендэрна прасунутыя дзяўчаты сацыял-дэмакратычных поглядаў на чале з Кларай Цэткін заснавалі жаночы дзень — 8 Сакавіка. І, напэўна, нядрэнна зрабілі. Ва ўсякім выпадку, вельмі ўгадалі з датай. Першы подых вясны, пачатак абуджэння і абнаўлення прыроды здольны закрануць нават аддаленыя струны адпетага песміста. А тут і свята да пары.

За дзевяць дзесяцігоддзяў яно ўвайшло ў наша жыццё на правах традыцыі. Мужчынам ёсць нагода сабраць разам усё сваё джэнтльменства і прынесці да ног каханых пяшчотныя мімозы, сабаліныя манто, бліскучыя ад новай фарбы «Мерсэдэсы» (на што ў даўдзены момант хопіць фантазіі і сродкаў). Некаторыя так уваходзяць у ролю, што пачынаюць у гэты дзень дамам уступаць месцы ў тралейбусе, гаварыць прыемнасці калегам, здзіўляць жонак сюрпрызамі. Ну а жанчыны крыху расслабляюцца і прымаюць падарункі, а таксама кампліменты, хай нават і крыху перабольшаныя. Кругом цукеркі, шампанскае, усмешкі, лёгкі сумбур. І галоўнае, што ў гэты дзень, а не 23 лютага, прадстаўнікі нашай моцнай паловы адчуваюць сябе сапраўднымі абаронцамі лепшай часткі айчыны.

Але ж не варта спяшацца дзяліць чалавецтва на абаронцаў і тых, каго абараняюць. Статыстыка, як кажуць, упартая рэч. На самых перадавых рубяжах краіны — большасць жанчын. Хто лечыць і вучыць? Правільна. Нядаўна схадзіла на калегію ўпраўлення ідэалагічнай работы аблвыканкама, і з вялікай карысцю. Шмат цікавых матэрыялаў раздавалі. Вось з адной табліцы вынікае, напрыклад, што журналістыка становіцца цалкам жаночай прафесіяй. У дзяржаўных сродках масавай інфармацыі Брэстчыны зараз шчыруюць ну зусім без маленькага 70 працэнтаў кабет. У пажарнай службе, у вайсковых часцях, у пагранічных падраздзяленнях дзяўчаты ў форме нікога не здзіўляюць. Упаўне можна перайначыць песню «Плачет девушка в автомате» на «Плачет девушка с автоматом». «Калашнікавым», маецца на ўвазе. Так што, нашы дзяўчаты самі каго хочаш абароняць.

Праўда, адну пазіцыю мужчыны займаюць трывала — кіруючую. На першую сесію самага заходняга абласнога Савета краіны з 60 акруг прыехала ўсяго дзевяць жанчын. На маю заўвагу аб тым, што прадстаўніц у органе ўлады малавата, адзін з дэпутатаў, амаль што алігарх местачковага маштабу, вымавіў: «Так. Магло б быць і дзесяць». Паблажліва-іранічна вымавіў. Ды што там выпадковы суразмоўца! Мой стары знаёмы, можна сказаць, у душэўнай гутарцы, між іншым, заўважыў: «Баба на пасадзе нібы каза ў гаспадарцы — не ад добрага жыцця». Ну і няхай. Да гэтай дыскрымінацыі на бытавым узроўні мы даўно прывыклі. Праўда, бываюць выключэнні. Нядаўна мне расказалі ўнікальны выпадак. Адзін з кіраўнікоў буйной медыцынскай установы паміж двума раўназначнымі прэтэндэнтамі на пасаду загадчыкаў аддзяленняў аддаў перавагу даме, і растлумачыў рашэнне так: «Мы жывём у свеце мужчын, ім заўсёды лягчэй узняцца па службовай лесвіцы». За такую жыццёвую пазіцыю, бадай што можна помнік паставіць. Але пры ўсім жаданні гэта наўрад ці ўдасца. Бо дазвол на ўстаноўку манументаў дае хто? Правільна.

А як вы думаеце, што вось гэтых траіх згаданых паважаных людзей аб'ядноўвае? Кожны з іх, кіраўнік свайго калектыву, у святочны дзень будзе гаварыць добрыя словы ў адрас жанчын, часам дзяжурныя, часам шчырыя. А нам усё роўна прыемна. Бо любім мы ўвагу. І здольныя ацаніць не толькі таго, хто прывалачэ футры і каштоўнасці, але і таго, хто здолее падарыць «зорку Венеру, што ўзышла над зямлёю».

Думаю, не былі б супраць такой інтэрпрэтацыі свята і яго заснавальніцы. Саратніцы Клары Цэткін — Роза Люксембург, Інэса Арманд, Вера Слуцкая засталіся ў гісторыі не толькі дзеячамі міжнароднага рабочага руху. Партыйная барацьба не перашкаджала ім кружыць галовы перакананых рэвалюцыянераў і асобных правадыроў сусветнага пралетарыяту. Бо сваю зорку мужчыны, на шчасце, шукалі і адкрывалі заўсёды.

Святлана ЯСКЕВІЧ.

ДЛЯ САШЫ — АДЗІН ВУЧЭБНЫ ПЛАН, ДЛЯ КАЦІ — ДРУГІ, А ДЛЯ АНТОНА — ТРЭЦІ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

А цяпер зробім спробу патлумачыць гэты феномен.

— Наталля Андрэеўна, можа скласціся ўражанне, што ваша гімназія — гэта нейкая элітарная ўстанова, якая збірае «вяршкі», вундэркіндаў з усяго раёна...

— Так ужо атрымалася, што за 11 гадоў жыцця СШ № 7 г. Ліды ў ёй змянілася некалькі дырэктараў, я стала пятым па ліку. Але педагагічны калектыў, нашы выхаванцы і іх бацькі верылі, што мы можам зрабіць школу адной з лепшых. Стварылі праграму развіцця навучальнай установы, якая прадугледжвала яе паступальную рэарганізацыю спачатку ў школу-гімназію, затым — у гімназію. Наша ініцыятыва атрымала падтрымку мясцовых органаў улады і з 1 верасня 1993 года пачалося жыццё першай на Лідчыне навучальнай установы новага тыпу. Мы марылі стварыць такія ўмовы, такое выхаваўчае асяроддзе, дзе кожнае дзіця было б акружана ўвагай і клопатам і ў кожным вучні настаўнікі бачылі асобу. Каб у выпускніка была магчымасць увайсці ў інтэлектуальную эліту Беларусі з яскрава выражанай грамадзянскай, патрыятычнай пазіцыяй.

У гэтым сэнсе, мабыць, наша гімназія і сапраўды элітарная. А што датычыцца «вяршкоў»... Канешне, пры паступленні ў пяты, гімназічны клас ёсць конкурс, але ён не зашкальвае. Прычым у большасці гімназістамі становяцца выпускнікі пачатковай школы пры нашай жа гімназіі. Дзякуючы сістэме развіваючага навучання для іх гэта не складае асаблівай праблемы. А далей над развіццём іх здольнасцяў і магчымасцяў працуе гімназія. І галоўны прынцып тут — асабоваарыентаванае навучанне і выхаванне.

— Лозунг, што трэба, маўляў, дайсці да кожнага, абвяшчаўся неаднойчы і ад частага выкарыстання стаў ужо нейкім штампам...

— Мы не проста яго абвясцілі, а стараемся зрабіць усё, каб гэты прынцып можна было ажыццявіць.

Мы ўдзячныя мясцовым уладам за тое, што яны дапамагаюць нам у выдзяленні дадатковых гадзін для пашырэння сеткі курсаў па выбару, факультатываў і нават для правядзення індывідуальных заняткаў. Цудоўным элементам гэтай сістэмы лічу і інстытут класных выхавальнікаў, які, на мой погляд, варта было б увесці ва ўсёй рэспубліцы. Гэта, як яе называюць гімназісты, класная мама вызвалена ад іншых абавязкаў (хіба што можа быць некалькі ўрокаў па сваёй спецыяльнасці) і з'яўляецца, скажам так, пасрэднікам паміж школай і дзецьмі, іх бацькамі — у поўным сэнсе гэтага слова, без нейкіх лозунгаў і дэкларацый. Яна ведае, на што здольны кожны з выхаванцаў, якія ў яго цяжкасці, як яму дапамагчы. Праўда, апошнім часам з-за праблем з фінансаваннем давялося, на жаль, скараціць штат вызваленых класных выхавальнікаў: па аднаму на клас мы змаглі пакінуць іх толькі ў дзесяці — і адзінаццацікласнікаў, а ў астатніх — адзін выхавальнік на два класы.

І, нарэшце, патлумачу сутнасць такога элемента нашай сістэмы, як мультыпрофільнае навучанне, якое пачынаецца з дзесятага класа. Профільнае навучанне мы практыкавалі даўно. Пачынаючы з восьмага класа, былі профільныя класы — філалагічны і фізіка-матэматычны. Гэта давала вынік і ў прынцыпе мы маглі і далей, як кажуць, рухацца па наезджанай каляіне. Аднак пры дэталёвым аналізе высветлілася, што толькі 57 працэнтаў выпускнікоў філалагічнага класа па гэтаму ж профілю пайшлі вучыцца ў ВНУ. Значыць, працуем ухаластую. Да таго ж змена профілю азначае, што не абышлося без рэпетытарства, а гэта — дадатковая нагрузка на вучня і, зразумела, бацькоўскі кашалёк.

Прачыталі ў часопісе пра адну маскоўскую школу, якая займаецца мультыпрофільным навучаннем. Прычым, аказваецца, па гэтай сістэме пачалі працаваць у Барысаве. Мы адразу ж туды паехалі, калегі ўсё падрабязна расказалі. І гэта праблема непакоіла не толькі нас. З 2001 года наша гімназія ўключана ў лік 11 навучальных устаноў рэспублікі, якія сталі эксперыментальнымі пляцоўкамі Міністэрства адукацыі па апрабаванню мадэлі мультыпрофільнага навучання. А ў 2004 годзе ўжо 31 установа адукацыі ўключылася ў інавацыйны праект па ўкараненню гэтай мадэлі ў старэйшых класах, у тым ліку 9 — прадстаўнікі Гродзеншчыны, што мяне вельмі радуе.

Мультыпрофільнае навучанне — гэта вучэбны план не на клас, як у звычайнай школе, а на кожнага вучня. Прычым гэты план яму не навязваецца зверху, а ён сам яго складае, зыходзячы са сваіх жаданняў і бачання свайго прафесійнага шляху. Канешне, з улікам дзяржаўнага стандарту па вывучэнню прадметаў на базавым узроўні. А вось што датычыцца павышанага ўзроўню, то дзесяцікласнік атрымлівае бланк вучэбнага плана і сам вызначае прадметы і колькасць гадзін на іх вывучэнне. Калі ласка, можаш параіцца з бацькамі, класным выхавальнікам, настаўнікамі, псіхолагам гімназіі, але апошняе слова застаецца за самім вучнем.

Пры індывідуальным навучанні, уласным плане гімназіст мае права такога выбару прадметаў, які не дае ніводны профільны клас. Адпаведна на кожнага вучня складаецца і расклад заняткаў. А паколькі пры гэтым нельга ў адным класе Сашу чытаць на паглыбленым узроўні фізіку, Каці — матэматыку, а Антону — англійскую мову, то звычайная класна-ўрочная сістэма змяняецца прадметна-групавым выкладаннем. У гэтым навучальным годзе на 137 чалавек сфарміраваны ажно 123 вучэбныя групы.

— Зразумела, што мультыпрофільная сістэма навучання значна павялічвае нагрузку на адміністрацыю і педагогаў гімназіі. А на вучняў таксама?

— Канешне, нашы настаўнікі працуюць у асаблівых умовах (на кожную групу патрэбны свой рабочы план з улікам індывідуальных магчымасцяў, здольнасцяў і «багажа» ведаў кожнага вучня) і я вельмі ганаруся сваімі калегамі, сярод якіх палова — з вышэйшай кваліфікацыйнай катэгорыяй, а 30 працэнтаў — з першай. У нашым калектыве лунае дух творчасці ў поўным сэнсе гэтага слова, нам сумна працаваць аднастайна.

А для нашых выхаванцаў гэта сістэма проста цудоўная! Увогуле, калі кажуць, што школьнікаў трэба «разгрузіць», то я да гэтага стаўлюся скептычна. Калі хочаш нечага ў жыцці дабіцца — ты павінен працаваць. Але самыя добрыя намеры не павінны шкодзіць здароўю. Імкненнем да гэтага пранізана ўся наша праца — ад асвятлення ў класе да адносінаў да кожнага вучня, калі класная мама кожную раніцу яго сустракае і заглядае ў вочы: з якім настроем ты прыйшоў? Чым табе дапамагчы, каб не было лішніх стрэсаў?

Важна і тое, што мультыпрофільная мадэль навучання вызваляе старшакласніка ад такой нагрузкі, як рэпетытарства. Паводле апытання, паслугамі рэпетытараў карыстаюцца адзінкі, а ў асноўным займаюцца з нашымі педагогамі на курсах, факультатывах і індывідуальных кансультацыях. Вось вам прыклад. У мінулым годзе наша выпускніца Наташа Дабранава падчас цэнтралізаванага тэсціравання набрала 100 балаў па матэматыцы.

Ды і ў цэлым можна сказаць, што нашы выпускнікі канкурэнтаздольныя. Да прыкладу, калі выпускнікі гімназій рэспублікі ў мінулым годзе мелі па вынікам цэнтралізаванага тэсціравання сярэдні бал па рускай мове 52, то лідскія гімназісты — 75 балаў, па беларускай мове — адпаведна 53 і 72. Такая ж карціна і па матэматыцы, замежных мовах і іншых прадметах.

— У Наташы былі рэпетытары?

— Ніводнага, але яна была ў захапленні ад матэматыкі і свайго настаўніка Альфрэда Антонавіча Ладыкі, які, акрамя ўрокаў, праводзіць яшчэ і дадатковыя заняткі ў рамках індывідуальнага абучэння.

— А наколькі адпавядае вашаму імкненню бачыць у кожным вучні асобу сістэма цэнтралізаванага тэсціравання?

— Адназначных думак аб ёй быць не можа. Але галоўную задачу, якую ставіць дзяржава, яна, лічу, выконвае. Усе сапраўды ў роўных умовах і ўжо ніхто не можа сказаць, што нехта камусьці ў нечым дапамагаў альбо па-іншаму на чалавека паглядзеў. Гэта добра. Іншая справа, што ёсць разумнікі, таленты, але з замарджанай рэакцыяй і для іх сістэма цэнтралізаванага тэсціравання даволі праблематычная. Каб дапамагчы такім вучням, з імі вельмі сур'ёзна працуюць нашы псіхолагі. Іх у гімназіі цяпер два, а павінна быць, лічу, больш, паколькі знімаць стрэс трэба і педагогам.

І яшчэ. На мой погляд, ёсць шэраг прафесій, на якія пры наборы ў ВНУ нельга арыентавацца толькі на ўзровень абучанасці і хуткасць рэакцыі чалавека, неабходна ўлічваць яго асабістыя якасці. Мяне як настаўніка вельмі хвалюе менавіта гэты бок пытання. Не можа быць сапраўдным настаўнікам той, хто проста не любіць дзяцей. А вось як граматна зрабіць набор студэнтаў педагагічных ВНУ — трэба, лічу, думаць усім.

— Ці можна сцвярджаць, што будучыня менавіта за мадэллю мультыпрофільнай адукацыі?

— Калі на старце, у дзесятым класе, яшчэ бываюць сумненні, то ў канцы ўсе — і выпускнікі, і іх бацькі стопрацэнтна падтрымліваюць такую арганізацыю навучання. Яна вучыць гімназістаў адказна ставіцца да сваёй будучыні і, мяркуючы па падзячных пісьмах з шэрагу ВНУ, закладвае плённую аснову на далейшы жыццёвы шлях. Дарэчы, некаторыя члены нашага навукоўвага таварыства, распачаўшы працу па той ці іншай тэме яшчэ ў гімназіі, працягваюць яе на студэнцкім узроўні і затым нават абараняюць дысертацыі.

Але пры гэтым, падкрэслю, нашы выхаванцы не нейкія «завучкі», зацыкленыя толькі на папаўненні багажа ведаў, а цікавыя, творчыя людзі, з якімі прыемна мець зносіны і, думаю, сябраваць.

***...Звання выдатніка адукацы

МЕСТНОЕ САМОУПРАВЛЕНИЕ

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

7 сакавіка 2007 г. № 10 (64)

ЯКІМ БЫЦЬ ДОМІКУ Ў ВЁСЦЫ?

Над гэтым пытаннем ужо не першы год ламаюць галаву архітэктары, будаўнікі, дызайнеры, вытворцы будаўнічых і аддзелачных матэрыялаў.

Часткова вырашыць праблему дапамагла міжнародная выстава жылля і будаўніцтва «Беларускі дом», якая нядаўна прайшла ў Мінску. У ёй бралі ўдзел больш чым 300 прадстаўнікоў з нашай краіны, Украіны, Расіі, Літвы, Польшчы, Германіі, Швейцарыі, Нідэрландаў. Іх намаганнямі быў створаны, так бы мовіць, агульны дом для камфортнага і ўтульнага жыцця ў сельскай мясцовасці.

У экспазіцыі выставы былі прадстаўлены сучасныя праекты і макеты дамоў на розны густ, будаўнічыя матэрыялы, вокны, дзверы, сістэмы ацяплення, водазабеспячэння і каналізацыі. Прычым вялікі быў выбар магчымасцяў будаўніцтва дамоў з драўніны — матэрыялу, на які багата наша краіна.

Наведвальнікі пазнаёміліся з перавагамі і ўласцівасцямі звычайных зрубаў з драўніны, дамоў з ацыліндраванага бруса, клеенага бруса. Цікавасць выклікалі каркасна-шчытавыя дамы па новай тэхналогіі. Яны адносна недарагія і адпавядаюць будаўнічым нормам цеплазберажэння і шумаізаляцыі.

Таксама шырока былі прадстаўлены прапановы ландшафтных дызайнераў па добраўпарадкаванню тэрыторыі вакол сядзібы.

Леанід ТУГАРЫН.

ШТО З ПАЛІВАМ НА ВІЦЕБШЧЫНЕ?

Як эфектыўна выкарыстоўваецца паліва для рухавікоў і забяспечваецца яго захаванне? — пацікавіліся спецыялісты Камітэта дзяржаўнага кантролю Віцебскай вобласці. Высветлілася, што кіраўнікі прадпрыемстваў і арганізацый не ўдзяляюць неабходнай увагі выкананню патрабаванняў адпаведнага ўказа Прэзідэнта. Летась і ў пачатку гэтага года Упраўленнем Дэпартамента фінансавых расследаванняў КДК былі ўзбуджаны 22 крымінальныя справы за няправільнае выкарыстанне, улік і г.д. паліўных і змазачных матэрыялаў.

Летась за парушэнні рэгіянальным дзяржканторам былі прыцягнуты да адміністрацыйнай адказнасці 120 адказных асобаў, большасць якіх працуюць у сельскагаспадарчых арганізацыях Прыдзвінскага края. Найбольш тыповыя парушэнні: не здымаюцца рэшткі паліва ў баках аўтатранспарту, з парушэннямі запаўняюцца пуцявыя лісты, вінаватыя не аплачваюць перарасход паліва.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

ЧАЛАВЕК ВА ЎЛАДЗЕ

У НАС АДНА ПРЫВІЛЕЯ — АДКАЗНАСЦЬ ПЕРАД ЛЮДЗЬМІ

Са Святланай ГЕРАСІМОВІЧ, старшынёй Мінскага абласнога Савета, размаўляць давялося ў пятніцу вечарам — Святлана Міхайлаўна вярнулася з Салігорска, дзе ўдзельнічала ў сустрэчы з дэпутатамі пярвічнага і раённага ўзроўняў, а затым — з мясцовымі прадпрымальнікамі. З пытання аб карысці такіх кантактаў я і пачала сваё інтэрв'ю з адзінай у рэспубліцы жанчынай — старшынёй абласнога Савета дэпутатаў.

Фота Марыі ЖЫЛІНСКАЙ.

ЗЯМЛЯ І ЛЮДЗІ МІНШЧЫНЫ

— Сустрэчы з людзьмі для прадстаўніка ўлады любога ўзроўню — гэта вельмі карысная форма дзелавых зносінаў, якая дазваляе многія хвалюючыя грамадзян пытанні вырашаць на месцы ці падказваць шлях, якім трэба ісці чалавеку, каб менш губляць часу і нерваў у дасягненні сваіх намераў. Гэта я зразумела даўно, і ніколі не шкадую часу на прамы дыялог з людзьмі. Ніколі не абяцаю таго, што не магу зрабіць. Канешне, хочацца дапамагчы ўсім і адразу, але, на жаль, магчымасць такая не заўсёды ёсць. І калі людзям усё даходліва растлумачыш, яны заўсёды зразумеюць. Таму на сваёй цяперашняй пасадзе ў зносінах з людзьмі захаваю шчырасць і адкрытасць. І, канешне, буду кіравацца законамі дзяржавы.

— Дайсці да кожнага чалавека, быць адкрытым для яго праблем... У гэтым сэнсе ёсць цікавы вопыт некаторых еўрапейскіх краін, дзе пасяджэнні муніцыпальных саветаў праходзяць вельмі дэмакратычна — яны адкрыты для ўсіх жадаючых. А як праводзяцца сесіі Савета дэпутатаў у вас?

— Магчыма, у нас гэта сістэма больш упарадкаваная, аднак аб даце і парадку дня сесіі заўсёды загадзя паведамляецца ў мясцовых сродках масавай інфармацыі. І пры жаданні кожны грамадзянін можа ў яе адрас накіраваць свае прапановы, заўвагі, пажаданні.

Сесія — складаны і творчы працэс, падчас якога нішто і ніхто не можа адцягваць увагу дэпутатаў ад пытанняў парадку дня. Гэта толькі на першы погляд здаецца, нібы там усё ідзе па зараней складзенаму сцэнарыю. На самай справе дэпутаты затрачваюць шмат працы ў перыяд падрыхтоўкі матэрыялаў да разгляду. Напружана даводзіцца працаваць і пры абмеркаванні іх. У нас у вобласці добра прыжылася і такая форма работы, як выязная сесія ці выязное пасяджэнне камісій Саветаў, падчас якіх дэпутаты маюць магчымасць непасрэдных кантактаў са сваімі выбаршчыкамі, дэталёва вывучаюць тую ці іншую праблему на месцах.

— На сёння, Святлана Міхайлаўна, вы — адзіная жанчына сярод кіраўнікоў абласных Саветаў дэпутатаў. Для жанчыны быць кіраўніком такога ўзроўню, напэўна, няпроста?..

— А я не падзяляю работу на жаночую і мужчынскую. Так склалася, што ўсё жыццё выконвала тую работу, якую мне давяралі. З дэпутацкімі абавязкамі знаёма даўно — выбіралася дэпутатам і раённага, і абласнога Саветаў... Працуючы кіраўніком галоўнага ўпраўлення арганізацыйна-кадравай работы аблвыканкама, сумяшчала гэту пасаду з абавязкамі намесніка старшыні Мінскага абласнога Савета дэпутатаў. Словам, работа з людзьмі знаходзіла мяне, а я яе. І не шкадую — мне гэта падабаецца, мне цікава. Жыць дзеля людзей хоць і адказна, але ж і ганарова. А з такім дэпутацкім корпусам, спадзяюся, усё атрымаецца. Людзі прыйшлі адукаваныя, з багатай практыкай, вопытам, актыўныя і вядомыя ў рэгіёне. Ужо з першага пленарнага пасяджэння ўпэўнілася: мы многае зможам!

— Але жанчын ва ўладзе не так шмат.

— У Мінскай вобласці — іншая тэндэнцыя. Вось глядзіце: галоўным ідэалагічным упраўленнем кіруе член аблвыканкама Таццяна Уладзіміраўна Дзедух. Таісія Іванаўна Данілевіч — дэпутат абласнога Савета, старшыня камісіі па сацыяльна-культурнай палітыцы, начальнік абласнога ўпраўлення адукацыі. Камітэт па працы і сацыяльнай абароне аблвыканкама ўзначальвае Ала Валянцінаўна Мікалуцкая. А колькі талковых і граматных работніц у раённым звяне, на вытворчасці, у ліку спецыялістаў... У гэтых жанчын ёсць разуменне высокай адказнасці перад грамадствам і дзяржавай.

— Сталічная вобласць — рэгіён няпросты, з высокім патэнцыялам, багатымі традыцыямі. Ці вызначыўся абласны Савет дэпутатаў з прыярытэтнымі накірункамі ў рабоце?

— Нашы задачы не стаяць неяк паасобку, у баку ад агульнадзяржаўных. Намаганні дэпутатаў скіраваны на забеспячэнне ўстойлівага сацыяльна-эканамічнага развіцця Міншчыны як вызначальнага ў дзяржаве рэгіёна.

(Заканчэнне на 2-й стар. «МС»).

3 НАГОДЫ

ПАСІЛЬНАЯ НОША СЛАБАГА ПОЛУ

Напярэдадні жаночага свята клопатаў у прыгожай паловы чалавецтва прыбаўляецца. Гэта толькі мужчыны думаюць, што перад 8 Сакавіка напружваюцца ў асноўным яны: падарункі набываюць, кветкі прыглядаюць. Мы, жанчыны, свята вясны павінны сустрэць «узброенымі» на ўсе сто, выглядаць (і адчуваць сябе) асабліва па-жаноцку. А як гэта зрабіць, калі няма ніводнай вольнай хвілінкі, як, напрыклад, у старшынь Саветаў дэпутатаў? Увогуле, ці жаночая гэта справа — узначальваць Савет? І ці ёсць нейкія асаблівасці жаночага кіраўніцтва?

Старшыня Пінскага гарадскога Савета дэпутатаў Брэсцкай вобласці Ніна КАХНОВІЧ:

— На гэтай пасадзе я ўжо 8 гадоў. Сказаць, што калісьці ў мяне тут нешта не атрымалася з-за таго, што я — жанчына, не магу. Не было такога. Спецыфікі менавіта жаночага кіраўніцтва я таксама не назіраю. Усё залежыць ад магчымасцяў Савета, ад законнасці разглядаемага пытання і ад жадання дапамагчы чалавеку. Асабіста ў мяне багаты вопыт работы з людзьмі: у свой час я працавала камсамольскім сакратаром аднаго з ПТВ, потым 14 гадоў — начальнікам жыллёва-эксплуатацыйнай службы. Калі стала старшынёй, праблемы мясцовага насельніцтва ведала не пачутках. Ды і па жыцці я камунікабельны чалавек, таму праблем з усталяваннем аўтарытэту не было.

Увогуле, у нашым грамадстве год ад году ўзрастае роля, актыўнасць жанчыны ў палітычным жыцці краіны. Сёння ў Пінску больш за 40 прадстаўніц прыгожага полу займаюць адказныя кіруючыя пасады, у гарадскім Савеце 8 жанчын-дэпутатаў. Натуральна, жанчыны ўзначальваюць пярвічкі Беларускага саюза жанчын (іх у Пінску 112, сама я — старшыня жансавета горада).

Не думаю, што дэпутат ці старшыня Савета — гэта выключна мужчынская справа. Ёсць мужчыны, якія вельмі добра спраўляюцца з гэтымі абавязкамі. Аднак ёсць і такія ж жанчыны. Галоўнае, на мой погляд, — ведаць сваю работу, любіць яе, мець жаданне дапамагаць людзям... Звычайна, ва ўсіх старшынь Саветаў, як і ў мяне, акрамя непасрэдных службовых абавязкаў, існуе вялікі аб'ём грамадскай нагрузкі. І вось тут жанчыне складаней. Мужчына-кіраўнік прыйшоў дамоў — там яго чакае прыгатаваная вячэра, адпрасаваная свежая кашуля. Ён паеў і — да тэлевізара. А на жанчыне — ўся хатняя гаспадарка, якой яна вымушана займацца, вярнуўшыся пасля працоўнага дня. У мяне даходзяць рукі да кнігі (я вельмі люблю чытаць) толькі бліжэй да апоўначы. Жанчына абавязкова павінна знаходзіць час, каб пабыць з сям'ёй. У мяне муж, двое дарослых дзяцей, 8-гадовы ўнук. Пакуль што дачка, сын, нявестка і зяць — усе студэнты. Натуральна, ім трэба дапамагаць. Жывуць маладыя асобна, але на святы абавязкова прыязджаюць да нас.

Старшыня Аболіцкага сельскага Савета дэпутатаў Талачынскага раёна Віцебскай вобласці Вера МІХАЛАП:

— Старшынёй я стала зусім нядаўна, літаральна некалькі месяцаў таму, а дэпутатам была і ў мінулым скліканні. Лічу, што для жанчыны гэта — пасільная ноша, хоць і называюць нас слабым полам. У працы вельмі дапамагаюць такія жаночыя якасці, як цярпенне і... цвёрдасць характару (без гэтага сёння жанычне-кіраўніку не абысціся). Увогуле, у наш час жанчына-кіраўнік — гэта норма, а не выключэнне. Сваім калегам, жанчынам-старшыням Саветаў я хачу пажадаць настойлівасці, ініцыятыўнасці, моцнага здароўя і непахіснага жадання працаваць.

Старшыня Столінскага раённага Савета дэпутатаў Брэсцкай вобласці Людміла КІСЕЛЬ:

— З людзьмі я працую даўно. З 85-га года была сакратаром Столінскага гарадскога Савета, потым год адпрацавала намеснікам старшыні гэтага ж Савета, з 90-га па 95-ы была старшынёй Рэчыцкага пасялковага Савета, а з 95-га і да гэтай пары ўзначальваю раённы Савет. Фронт работы вялікі. Аўтарытэт даводзіцца адстойваць кожны дзень. Быць жанчынай-кіраўніком няпроста, аднак такія якасці, як спагадлівасць, чуласць, дабрыня дапамагаюць у кантактаванні з людзьмі. Нават калі нейкае пытанне адразу вырашыць не атрымліваецца (напрыклад, кватэрнае), з чалавекам можна спакойна пагутарыць, растлумачыць яму незразумелыя моманты. Насамрэч, такім павінен быць кожны кіраўнік незалежна ад полу.

Самае складанае ў жыцці жанчыны-кіраўніка — сумяшчаць працу і сям'ю. У мяне двое дзяцей, 6-гадовы ўнук і маленькая ўнучка (ёй 2,5 года). Бабуля ў нашай сям'і — самы патрэбны чалавек: і грашыма дапамагчы, і ўнукаў дагледзець. Родныя хочуць часцей бачыць жанчыну-кіраўніка ў сям'і, але гэта рэдка атрымліваецца. У нас шмат грамадскай нагрузкі, пастаянныя камандзіроўкі, вячэрнія пасяджэнні, нават у выхадныя мы часта бываем занятыя.

Старшыня Страдубскага сельскага Савета дэпутатаў Лоеўскага раёна Гомельскай вобласці Святлана ДЗЕГЦЯРЭНКА:

— Быць жанчынай-кіраўніком і цяжка, і лёгка. Я лічу, што ўсё ж кіраўніком, лідарам павінен быць мужчына, а жанчына павінна клапаціцца пра сям'ю, пра дзяцей. Аднак у наш складаны час мужчыны часта адыходзяць на другі план, а актыўную сацыяльную пазіцыю бяруць на сябе жанчыны. Жанчына стала здабытчыцай і ў сям'і. Не хачу пакрыўдзіць мужчын — ёсць сярод іх адказныя, ініцыятыўныя, але ў вёсцы такіх вельмі мала. У нашым раёне з 9 сельскіх Саветаў толькі ў двух старшыні — мужчыны, ва ўсіх астатніх — жанчыны.

На пасадзе старшыні Савета я 11 гадоў. Галоўнымі якасцямі, патрэбнымі ў рабоце, я лічу шчырасць і стрыманасць у абяцаннях, жаданне дапамагчы людзям. Так склаўся лёс, што дзяцей у мяне няма. Усе свае нерастрачаныя ў сям'і сілы аддаю рабоце. Муж мяне разумее і падтрымлівае (між іншым, у сакавіку будзе 18 гадоў, як мы жаніліся). Калі я толькі прыйшла ў Савет, мне было ўсяго 26 гадоў. Шчыра скажу, прызначэнне мяне старшынёй было шокам і для мяне, і для мясцовага насельніцтва. Многія гаварылі, што я Савет «не пацягну» — зусім жа яшчэ дзяўчынка, а працаваць у асноўным трэба з пенсіянерамі. Але я справілася. Заваявала аўтарытэт канкрэтнымі справамі. І вельмі дапамагла мне наш сакратар. Яна і цяпер са мной працуе.

Старшыня Вайнілаўскага сельскага Савета дэпутатаў Чавускага раёна Магілёўскай вобласці Тамара ЖЫРКЕВІЧ:

— Не магу сказаць, што працаваць старшынёй жанчыне лёгка. Якраз наадварот: бязліч спраў і грамадскіх абавязкаў адцягваюць яе ўвагу ад сям'і. Мая дачка, пакуль была маленькай, заўсёды крыўдзілася, што я рэдка бываю дома. Калі гаварыць пра спецыфіку жаночага кіраўніцтва, адзначу, што мы, жанчыны, больш працуем як псіхолагі з усімі катэгорыямі грамадзян. Асабіста я не «строю», а ўгаворваю, пераконваю.

Старшынёй я 12 гадоў, усяго ў Савеце — 20. Працавала сакратаром, усіх ведала, мяне ўсе ведалі, таму аўтарытэт «з нуля» заваёўваць не трэба было. Безумоўна, жанчына — больш хатняя істота, але пры неабходнасці справіцца з любой грамадскай нагрузкай. Раней у нашым раёне сярод старшынь сельскіх Саветаў больш было жанчын, але цяпер сітуацыя мяняецца. Мужчыны больш мабільныя, а старшыні цяпер без гэтага нельга.

Запісала Інга МІНДАЛЁВА.

НАВОДИМ КРАСОТУ

«ЗОЛОТОЙ СФИНКС» ИЗ ГОЛЛАНДИИ

В розарии могилевского зеленхоза вырастят 30 тысяч цветов по особой технологии

С нынешнего марта специалисты Могилевского предприятия по озеленению и водному хозяйству в метровых плоских пакетах гидропоники, специальной минерализованной «ваты», планируют выращивать розы по особой голландской технологии в новенькой теплице по улице Сурганова.

Фото Николая ТИТОВА.

По словам заместителя генерального директора УКП Моггорисполкома Владимира Мельникова, больше года назад по поручению Президента во всех областных центрах решено было реконструировать морально устаревшие, неиспользуемые по назначению теплицы. В итоге в Могилеве стройка получилась интернациональная. Тендер на разработку проекта оранжереи зеленхоза выиграла фирма из Киева, оцинкованную металлоконструкцию для теплицы предоставили россияне (они же и смонтировали будущий розарий), подрядчиком объекта стало ОАО «Могилевхимремонт», а остеклением оранжереи занималось ОАО «Гомельстекло». Саженцы, технологическое оборудование, расходные материалы и все секреты выращивания роз наши агрономы получат от голландской фирмы «ATS b.v.». В прошлом году стоимость строительства и материалов для теплицы, по словам Владимира Мельникова, составляла 5701 млн рублей.

В течение года голландцы будут обучать цветочным премудростям могилевских специалистов и лично контролировать процесс. Пятерых цветочниц собираются отобрать на конкурсной основе: розы тонко чувствуют, кто за ними ухаживает, так что от недобрых рук могут запросто зачахнуть.

Как нам рассказал главный агроном предприятия Василий Скобелев, строительство оранжереи почти закончено. Обещают, что в розарии лето будет круглый год: температура воздуха +18—22 градуса и 18 часов в сутки — подсветка. С конца января голландцы начнут устанавливать технологическое оборудование — уже прибыли два груженых под завязку фургона. А в начале марта в Могилеве ожидают первые черенки роз — всего их будет высажено около 30 тысяч штук на сумму 90 тысяч евро.

«Фишка» голландской технологии в том, что роза растет не в грунте, а в минеральной «вате». Ей даже не нужны периоды «отдыха»: каждые 2—3 месяца в течение почти 6 лет на одной «вате» может вызревать до 8 кустов роз. Первый «урожай» голландских роз в могилевском зеленхозе планируют собрать в середине года. Кстати, созревают эти цветы, по словам главного агронома розария Галины Барашковой, на две недели раньше обычных, а стоять могут даже по 16 дней! Но — они и более уязвимы для всяческой «заразы». Так что никаких контактов тепличных растений с дождиком или уличным воздухом не будет однозначно.

А розы нам обещают шикарные: белые, желтые, кремовые, золотистые, бордовые и красные. Названия сортов сами за себя говорят — «Золотой сфинкс», «Страсть» и еще несколько, где присутствует слово «любовь».

Покупателей интересует: не станут ли заграничные розы «золотыми» по цене? Специалисты говорят, что сделают все, чтобы стоимость одной розы была не больше рыночной. А вот продавцы цветов на Центральном рынке Могилева к таким обещаниям относятся скептически. В любом случае, считают они, без работы не останутся: у предпринимателей появится возможность закупать розы не где-нибудь за тридевять земель, а прямо в Могилеве.

Если эксперимент с голланд-скими розами в могилевском зеленхозе пройдет успешно и окупит себя, наши специалисты, вполне возможно, займутся выращиванием гербер или тюльпанов. По словам Василия Скобелева, первоначально планировалось, что оранжерея при нормальной работе окупит себя примерно через 6 лет. Но подорожание российского газа внесло коррективы, ведь энергорессурсы — самая весомая доля в статье расходов на розарий...

Наталья ВЕСЕЛКИНА.

У РЭЖЫМЕ ЭКАНОМІІ

БЫЎ «МІНУС», СТАЎ «ПЛЮС»

ЭНЕРГАЗБЕРАЖЭННЕ ЗА КОШТ МЯСЦОВЫХ РЭСУРСАЎ

Цікава, як з часам мяняюцца крытэрыі ацэнкі гаспадарчасці. Тое, што некалі было вялікім мінусам, стала вялікім плюсам.

Прыкладна шэсць гадоў назад дырэктара Вілейскай мэблевай фабрыкі Анатоля Драздова моцна прэсінгаваў райвыканкам за яго «недальнабачнасць», адсутнасць «адчування перспектывы», «няўменне ўзняцца над паўсядзённасцю» і г.д. А сыр-бор разгарэўся з-за таго, што Анатоль Сяргеевіч наадрэз адмаўляўся падключаць прадпрыемства да прыроднага газу. Аргумент — гэты крок эканамічна немэтазгодны, бо на фабрыцы досыць драўляных адходаў, выкарыстанне якіх амаль поўнасцю закрывае патрэбы прадпрыемства ў цеплавой энергіі. Райвыканкам «ціснуў» на дырэктара, той стаяў на сваім. Дарэчы, яго тады падтрымлівалі некаторыя дэпутаты райсавета, якія падзялялі правільнасць пазіцыі кіраўніка.

На шчасце дырэктара, эканамічныя паказчыкі прадпрыемства былі выдатныя і ад Драздова адчапіліся. Праўда, аб'явілі вымову (відаць, у мэтах выхавання).

Сёння ў Вілейскім райвыканкаме, калі размова зайшла аб энергазберажэнні шляхам выкарыстання мясцовых рэсурсаў, мне адразу ў якасці цікавага прыкладу назвалі мэблевую фабрыку, параілі наведаць яе і на свае вочы пераканацца ў эфектыўнасці падыходу Драздова.

Сам Анатоль Сяргеевіч той выпадак успамінае з гумарам. Сапраўды, хто тады думаў, што апілкі і абрэзкі будуць усур'ёз разглядацца як альтэрнатыўныя энерганосьбіты. А на фабрыцы даўно «змікіцілі»: з адходаў можна атрымліваць даходы. Там да 2000 года штогод спальвалі паўтары тысячы тон мазуту. Пасля запуску катла на адходах драўніны расход гэтага паліва зменшыўся да 805 тон. Праз два гады перавялі на адходы яшчэ адзін кацёл. Штогадовае спажыванне мазуту спынілася на ліч-бе 300 тон. І пайшло... У выніку з лютага 2004 года мазут на фабрыцы практычна не выкарыстоўваецца. Праўда, на ўсякі выпадак адзін кацёл на мазуце трымаецца ў рэзерве. Такая вось хроніка пераходу на мясцовае паліва. (Нагадаем, сёння тона мазуту каштуе $237.

Свая не менш цікавая гісторыя выкарыстання адходаў у якасці энерганосьбітаў на вілейскім заводзе «Буддэталь». Яго спецыялізацыя — сучасныя на ўзроўні замежных стандартаў дзверы. Дзякуючы ўдаламу спалучэнню якасці і цаны яны карыстаюцца ўстойлівым попытам у Беларусі і за мяжой. На цану вырабу, як вядома, у многім уплывае кошт энерганосьбітаў. Здолееш знізіць сабекошт — прадукцыя будзе больш канкурэнтаздольнай.

Тэхнічны дырэктар завода Анатоль Гарбаценка расказвае, што раней спажывалася штомесяц 450 тон мазуту. Сёння гэта каштавала б амаль $100 тысяч.

(Заканчэнне на 2-й стар. «МС»)

ВЫРАШЭННЕ ПРАБЛЕМ ПА ЛЬГОТНЫХ ЦЭНАХ

Пажылым людзям заўсёды патрэбна дапамога. Гэта і ўлічылі кіраўнікі Добрушскага камбіната бытавога абслугоўвання, калі стварылі брыгаду экстраннай сацыяльнай дапамогі, якая вырашае праблемы па льготных цэнах. Дарэчы, заяўкі пенсіянераў на нарыхтоўку дроў, рамонт дахаў, агароджы, абутку і іншае прымаюць як у галаўным прадпрыемстве, так і ў трынаццаці комплексных пунктах.

Уладзімір ПЕРНІКАЎ.

У НАС АДНА ПРЫВІЛЕЯ — АДКАЗНАСЦЬ ПЕРАД ЛЮДЗЬМІ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС»).

У аграпрамысловым комплексе прыярытэтным застаецца павелічэнне вытворчасці прадукцыі на аснове інтэнсіўных і прагрэсіўных тэхналогій, зніжэнне сабекошту прадукцыі, паляпшэнне яе якасці.

Аналагічным чынам мы абазначылі і кропкі прыкладання свайго ўздзеяння ў астатніх галінах і сферах вытворчасці. Але асноўным быў і застаецца клопат аб забеспячэнні належных умоў для працы і пражывання нашых людзей, захавання законнасці і правапарадку, сацыяльных гарантый, умацавання сям'і як асновы нашага грамадства і развіцця ўсіх сфераў жыццезабеспячэння насельніцтва.

У гэтай сувязі самая пільная ўвага будзе нададзена павышэнню ролі органаў мясцовага кіравання і самакіравання. У гэтых мэтах разам з аблвыканкамам рэгулярна праводзім сустрэчы з дэпутатамі ўсіх узроўняў, на якіх настройваем іх на канкрэтную і прадметную работу з людзьмі. Ужо вызначаны базавыя раёны, дзе будзе адпрацоўвацца механізм рэалізацыі па многіх накірунках дзейнасці Саветаў. Гэта Уздзенскі, Барысаўскі, Маладзечанскі і Дзяржынскі раёны. Яны стануць свайго роду вопытнымі пляцоўкамі для практычнага ажыццяўлення пастаўленых перад Саветамі дэпутатаў задач.

Яшчэ адзін прыярытэтны накірунак — добраўпарадкаванне. Тут нам разам з выканаўчай уладай працаваць і працаваць. Выглядаць прыгожа павінна ўся тэрыторыя сельсавета, а не толькі яго адміністратыўны будынак.

У сувязі з гэтым вельмі важнай з'яўляецца і праграма развіцця малых і сярэдніх гарадоў — там пражывае большасць нашага насельніцтва. Натуральна, вялікія грошы пад гэту праграму ніхто не выдзеліць — многае будзем рабіць сваімі сіламі, праводзіць суботнікі, іншыя мерапрыемствы, каб зарабляць сродкі для гэтых мэтаў.

— Напэўна, малым гарадам і пасёлкам на гэтым шляху можа добра паспрыяць развіццё прадпрымальніцтва, малога і сярэдняга бізнэсу?

— Вы абсалютна правільна ставіце пытанне. Не сакрэт, што вытворчасць, асабліва ў пачатку 90-х гадоў, некалькі «звярнулася», і вынікі ўзнікла праблема занятасці насельніцтва... У вобласці праграма развіцця прадумана ў адносінах да кожнага пасёлка. Самае патрэбнае, на наш погляд, — і тут я поўнасцю падтрымліваю меркаванне старшыні аблвыканкама Мікалая Дамашкевіча — развіваць перапрацоўчую прамысловасць: мяса-малочную і садавіна-агароднінную.

Мінскі абласны Савет ніколі не быў «кішэнным». Ды і «дзяліць» нешта з аблвыканкамам няма ніякай неабходнасці

Будзе граматна наладжана перапрацоўка — з'явяцца грошы і працоўныя месцы...

— У апошні час шмат увагі надаецца праграме адраджэння вёскі... Якой тут бачыцца вам роля Саветаў?

— Ды самай непасрэднай! Канешне, узводзіць новыя будынкі сельскі Савет не можа, не мае магчымасці. А вось захаваць пабудаванае, прасачыць за парадкам, навесці прыгажосць — можам. Вы спытаеце — я прадбачу ўжо — адкуль браць грошы? Адкажу: уважліва чытайце Указ Прэзідэнта № 21, які датычыцца павышэння ролі органаў мясцовага кіравання і самакіравання. Дадзены дакумент канкрэтна ўказвае на крыніцы прыцягнення сродкаў. У ліку іх даходы ад здачы ў арэнду маёмасці, якая знаходзіцца ў камунальнай уласнасці сельсавета.

Трэба правесці інвентарызацыю. Пасля яе правядзення, упэўнена, знойдзецца нямала памяшканняў, якія могуць прынесці прыбытак. Тое ж самае і з бязгаспадарчай маёмасцю. Не хочуць гаспадары яе ўтрымліваць — вырашайце пытанне праз суд. Але «касабокіх» хат з пустымі вокнамі на тэрыторыі сельсавета быць не павінна. Апроч усяго, яны вельмі небяспечныя ў сэнсе пажарнай сітуацыі і рызыкі ператварэння ў прытулкі для бадзяжнікаў.

— Сёння Саветы часам папракаюць у тым, што яны «танцуюць пад дудку выканкамаў», з'яўляюцца «кішэнным органам»...

— Гэта сітуацыя магчыма там, дзе Савет дэпутатаў не з'яўляецца дзеяздольным, не ўмее і не хоча працаваць. Дэпутацкі аўтарытэт, як і асабісты, трэба зарабіць. Магу дакладна сказаць, што Мінскі абласны Савет ніколі не быў «кішэнным». Ды і «дзяліць» нешта з аблвыканкамам няма ніякай неабходнасці. Мы робім агульную справу. Па ініцыятыве старшыні аблвыканкама Мікалая Дамашкевіча пачалося, я сказала б, маштабнае забеспячэнне Саветаў камп'ютарамі і аргтэхнікай, а ў сувязі з гэтым — навучанне і перападрыхтоўка кадраў старшынь сельскіх Саветаў і сакратароў. І ніхто ў аблвыканкаме не сказаў мне — маўляў, гэта «вашы праблемы». Мы — улада, выканкам — улада. І адны, і другія павінны зрабіць усё, каб людзям жылося лепш. І гэта галоўная ацэнка і для Савета дэпутатаў, і для выканкама.

Сёння аблвыканкамам унесена прапанова аказваць дэпутатам абласнога Савета матэрыяльную дапамогу, чаго не было раней. У выканкамах абласнога і раённага ўзроўняў будуць выдзелены для арганізацыі работы дэпутатаў памяшканні.

— Ёсць на тэрыторыі вобласці прыклады такой работы Саветаў, якая вас поўнасцю задавальняе?

— І прыкладаў шмат, і задавальненне ад зробленага ёсць... Але ж і патрабаванні павышаюцца штодзень, і задачы ўскладняюцца... Сёння даводзіцца берагчы электраэнергію, газ, цяпло. І адначасова тлумачыць, што эканоміць — гэта не значыць ушчамляць людзей ці абмяжоўваць іх у нечым. А вось калі ліхтары цэлы дзень гараць, калі ў два разы больш траціцца сродкаў там, дзе можна патраціць менш — за гэта не грэх і спытаць. Трэба прывучацца да ашчаднасці.

— Вы ўжо вызначыліся з уласным стылем кіравання?

— Дапамагчы, падказаць, навучыць... І спытаць. Стыль адносінаў да працы павінен быць дзелавым, а не асабовым, не «мужчынскім» ці «жаночым».

Я ўвогуле вельмі паважаю людзей, якія не шукаюць падстаў, з-за каторых «нельга», а знаходзяць магчымасці, каб рухацца наперад. І сваю «каманду» буду нацэльваць на работу ў такім ключы.

Гутарыла Наталля КАРПЕНКА.

ПРАЦОЎНЫЯ МЕСЦЫ ДЛЯ ГЛЫБІНКІ

Гарадскі пасёлак Глуша ў Бабруйскім раёне — хоць і глыбінка, але вядомае месца на карце Беларусі. Па-першае, тым, што тут жыў і працаваў вядомы беларускі пісьменнік Алесь Адамовіч. А яшчэ ў гэтых мясцінах ганарыліся шклозаводам, на якім працаваў амаль кожны трэці жыхар пасёлка. Таму банкруцтва ААТ «Шкло-Глуша», якое адбылося ў 2002 годзе, стала драмай для мясцовых жыхароў. Людзі засталіся без працы, і, на жаль, інвестараў для аднаўлення састарэлай вытворчасці шкляных бутэлек і адраджэння прадпрыемства так і не знайшлося.

Глушу тады сталі называць не рабочым — як раней, а беспрацоўным пасёлкам. Тут многія былі заклапочаны стварэннем новых працоўных месцаў. І справа, нарэшце, агульнымі намаганнямі зрушылася з месца.

Летась у Глушы з'явілася вытворчасць чыпсаў. Прыватны праект «Ініцыятыва плюс» даў глушанцам адразу тры дзесяткі працоўных месцаў. Цяпер жа ў сценах былога шклозавода адкрылася швейнае прадпрыемства. Гэта першы вытворчы аб'ект у Магілёўскай вобласці, які створаны ў межах Дзяржаўнай праграмы развіцця малых гарадоў і пасёлкаў на гэтую пяцігодку.

Новае прадпрыемства «Славянка-Глуша» будзе спецыялізавацца на пашыве адзення па ўзорах вядомай бабруйскай фабрыкі ААТ «Славянка». Цяпер у Глушы шыюць школьныя касцюмы. Днямі выпушчана першая партыя школьнай формы для хлопчыкаў. Мяркуецца, што цэх у пасёлку будзе выпускаць прадукцыю прыкладна на 1 мільярд рублёў у год: школьнае адзенне цяпер запатрабаванае і ў Беларусі, і ў суседняй Расіі. На прадпрыемстве працуюць 24 швачкі: усе яны ў асноўным былыя работніцы шклозавода, якія прайшлі перападтрыхтоўку. У перспектыве тут плануюць арганізаваць працу ў дзве змены.

З'яўленнем у Глушы працоўных месцаў мясцовае насельніцтва задаволена: у адкрыцці новых вытворчасцяў людзі бачаць добры знак. Так лічаць і ў Глушанскім сельскім Савеце. Дарэчы, нядаўна яго ўзначаліла малады дэпутат Марына Сушчанка, якая раней працавала школьным псіхолагам. Яна — мясцовая ўраджэнка і свой шлях у дэпутацтва тлумачыць тым, што моцна перажывае за родную Глушу.

— Сваю галоўную мэту я бачу ў тым, каб узнімаць пасёлак,— сказала Марына Леанідаўна. Мы хочам дамагчыся рэалізацыі інвестыцыйных праектаў, каб у глушанцаў з'явілася праца. Мы марым вярнуць з Расіі нашых мужчын.

У Глушы жывуць цяпер каля 1,5 тысячы чалавек, але ў Савеце скардзяцца, што пасёлак стаў жаночым. Мужчыны ездзяць на заробкі, каб карміць свае сем'і. Прычым найбольш крыўдна, дадае старшыня сельскага Савета, што з'язджаюць у асноўным маладыя людзі, якія прыходзяць з арміі альбо заканчваюць навучальныя ўстановы. Замест таго, каб прыносіць карысць сваёй зямлі, яны часта адпраўляюцца ў Маскву і Пецярбург на заробкі.

Паводле меркавання Марыны Сушчанка і яе калег, Глушы трэба адкрыць яшчэ па крайняй меры некалькі соцень працоўных месцаў, каб забяспечыць працай і заробкам усіх тых, хто здольны і хоча працаваць. Мяркуецца, што гэта будзе прамысловая альбо будаўнічая вытворчасць: сельскай гаспадаркай у гэтых мясцінах сур'ёзна не займаюцца — навокал лясы.

У сельвыканкаме гавораць, што тутэйшы народ гатовы, калі трэба, авалодаць новымі прафесіямі. Раней у Глушы адкрыліся новыя крамы і Дом быту, і мясцовыя жанчыны вывучыліся на прадаўшчыц і цырульнікаў. Адзін прадпрымальнік абяцаў адкрыць у Глушы вытворчасць крухмалу. Ёсць надзея і на бабруйскія прадпрыемствы... Дадатковыя складанасці стварае адсутнасць у пасёлку прыроднага газу: раней за праект газіфікацыі плацію шклозавод, аднак цяпер планы па газу «замарожаныя».

— Нам да гэтага часу крыўдна, што зачынілі наш шклозавод, — прызнаюцца ў Глушы. — Незразумела, чаму не дапамаглі і не падтрымалі. Аднак жыццё ідзе, і нам патрэбна праца. Спадзяёмся, што дапамогуць нашаму пасёлку падняцца з каленяў! І прыкметы гэтага ўжо ёсць. Літаральна днямі ў Глушы адбылося ўрачыстае адкрыццё вясковага клуба. Яго чакалі ў пасёлку дваццаць гадоў. Пачынаў будаваць клуб шклозавод, але потым «каробку» кінулі. Каб дарабіць установу, шмат працавалі архітэктары і будаўнікі. Цяпер у клубе дзейнічае філіял школы мастацтваў, дзе дзяцей вучаць музыцы, маляванню і рамёствам. Там жа размясцілася бібліятэка і збіраюцца самадзейныя артысты. У гонар адкрыцця клуба ў сакавіку прызначаны вялікі канцэрт для глушанцаў.

Ілона ІВАНОВА.

БЫЎ «МІНУС», СТАЎ «ПЛЮС»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС»).

— Я не ведаю, дзе б мы цяпер бралі такія грошы. Але ў свой час мы пачалі пераводзіць кацельню з мазуту на адходы драўніны. Сёння яна забяспечвае патрэбы ў цяпле і энергіі як сваёй вытворчасці, суседніх прадпрыемстваў, так і шэрагу жылых дамоў. Эфект эканоміі каласальны, — гаворыць Анатоль Уладзіміравіч.

У раёне ўжо пройдзены першы этап асэнсавання вопыту ўжывання мясцовага паліва. Аказваецца, можна ў сваю чаргу больш эканомна выкарыстоўваць і самі адходы драўніны — спальваць яе не ў чыстым выглядзе, а ў адпаведнай сумесі, як гэта даўно робяць за мяжой. Формула простая: трэць трэсак, трэць кары і апілак дрэў і трэць торфу. Праверана — гарыць цудоўна. У раёне тры гэтыя кампаненты, у тым ліку і торф, маюцца ў наяўнасці. Даволі значныя яго радовішчы месцяцца непадалёк ад Вілейкі. Гэта, паводле слоў намесніка райвыканкама Генадзя Касцевіча, энергетычны рэзерв раёна. А пакуль у ход ідуць трэска, апілкі, абрэзкі.

Хто думаў, што апілкі і абрэзкі будуць разглядацца як альтэрнатыўныя энерганосьбіты?

Пры планавым паказчыку выкарыстання да 25 працэнтаў мясцовых відаў паліва ў энергетычным балансе Вілейшчыны гэты паказчык складае 30 працэнтаў. Што гэта значыць на практыцы? Пры надвор'і да пяці градусаў марозу можна ацяпляць будынкі без выкарыстання мазуту, вугалю і нават газу. Праўда, апошні паўсюдна нельга выключыць з-за таго, што кацельні двух прадпрыемстваў некалькі гадоў таму былі пераведзены на газ. Улічваючы, што ў выніку глабальнага пацяплення зімы лютымі назваць цяжка, эканомія газу і нафтапрадуктаў атрымліваецца саліднай.

У лясным Вілейскім раёне ўжо не хапае сваіх адходаў драўніны. Іх заказваюць у іншых раёнах, напрыклад, суседніх Лагойскім і Маладзечанскім. Са свайго боку, Вілейскі раён пастаўляе ў Мядзельскі 8 тысяч кубаметраў дроў. Аднак у Вілейцы ўсё больш схіляюцца да прыпынення гэтых паставак. Прычына важкая — міні-ТЭЦ, якая ўзводзіцца на ўскрайку Вілейкі. Яна будзе працаваць выключна на мясцовым паліве. Яе магутнасць — 2,5 мегавата ў год. Гэта — самая магутная міні-ТЭЦ такога класа ў краіне. Электраэнергія і цяпло будуць паступаць у энергасетку райцэнтра. Мяркуецца, што на поўную магутнасць міні-ТЭЦ выйдзе ўжо ў сярэдзіне гэтага года. У выніку Вілейка атрымае дадаткова каля 20 працэнтаў электраэнергіі. Гэтага хопіць на асвятленне горада.

— Вяртанне да энергетычных выткаў — працэс, відаць па ўсім, хоць і вымушаны, але, безумоўна, эканамічна мэтазгодны. І пачаўся ён у раёне некалькі гадоў таму, — расказвае старшыня Вілейскага райсавета Яўген Ігнатовіч. — У справу адразу ўключыліся сельвыканкамы. Ці шмат яны зрабілі? Я думаю, што нямала. Напрыклад, у раёне няма праблемы з дровамі для насельніцтва. Можа, некаму гэта здаецца дробяззю, але вясковыя людзі так не думаюць. Быць пры дровах — значыць, адчуваць сваю энергетычную бяспеку. Пры сельсаветах былі створаны брыгады па нарыхтоўцы дроў, іх дастаўцы спажыўцам.

У такой, на першы погляд, простай і адпрацаванай аперацыі, аказваецца, ёсць свае рэзервы эканоміі, у дадзеным выпадку, бензіну ці саляркі. У вёсцы Жары адкрыты самы вялікі ў раёне ўчастак па нарыхтоўцы дроў. Адсюль іх развозяць па вёсках нават суседніх сельсаветаў. Раней дровы завозілі са склада ў Вілейцы, ад якой да Жараў 35 кіламетраў. Такім чынам, эканомія нафтапрадуктаў відавочная.

— У гэтым, дарэчы, вялікая заслуга старшыні Жарскага сельскага Савета Уладзіміра Іванова, — гаворыць Яўген Антонавіч.

Пры такіх тэмпах пераходу на мясцовае паліва рана ці позна паўстае пытанне аб драўніне. Пакуль яе хапае. Пэўнай крыніцай служаць вялізныя «пераспелыя» (і таму аварыйныя) дрэвы, якія паступова спілоўваюць каля вясковых хат, электраліній і г.д. На думку Яўгена Ігнатовіча, трэба ўжо сельсаветам клапаціцца аб закладцы плантацый народ хуткарослых дрэў: асіны, таполі і іншых. Гэта дазволіць з часам паставіць на планавую аснову нарыхтоўкі дроў незалежна ад месцаў лясных высечак.

Не менш важнай справай лічыць Яўген Антонавіч выхаванне псіхалогіі энергазберажэння ў людзей, каб яны самі бачылі і сваю асабістую зацікаўленасць, і агульную грамадскую карысць у эканоміі энергарэсурсаў.

У сельскіх гаспадарках і на прадпрыемствах раёна шмат робіцца па замене старога энергаёмістага абсталявання і ўкараненню энергазберагальных тэхналогій, напрыклад, замене воданагравальных катлоў на фермах.

Там іх па меры магчымасці пераводзяць на мясцовае паліва, а дзе не атрымліваецца, ставяць эканамічныя электрычныя катлы з цеплавой ізаляцыяй, аўтаматычным кантролем за тэмпературай вады. Ужо амаль ва ўсіх гаспадарках сушыльныя ўстаноўкі пераведзены на мясцовае паліва.

Вельмі перспектыўны накірунак энергазберажэння — выкарыстанне сучасных лямпачак. Тут рэзервы эканоміі велізарныя. Адна такая лямпачка ў 20 Ват дае святла як «сотка», а спажывае пры гэтым электрычнасці ў пяць разоў менш.

Сёлета, паводле слоў Яўгена Ігнатовіча, для сельвыканкамаў раёна ў шэраг першачарговых задач выходзіць стварэнне так званых энергетычных пашпартоў. Яны будуць складацца на кожны аб'ект, які на тэрыторыі раёна спажывае той ці іншы від энергіі: школу, ФАП, краму, клуб і г.д. Мэта — вызначыць па кожнаму аб'екту аптымальныя для нармальнага функцыянавання расходы энергіі, перакрыць каналы яе страт.

Леанід ЛАХМАНЕНКА.

ВІДАВОЧНАЕ–НЕВЕРАГОДНАЕ

ЕЗДЗЯЦЬ ТУТ УСЯЛЯКІЯ...

Вёска Чонкі зусім блізка ад Гомеля. Маляўнічая мясцовасць тут: лес, рака, пойменныя лугі. Выдатны адпачынак для гараджан, нават санаторый маецца. Адна за адной прыязджаюць сюды легкавушкі — у садовыя таварыствы «Матор», «Барэц» і г.д.

Вось гэтыя акалічнасці і вырашылі выкарыстаць у Чонкаўскім сельскім Савеце. Маўляў, ездзяць тут дачнікі, навакольнае асяроддзе аўтамабільным дымам забруджваюць. І ні капейкі не плацяць за гэта. Непарадак. Трэба прымаць рашучыя меры. Тым больш што сельсавет адчуваў патрэбу ў грашовых сродках. Таму ў пачатку мінулага года на свет і з'явілася адпаведнае рашэнне «Аб парадку фарміравання і выкарыстання мэтавага пазабюджэтнага фонду», адным з пунктаў якога быў прадугледжаны штогадовы ўзнос уладальнікамі транспарту, які транзітам праязджаў праз вёску, у памеры 0,7 базавай велічыні.

З гэтай мэтай пры ўездзе ў населены пункт былі ўстаноўлены знак і «рух забаронены» і дзяжурылі аўтаінспектары, якія штрафавалі парушальнікаў. Не хочаш плаціць ім — плаці сельсавету. Вядома, дачнікі — у сельвыканкам, а там адказваюць: рашэнне органа мясцовай улады трэба паважаць і выконваць. Яны — у дзяржаўтаінспекцыю, а там кажуць: мы тут ні пры чым, звяртайцеся ў суд...

Таму людзі і вымушаны былі звярнуцца ў пракуратуру вобласці са скаргай. Там канстатавалі, што законам вышэй указаны збор для мясцовых Саветаў дэпутатаў не прадугледжаны, а таму ён павінен быць адменены.

На аснове пратэсту пракуратуры чарговая сесія сельскага Савета выправіла памылку. Як гаворыцца, праўда перамагла. Але пытанні ўсё ж узнікаюць: чаму кіраўнікі вышэйназванага пярвічнага органа ўлады, прымаючы рашэнне, не зазірнулі ў адпаведны закон ці не параіліся з вышэйстаячымі інстанцыямі — райвыканкамам, райсаветам, аблсаветам? А прымусілі людзей нервавацца і некалькі месяцаў хадзіць па інстанцыях?

Уладзімір ПЕРНІКАЎ.

«ПРАБЛЕМНЫЯ» РАЁНЫ БАРЫСАВА ВЫРАТУЮЦЬ АД ПАДТАПЛЕННЯ

На працягу многіх гадоў у Барысаве захоўваецца складаная сітуацыя з водаадвядзеннем у чатырох мікрараёнах — Залінейным, Максімаўцы, Дымкі, а таксама вакол вуліцы Нармандыя-Нёман. Падчас моцных дажджоў ці паводкі падтапляецца шэраг дамоў. На «праблемнай» тэрыторыі знаходзяцца 3,2 тысячы падворкаў, дзе жывуць амаль 13 тысяч чалавек.

Як адзначыў старшыня Камітэта па архітэктуры і будаўніцтву Мінскага аблвыканкама Уладзімір Гаканаў, падчас забудовы адпаведных мікрараёнаў дапушчана сур'ёзная памылка — узводзіць тут дамы было нельга без правядзення мерапрыемстваў па водаадвядзенню.

Перш за ўсё гэта датычыцца Залінейнага раёна, які фактычна знаходзіцца ў пойме Бярэзіны. Праекты па ахове ад падтаплення распрацоўваліся яшчэ ў 1997 годзе, але тады яны не былі рэалізаваныя. Сітуацыя абвастрылася ў жніўні мінулага года, калі выпала практычна трохгадовая норма ападкаў.

Тады ў Залінейным раёне «пад вадой» апынуліся каля 200 падворкаў. Надзвычайнае здарэнне вымусіла звярнуцца да інжынерных планаў па выратаванню раёна. Па рашэнню кіраўніка дзяржавы адпаведны аб'ект у пазачарговым парадку быў уключаны ў сёлетнюю Дзяржаўную інвестыцыйную праграму. Як паведаміў Уладзімір Гаканаў, увогуле рэалізацыя праекта па Залінейнаму раёну ацэньваецца дзесьці ў 17 мільярдаў рублёў (дарэчы, гэтая лічба не канчатковая — па даручэнню кіраўніка дзяржавы мяркуецца зменшыць кошт аб'екта). Першая яго чарга, да ўвасаблення якой прыступяць праз пэўны час, каштуе каля 5 млрд рублёў.

Увесь комплекс мерапрыемстваў плануецца рэалізаваць за два гады. Пасля чаго чарга, магчыма, дойдзе і да іншых «праблемных» тэрыторый Барысава.

Мікалай ЛІТВІНАЎ.

МЯСЦОВЫ ДЭПУТАТ

БЕЗ МАТЭРЫЯЛЬНЫХ ВЫГОД, АЛЕ З МАРАЛЬНЫМ ЗАДАВАЛЬНЕННЕМ?

У рэдакцыю «Звязды» звярнуўся жыхар Мінска Генадзь Пяткевіч з просьбай расказаць, якімі перавагамі ў матэрыяльным і бытавым плане карыстаюцца дэпутаты мясцовых Саветаў у параўнанні з простымі грамадзянамі. Сапраўды, няўжо ў дэпутаты ідуць толькі для таго, каб абараняць інтарэсы народа?

Як адзначыў сакратар Цэнтральнай камісіі па выбарах і правядзенню рэспубліканскіх рэферэндумаў Мікалай Лазавік, «дэпутаты мясцовых Саветаў сёння наўрад ці могуць мець нейкія матэрыяльныя выгоды ад свайго дэпутацтва. Справа ў тым, што матэрыяльная ўзнагарода за выкананне дэпутацкіх абавязкаў для іх не прадугледжана. Нейкія дадатковыя льготы і прывелеі таксама, напэўна, знайсці складана». Сапраўды, згодна з заканадаўствам, дэпутат мясцовага Савета «здзяйсняе свае паўнамоцтвы, як правіла, не парываючы з вытворчай або службовай дзейнасцю». Падчас сесіі Савета ён проста вызваляецца ад выканання сваіх звычайных абавязкаў на неабходны тэрмін. Пры гэтым за ўвесь перыяд вызвалення яму будзе выплачвацца сярэдняя заработная плата, а таксама — кампенсавацца камандзіровачныя расходы.

Сапраўды, нейкія перавагі дэпутату мясцовага Савета тут знайсці наўрад ці магчыма. Гэта не дэпутат Палаты прадстаўнікоў, у якога і заробак міністэрскі, і кватэра службовая. Адзінае — стаўшы дэпутатам мясцовага Савета, можна менш клапаціцца пра свой асноўны занятак на працягу бліжэйшых чатырох гадоў. Па заканадаўству дэпутат мясцовага Савета ў перыяд сваіх паўнамоцтваў не можа быць па ініцыятыве адміністрацыі звольнены з работы на прадпрыемстве, ва ўстанове, арганізацыі, выключаны з калгаса, навучальнай установы, а таксама пераведзены ў парадку дысцыплінарнага спагнання на ніжэйаплатную работу або паніжаны ў пасадзе без папярэдняй згоды Савета. Дэпутат з ліку ваеннаслужачых не можа быць звольнены са службы, паніжаны ў пасадзе, перамешчаны па службе без яго згоды. Яму не можа быць затрымана прысваенне чарговага воінскага звання. Дэпутату, які ў сувязі з выбранням дэпутатам усё ж такі быў вызвалены ад сваіх ранейшых абавязкаў, пасля заканчэння тэрміну дэпутацкіх паўнамоцтваў прадастаўляецца ранейшая або іншая раўнацэнная праца.

Такім чынам проста ад наяўнасці статуса нешта набыць у матэрыяльным плане дэпутату мясцовага Савета складана. Як адзначыў Мікалай Лазавік, «калі дэпутат — паспяховы прадпрымальнік, то ў яго і даходы будуць добрыя. Кіраўнік прыбытковага прадпрыемства таксама, напэўна, будзе мець добры даход. Але гэта будуць даходы не ад дэпутацкай дзейнасці».

Тым не менш «нейкі рэзон» у жаданні стаць дэпутатам мясцовага Савета сакратар Цэнтрвыбаркама бачыць. Паводле слоў, «калі дэпутатам абласнога, раённага ўзроўню становіцца кіраўнік нейкага прадпрыемства, нават невялікага, ён мае больш магчымасцяў сустракацца з кіраўнікамі іншых арганізацый і ведамстваў, больш эфектыўна вырашаць пытанні свайго працоўнага калектыву». Так, прама або ўскосна мясцовы дэпутат на эканамічную сітуацыю калі не ва ўсім рэгіёне, то на нейкім прадпрыемстве, у нейкай сферы пэўным чынам паўплываць можа. Напрыклад, прапанаваўшы заслухаць справаздачу або інфармацыю нейкага органа або службовай асобы, унёсшы прапанову аб вызваленні ад абавязкаў службовых асобаў, прапанаваўшы правесці праверку выканання заканадаўства. Акрамя таго, дэпутат мясцовага Савета можа накіраваць дэпутацкі запыт, на які атрымае адказ у вызначаны тэрмін. Таксама па пытаннях дэпутацкай дзейнасці дэпутат карыстаецца правам беспяршкоднага наведвання на тэрыторыі Савета дзяржаўных, кааператыўных органаў і арганізацый, грамадскіх аб'яднанняў, правам беспераноснага прыёму іх кіраўнікамі і іншымі службовымі асобамі.

Проста ад наяўнасці статуса набыць нешта у матэрыяльным плане дэпутату мясцовага Савета складана

А вось дэпутаты сельскіх Саветаў, лічыць Мікалай Лазавік, і такіх пераваг не маюць, «бо асноўная іх праца заключаецца ў тым, каб вырашаць паўсядзённыя пытанні, якія ўзнікаюць у іх аднавяскоўцаў». Прычым сваёй працай «яны могуць заваяваць або ўдзячнасць сваіх суседзяў, або наадварот атрымаць дадатковы папрок за тое, што не змаглі вырашыць нейкае пытанне па рамонту дарогі, забеспячэнню нармальнай працы Дома быту, магазіна, мясцовай бальніцы».

Не знайшоўшы матэрыяльнай выгады, сакратар Цэнтрвыбаркама лічыць, што можна казаць аб «некаторай маральнай». Людзі, якія імкнуцца быць у цэнтры палітычных і сацыяльных працэсаў, адзначыў ён, вылучаюцца на першы план, прадстаўляючы інтарэсы сваіх землякоў. Такія дэпутаты могуць праводзіць дэпутацкае расследаванне, падчас якога ўсе дзяржаўныя органы і службовыя асобы абавязаны аказваць неабходнае садзейнічанне, беспяршкодна па-

дастаўляць неабходныя для аб'ектыўнага вывучэння пытання дакументы і інфармацыю. У сваёй выбарчай акрузе дэпутат мае права ўдзельнічаць з правам дарадчага голасу ў разглядзе органамі дзяржаўнай улады і кіравання, органамі адпаведных грамадскіх арганізацый пытанняў, што закранаюць інтарэсы грамадзян, а таксама патрабаваць іх вырашэння. Прычым гэтыя органы павінны загадзя інфармаваць дэпутата аб разглядзе такіх пытанняў; правяраць з прыцягненнем пры неабходнасці спецыялістаў кантрольна-рэвізійных і праваахоўных органаў, грамадскасці інфармацыю аб парушэннях закона, правоў і інтарэсаў грамадзян і арганізацый, праяўленнях цяганіны і бюракратызму, якія сталі вядомыя са зваротаў грамадзян, арганізацый і іншых крыніц. Знайшоўшы парушэнне правоў і інтарэсаў грамадзян, якія ахоўваюцца законам, дэпутат мае права патрабаваць спыніць парушэнні. Як лічыць Мікалай Лазавік, «магчыма, для некага гэта таксама стымул у працы».

Чытача «Звязды» таксама цікавіла пытанне аб адміністрацыйнай і крымінальнай адказнасці дэпутатаў. Такая адказнасць, безумоўна, у беларускім заканадаўстве прысутнічае. І калі «дэпутат мясцовага Савета парушыць правілы дарожнага руху, едзе п'яны», то яго абавязкова спыняць і складуць пратакол. Што ж датычыцца крымінальнай адказнасці, то ў адносінах да ўсіх дэпутатаў, у тым ліку і мясцовых, дзейнічае асобы парадак па іх вытворчасці. Змяненні і дапаўненні ў адпаведныя законы былі прыняты парламентам напрыканцы мінулага года. Згодна з імі, адразу затрымаць дэпутата можна толькі ў выпадку дзяржаўнай здрады або на месцы злачынства. Узбуджаць жа крымінальную справу без гэтых умоў можна са згоды пракурора, яго ж згода неабходна і пры правядзенні аператыўна-пошукавых мерапрыемстваў.

Як бачна, асабліва вялікіх пераваг перад звычайнымі грамадзянамі дэпутаты мясцовых Саветаў не маюць. У сувязі з гэтым і стаўленне да дэпутата на бытавым узроўні адпаведнае. Як адзначыў Мікалай Лазавік, да мясцовых дэпутатаў «нехта ставіцца з павагай, нехта з іроніяй: дома яму работы няма, дык ён справы іншых хоча вырашаць». Па назіраннях сакратара Цэнтрвыбаркама, у горадзе стаўленне — спажывецкае. Тут свайго дэпутата могуць не ведаць, што тым не менш часам не перашкаджае з сарказмам заўважаць: мы яго выбралі, а толку ад яго ніякага. У такой сітуацыі, упэўнены Мікалай Лазавік, нямала віны дэпутатаў. «Проста ў выбаршчыкаў не было неабходнасці да яго звяртацца, — лічыць ён. — Калі ж узнікаюць складанасці, і людзі даведаюцца прозвішча дэпутата, і знойдуць да яго шлях, то ў большасці выпадкаў застануцца задаволены размовай з ім. Наколькі я ведаю, усе дэпутаты імкнуцца выконваць просьбы выбаршчыкаў».

Сяргей КАРАЛЕВІЧ.

ЗАСНАВАЛЬНІКІ:

САВЕТ РЭСПУБЛІКІ НАЦЫЯНАЛЬНАГА СХОДУ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ,

ПАЛАТА ПРАДСТАЎНІКОЎ НАЦЫЯНАЛЬНАГА СХОДУ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ,

УСТАНОВА «РЭДАКЦЫЯ ГАЗЕТЫ «ЗВЯЗДА»

ГРАМАДСКІ САВЕТ:

МАЛАФЕЕЎ А. А., старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па рэгіянальнай палітыцы і мясцоваму самакіраванню;

САСОНКА М. П., старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па дзяржаўнаму будаўніцтву, мясцоваму самакіраванню і рэгламенту;

СЯЛІЦКІ В. С., старшыня Гомельскага абласнога Савета дэпутатаў;

СІВАКОЎ В. А., старшыня Аршанскага гарадскога Савета дэпутатаў;

ЯРКОВІЧ В. І., старшыня Круглянскага сельскага Савета Магілёўскай вобласці.

АДКАЗНАЯ ЗА ВЫПУСК: Наталля КАРПЕНКА.

Кантактны тэлефон 292-21-03.

Краіна здароўя

Выпуск № 5 (18)

Інфарм-укол

«ПЛЮСЫ» ПРЫТРЫМЛІВАННЯ ВЕГЕТАРЫЯНСТВА

Навуковыя даныя ўказваюць на станоўчую ролю вегетарыянства ў змяншэнні рызыкі шэрагу хранічных захворванняў, у тым ліку такіх, як атлусценне, каранарная хвароба артэрыі, гіпертанія, дыябет і некаторыя віды ракавых захворванняў. Вегетарыянства, як і ўсе іншыя тыпы харчавання, павінна быць правільна спланаваным.

Ва ўсякім выпадку Амерыканская асацыяцыя дыетолагаў сцвярджае, што толькі правільна спланаваны вегетарыянскі рацыён з'яўляецца паўнацэнным, карысным для прафілактыкі і лячэння пэўных захворванняў. Даследаванні паказваюць, што часта ў вегетарыянцаў больш нізкая, чым у іншых захваральнасць і смяротнасць ад пэўных хранічных хвароб. Такія фактары, як фізічная актыўнасць і ўстрыманне ад курэння і алкаголю таксама могуць іграць ролю, але дыета — важнейшую.

Вегетарыянскі рацыён карысны з-за нізкага ўтрымання насычаных тлушчаў, халестэрыну і жывёльнага бялку. Вось некалькі прынцыпаў, якія дапамагаюць вегетарыянцам спланаваць здаровыя дыеты: ежа павінна быць разнастайнай, з выкарыстаннем зерневых цэльных прадуктаў, агародніны, фруктаў, арэхаў, семак, малочных прадуктаў і яек; абмяжоўваюцца прадукты з вялікім утрыманнем цукру і тлушчаў; дадаткова ўжываюцца вітаміны В-12 і Д.

«МІНУСЫ» САМАЛЯЧЭННЯ ГАЛАЎНОГА БОЛЮ

Стрэс, забруджанае навакольле, гіпадынамія і г.д. — усё гэта правакуе ўзнікненне галаўных болеў. Галаўны боль — не дыягназ, а сімптом, сігнал і просьба аб дапамозе.

Прычынамі яго могуць быць мігрэні, вегета-сасудзістая дыстанія, інтаксікацыя арганізма, чэрапна-мазгавыя траўмы. Галаўныя болі часта могуць выклікацца групай прычын, напрыклад, астэахандрозам пазваночніка ў спалучэнні з атэрасклерозам. Бескантрольнае прымяненне анальгетыкаў можа пагражаць непрыемнымі наступствамі. Скажам, развіццём прывыкання арганізма да прэпарата. Акрамя таго, бескантрольнае ўжыванне таблетак для абязбольвання нарадзіла новы від галаўных болеў, звязаных якраз з прыёмам прэпарата ад болю!

Неабходна памятаць, што часцей за ўсё прычынамі галаўных болеў з'яўляюцца захворванні, якія паддаюцца лячэнню. Эфектыўным можа быць ўнутрывеннае ўвядзенне лекаў — кропельніцы. Прымяняюцца рэфлекса-, аромтэрапія з выкарыстаннем пахучых маслаў і духмяных траў, гамеапатыя, масаж.

Год дзіцяці

СВЯТА НЕПАСЛУШЭНСТВА,

альбо Мастацтва пераразання пупавіны ў 14 гадоў

У маёй сям'і тры падлеткі, поўны набор: малодшы — 10 гадоў, сярэдні — 12 і старэйшы — 17. І канешне, як ва ўсякай сям'і, бацькі гэтых падлеткаў час ад часу чухаюць патыліцы і пераглядаюцца з пытаннем у вачах, якое не патрабуе вербалізацыі: «Што рабіць?». Бо падлетка выхоўваць — гэта вам не памперсы мяняць! Праўда, калі пераваліў за самы востры перыяд старэйшы, бацькі адчулі сябе амаль што спяцамі, не тое што ўздыхнулі з палёгкай (так табе і дадуць!), проста адчуванне бездапаможнасці не выклікае ўжо такой панікі, як раней. Калі шчыра, то справа, можа ў тым, што сярэдні падлетак піка немагчымай складанасці быцця яшчэ не дасягнуў і бацькі проста крыху пераводзяць дух. Але ж ён ужо на падыходах, і сведчаннем таму — апошні бацькоўскі сход у 7-м класе. Размову завялі бацькі дзяўчынак: маўляў, хай школа будзе больш строгая да адзення і касметыкі, бо дома штораніцы скандалы: «Няма што апрануць!», «А іншыя дзяўчынкі фарбуюцца!». Настаўніца толькі паківала галавой: «У школе патрабаванне да стылю адзення адназначнае: дзелавы, а вось вы, бацькі, прасачыце, каб спіны ў дзяўчынак не былі голыя, а то ж ныркі застудзяць...». Ну і пайшло-паехала. У выніку настаўніца па сакрэту сказала, што дзяўчынкі (амаль што ўсе) скардзяцца: дома іх ніхто не разумее! Маці дзяўчынак былі ашаломленыя і запатрабавалі псіхолага для сваіх дзяцей, маці хлопчыкаў кінуліся іх супакойваць: сябе ўзгадайце. І тут я зразумела, што псіхолаг патрэбны ў першую чаргу не дзецям, а бацькам. Праўда, я, як маці хлопчыка, не рашылася сваю здагадку агучыць, каб не быць абсвістанай, тым не менш да псіхолага знаёмага звярнулася, і тая пацвердзіла: так, выпадак зусім не прыватны. Мы дамовіліся сустрэцца і зрабіць кансультацыю для бацькоў падлеткаў праз газету.

Святлана АНІШЧАНКАВА працуе псіхолагам у сацыяльна-псіхалагічным цэнтры Ленінскага раёна горада Мінска, і, што немалаважна, — сама маці 9-гадовай дзяўчынкі.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

— Святлана, ты кажаш, што бацькам надзвычай важна ведаць узроставыя асаблівасці развіцця дзіцяці. Што для гэтага трэба купляць і чытаць кніжкі па псіхалогіі. Мне стала соромна, я пайшла і купіла і са здзіўленнем прачытала, што, аказваецца, крызіс у падлетка-вым ўзросце перажываюць дзеці не ва ўсіх грамадствах. Напрыклад, кітайцы, быццам бы амаль не ведаюць, што гэта такое...

— Слова «крызіс» тут увогуле не да месца. Які крызіс? Гэта — жыццё.

— Хай не крызіс, але ж канфлікт мае месца: дарослым раптам робіцца цяжка з дзіцем.

— Вось іменна: дарасламу цяжка. А ў дзіцяці ніякага крызісу няма. Яму няпроста, але гэта натуральна. Як натуральна няпроста яму было, калі яно нараджалася. Але калі гэта натуральна, то казаць пра гэта, як пра нейкую праблему, значыць рабіць з мухі слана. Таму мы будзем казаць не пра праблему, а пра асаблівасці развіцця асобы ва ўзросце 12—14 гадоў. Прычым мы павінны памятаць, што тут усё адносна.

Узяць тую ж самаацэнку: наколькі яна адэкватная? Калі дарослы не адэкватны да самога сябе, не бярэ адказнасці за свае паводзіны, за сваё ўспрыманне, а такіх, на жаль, вельмі многа, ён перакладае адказнасць на плечы свайго дзіцяці: «У мяне не атрымалася, я зраблю ўсё, каб атрымалася ГЭТА ў цябе». Здаецца, што быццам бы любоўны падыход, але на самай справе гэта — эгаізм.

Класічныя эпітэты, якія чуюць дзеці ў 14 гадоў: «Неакуратная, бесталковая, нічога табе ў жыцці не трэба, маці з бацькам гарбацяцца, стараюцца з усіх сіл...

—... а ты нічога не даводзіш да канца!

— І ў цябе няма мэты ў жыцці — ШТО З ЦЯБЕ АТРЫМАЕЦЦА!!» Класічная фраза, якую прамаўляюць 90 працэнтаў бацькоў у нашай краіне. Якія ў кітайцаў могуць быць крызісы? Я нядаўна чула па радыё, што калі ў іх быў Новы год, то яны ў гэты дзень дзецям дазволілі рабіць цалкам усё.

— І што? Дзеці скарысталіся гэтай свабодай?

— Думаю, што не. Бо які сэнс карыстацца тым, што ты і так маеш. Разумееш, дзеці цалкам адэкватныя, калі яны жывуць сваім жыццём, так, як ім зручна, калі пры гэтым у іх сфарміраваны маральныя каштоўнасці. Калі шчыра, то я думаю: дай мы такое Свята непаслушэнства сваім дзецям, то нічога страшнага не атрымалася б.

— Ты думаеш, што ніхто не сеў бы за татаў «Мерседэс» і не выехаў на сустрэчную паласу? Што нашы дзеці не кінуліся б адразу смакаваць дарослыя напоі, закупляць цыгарэты і паўтараць пікантныя сцэны з кінафільмаў?

— Цяжэй за ўсё не асуджаць. Чалавеку трэба давяраць, у якім бы ён узросце ні быў. Калі дзіцяці давяраюць, то казаць пра бытавыя нюансы, якія могуць быць у сітуацыі аднаго дня (а не пра хранічную псіхалагічную траўму, якая можа справакаваць сістэматычныя негатыўныя паводзіны ў далейшым), няма сэнсу. У нас педагогіка асуджальная, аўтарытарная, прыціскальная: «Колькі б цябе ні прасіў, ты зноў зрабіў так, як я не жадаю! Колькі можна цярпець гэтае бязладдзе!». Пры гэтым мы не думаем пра тое, што наша асуджэнне не толькі не падштурхне дзіця змяніць сітуацыю (калі дагэтуль не падштурхнула), але і зробіць блізкія, гарманічныя адносіны з ім зусім недасягальнымі.

Я працавала ў каледжы з маладымі людзьмі 17—20 гадоў. Ведаеш, што яны чуюць ад бацькоў штодня? «Ты неахайная, ты зноў не прыбрала ў пакоі, колькі можна?». Уяўляеш, якая нуда?! Гадамі адно і тое ж. Ды не неахайныя яны. Проста ў 15 гадоў нікому не хочацца мыць посуд. Потым яны БУДУЦЬ такія, як іх бацькі. Яны скапіруюць нашы густы, рэакцыі, звычкі... Дык навошта казаць ім «ты неахайная» замест «што ў цябе сёння атрымалася»? Бо калі нешта не атрымліваецца, адразу падае самаацэнка, разумееш, што жыццё — не такая ўжо прыемная рэч.

Мы забываем, што дзеці — жывуць. У нас яны, пакуль не ствараць уласныя сем'і, існуюць. Мы іх глядзім, кантралюем,ганяем. Таму ў нашых сем'ях зашкалівае адчуванне трывожнасці, адзіноты, нізкая самаацэнка. У той час як сям'я павінна быць месцам, дзе гарантаваны пакой, упэўненасць у тым, што тут за цябе пастаяць і прымуць цябе безумоўна, якім бы ты ні быў.

— Як тут утрымацца ад іншай крайнасці — уседазволенасці?

— А хто сказаў, што педагогіка (усе бацькі — педагогі) — лёгкая навука? Мы зараз кажам пра фарміраванне асобы і пра асноўныя «выбоіны» ў гэтай справе. Бо ў чалавека павінна быць стабільная самаацэнка, сітуатыўная трывожнасць, якая правакуецца сітуацыяй агрэсіі і небяспекі, а ў цэлым знаходзіцца ў норме...

— Дык што бацькі, на погляд псіхолага, павінны рабіць, каб так было?

— Як я ўжо сказала, ведаць асаблівасць узросту свайго дзіця. Калі бацькі бачаць, што яны не спраўляюцца са сваім тынэйджарам, значыць яны павінны ўзяць на сябе адказнасць і зразумець, што іх ведаў і ўвагі недастаткова. Трэба знайсці рэсурсы, прааналізаваць сітуацыю. Ніводны псіхолаг не бярэцца карэктаваць асобу ў 14 гадоў, бо гэта не-маг-чы-ма! Дзіця чуе нас да 12 гадоў, да палавога выспявання. Потым на першы план выходзіць самастойнасць як індывіда. Індывіду патрэбны канфлікты для падрыхтоўкі да дарослага жыцця. У 12 гадоў адбываецца «другое нараджанне пупавіны». Нездарма пасля 12 гадоў дзіцяці нічога не патлумачыш, яно нібы глухое, яно не цябе слухае, яно само сябе слухае. І калі ты дагэтуль не паспеў сфарміраваць упэўненасць у сям'і, у тым, што ты яго любіш, што калі яго пакрыўдзяць, то ты заўсёды прыйдзеш на дапамогу, то пасля 12 гадоў даверу не чакай.

Яшчэ адна асаблівасць падлеткавага ўзросту: бацькі пераўтвараюцца ў баксёрскую грушу для дзіцяці. Першы эмацыянальны негатыўны вопыт падлетак спазнае праз узаемадзеянне з бацькамі. Канфлікты патрэбны ў жыцці? Патрэбны. Вось 14-гадовае дзіця і правакуе іх само. Таму я кажу бацькам на кансультацыі: цярпенне і яшчэ раз цярпенне.

І, нарэшце, перабудова арганізма. У дзяўчынак гэта адбываецца звычайна раней. Таму з'яўляецца акцэнт на знешнасць. Калі ў сям'і расце дзяўчынка, то вельмі важна, каб тата быў цудоўным мужчынам, сябрам, які скажа ёй, што ў яе прыгожыя вочы, што яна лепей за ўсіх.

Палавыя прыярытэты пачынаюць актыўна развівацца з 6 гадоў. Дзяўчынка ў сем — гэта паўнацэнная ўжо жанчына, з усімі яе комплексамі, вартасцямі і недахопамі. Яна пачынае актыўна прыхарошвацца. Таму забараняць у 14 гадоў фарбавацца — гэта самы горшы шлях да сэрца роднага дзіцяці.

— Як жа павінны адрэагаваць бацькі, калі іх дачка-сяміклясніца нафарбуецца нібы шымпанзэ і пойдзе ў школу?

— Яны павінны яе падтрымаць. А ў школе сказаць: не смейце асуджаць маё дзіця. Падтрымка можа быць рознай. Можна сказаць: «Мне не падабаецца твой макіяж, але гэта твой выбар». Ну значыць у яе сёння такі эмацыянальны стан, калі хочацца фарбаваць чырвоным вусны. У жанчыны эмацыянальны ўсплёск заўсёды выражаецца ў знешнасці. Нельга асуджаць чалавека за тое, што ён нафарбаваўся, калі ён вядзе сацыяльна актыўнае жыццё, паспяхова вучыцца і адэкватна сябе паводзіць. Я параіла б бацькам ісці ад адваротнага. Замест таго, каб забараняць, лепш дазвольце і навучыце рабіць гэта прыгожа. Я сваёй 9-гадовай дачцэ дазваляю карыстацца касметыкай, каб у яе быў вопыт. На апошняе свята сама прапанавала ёй падфарбаваць руковым павекі.

— Ёсць яшчэ адна праблема: падлеткі гадзінамі сядзяць перад камп'ютарам альбо тэлевізарам...

— Апатыя таксама ўласцівая гэтаму ўзросту. Яны думаюць пра сябе, у іх вельмі шмат сіл ідзе на гэта. Цяжка параіць нешта групе людзей, але адно вядома дакладна — дзецям патрэбна наша падтрымка. І поўная адсутнасць асуджэння. Цяпло. Вось што добрага можна зрабіць для дзіцяці ў 14 гадоў.

Ніхто дзіцяці, якое бадзяецца па вуліцы, прапускае заняткі ў школе і курыць, не дапамог асуджэннем. Калі мы сустракаем яго вокрыкам: «Як ты можаш!», то яно перастае прыходзіць дадому. Яно яшчэ не ведае, што яно такое. Адкуль яно павінна даведацца? Хто яму скажа: «Ты малайчына, у цябе ўсё атрымаецца і жыццё пойдзе далей?». У бацькоў што, не бывае эмацыянальных зрываў? Але мы прызвычаіліся. А для іх гэта ўсё толькі пачынаецца, гэта нараджаецца новае жыццё, асоба, якую мы стваралі. Ніякай карэкцыі ў 14 гадоў не можа быць. Толькі падтрымка і цярпло.

І яшчэ адна вельмі важная парада для бацькоў. Для таго, каб вырасціць шчаслівага, здаровага чалавека, які ў стане будзе пра сябе паклапаціцца, навучыцеся клапаціцца пра сябе. Каб потым здолець своечасова перарэзаць пупавіну, здолець жыць асобна ад дзіцяці. Сачыце за сваім здароўем, будзьце шчаслівыя, радуйцеся жыццю, атрымлівайце задавальненне ад кожнага пражытага дня! Эмацыянальна здаровыя бацькі ніколі не выгадуюць негатыўна настроенае, слабаразвітае дзіця.

Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.

Медыцына

АПЕРАЦЫЯ... НА САСУДАХ

Ішэмія, інфаркт міякарда, рак печані, нырачныя кісты, анеўрызмы галаўнога мозга... Гэта далёка не поўны пералік захворванняў, якія не абавязкова павінны падвесці хворага «пад нож» хірурга. На дапамогу зараз здольны прыйсці іншыя метады лячэння — высокія тэхналогіі ў галіне медыцыны, а дакладней, інтэрвенцыйная радыялогія, або рэнтгенэндаваскулярная (унутрысасудзістая) хірургія, якая імкліва развіваецца ў свеце і паступова ўкараняецца ў Беларусі.

Быў час, калі прадстаўнікі традыцыйнай хірургіі скептычна ставіліся да такога роду аперацый. Меркавалася, што ў рэшце рэшт пацыенту ўсё роўна не пазбегнуць агульнай анастэзіі і класічнага хірургічнага ўмяшання. Аднак інтэрвенцыйная радыялогія добра зарэкамендавала сябе як у дыягностыцы, так і ў лячэнні, з-за чаго атрымлівае ўсё большае распаўсюджанне ў развітых краінах. Што ж патрэбна для таго, каб гэта назіралася і ў нас? Чаму эндаваскулярныя працэдуры даступныя пакуль не ўсім, хто мае ў іх патрэбу? І нарэшце, як атрымліваецца, што вялікай колькасці пацыентаў ужо не дапамагчы такім чынам? Пашукаем адказы на гэтыя пытанні разам са спецыялістамі, якія прадстаўляюць тыя накірункі медыцыны, дзе інтэрвенцыйная радыялогія паспела прыжыцца, а менавіта ў анкалогіі і кардыялогіі.

ПЕРАКРЫЦЬ ПУХЛІНЕ «КІСЛАРОД»

Уладзімір АКІНФЕЕЎ, рэнтгенэндаваскулярны хірург аддзялення прамянёвай дыягностыкі Навукова-даследчага інстытута анкалогіі і медыцынскай радыялогіі імя М.М. Аляксандрава:

— Ангіяграфія — галіна рэнтгеналогіі, або прамянёвай дыягностыкі, якая даследуе сасуды пад рэнтген-кантролем. Гэта стала магчымым дзякуючы спецыяльнаму кантрастнаму рэчыву, якое ўводзіцца ў сасуд. Гадоў 30 таму працэдура перастала насіць выключна дыягнастычны характар. У анкалогіі, напрыклад, зайшла гаворка пра эндаваскулярнае, унутрысасудзістае лячэнне пухлін. Вы разумееце, што ракавыя захворванні — усё яшчэ невылечныя. Аднак анкалагічных хворых не пакідаюць без дапамогі. Праводзіцца хіміятэрапія, прымяняецца аператыўнае ўмяшанне. У дадзеным жа выпадку ў артэрыі, якія забяспечваюць пухліну кроўю, уводзіцца хіміятэрапеўтычны прэпарат або рэчыва, якое яе «перакрывае». Тым самым мы парушаем «харчаванне» пухліны, і яна вымушана загінуць ці спыніць свой рост. Інтэрвенцыйная радыялогія — так пачалі называць падобныя лячэбныя працэдуры.

— Наколькі актыўна развіваецца гэта галіна ў свеце і ў нас?

— Літаральна кожныя пяць гадоў лячэбныя працэсы ў галіне інтэрвенцыйнай радыялогіі перажываюць кардынальныя змены. Мы актыўна карысталіся і карыстаемся вопытам замежных калег. У апошнія некалькі гадоў развіццё інтэрвенцыйнай радыялогіі ў Беларусі заслужыла павышанай увагі, хоць першыя працэдуры былі зроблены ў Беларусі яшчэ напрыканцы 80-х, а ў свеце, дакладней, у ЗША наогул ў 60-я гады.

— З пухлінамі якіх органаў можа змагацца эндаваскулярная хірургія?

— Па-першае, для гэтага віду інвазійнага ўмяшання існуюць свае паказанні. Важна выявіць пухліну як мага раней. Важна, дзе яна размешчана і г.д. Практыка паказвае, што на момант звароту хворых, скажам, на рак печані, па ўрачэбную дапамогу хірургічнае лячэнне паказана толькі кожнаму пятаму, а ўсім астатнім застаюцца іншыя метады — «хімія» або эндаваскулярнае ўмяшанне. Па-другое, эфектыўнасць такіх працэдур яшчэ вывучаецца, хоць ужо зараз можна рабіць сціплыя высновы. Яны паказалі сваю досыць невысокую эфектыўнасць у выпадках, напрыклад, раку лёгкага, малочнай залозы, страўніка, больш аптымістычныя вынікі — у выпадку фібраміёмы маткі. Актыўна выконваюцца на печані, у тым ліку па той прычыне, што нярэдка рак страўніка ці кішэчніка дае метастазы менавіта ў гэты орган. Дарэчы, у свеце рак печані выходзіць на пятае месца ў структуры анкалагічных захворванняў, што звязваюць найперш з паляпшэннем дыягностыкі. Разам з тым мяркуецца, што да 2020 года рак печані можа абагнаць у структуры смяротнасці рак лёгкага. Даказана, што рак печані найчасцей развіваецца ў хворых на цыроз або ў тых, хто перанёс гепатыт В ці С.

— Ці можна параўнаць эфектыўнасць прымянення розных метадаў лячэння на прыкладзе таго ж раку печані?

— Усе метады скіраваны на павелічэнне працягласці жыцця, паколькі, як было заўважана вышэй, рак застаецца невылечным. І нават калі падчас хірургічнага ўмяшання ўдаецца выдаліць пухліну, няма гарантыі, што не з' явіцца новая. Тым не менш можна гаварыць, што ўвядзенне хіміяпрэпаратаў непасрэдна ў тую ж пячоначную артэрыю значна павялічвае шанцы на спыненне росту пухліны. Гэтаму спрыяе назапашванне ў ёй значнай колькасці хімічнага рэчыва. Вядомы выпадкі, калі на працягу некалькіх гадоў пухліна пасля такога роду ўмяшання не расла. Акрамя хіміяэмбалізацыі пячоначнай артэрыі — вышэйпамянёнай працэдуры, існуе яшчэ радыячастотная аблацыя, калі пухліна ў прамым сэнсе выпальваецца пад уздзеяннем высокай тэмпературы з дапамогай іголкі-электрода. Гэта працэдура таксама не вынішчае цалкам пухліну, а толькі спыняе яе рост. Складанасць заключаецца ў тым, што «ўсляпую» даволі складана трапіць у цэнтр пухліны і пралічыць радыус тэмпературнага ўздзеяння. Акрамя таго, ёсць рызыка, што з таго боку, які не падвергся ўздзеянню, можа пачацца рост пухліны. У цэлым жа аблацыі на пячонцы больш эфектыўныя, чым, скажам, на лёгкім. Хоць гэта пытанне пакуль вывучаецца ў свеце: аблацыі яшчэ не ўваходзяць у стандарты лячэння пухлін.

— Наколькі добра хворыя пераносяць эндаваскулярныя працэдуры?

— Яны, безумоўна, менш траўматычныя, можна выпісвацца і на другі дзень. Хоць мы перастрахоўваемся з-за пагрозы развіцця ўскладненняў, наяўнасць і ступень якіх абумоўлены станам печані. Самі хворыя перажываюць сімптомы накшталт моцнага атручэння. Тыя, што перанеслі хіміятэрапію, адзначаюць меншую таксічнасць нашых працэдур.

— Як і хто вызначае метад лячэння анкалагічнага захворвання?

— Перш-наперш, анкалагічны дыягназ пацвярджаецца метадам прамянёвай дыягностыкі і марфалагічна. Такі хворы накіроўваецца ў мясцовы — гарадскі, міжраённы, абласны анкадыспансэр, дзе яму могуць аказаць кваліфікаваную дапамогу. У складаных выпадках пацыент трапляе ў наш інстытут. Ёсць і такія, хто звяртаецца да нас напрамую. Тактыку лячэння выпрацоўваюць звычайна некалькі спецыялістаў, і як правіла, хворыя нам давяраюць — не адмаўляюцца ад прапанаванага метаду.

— Вам вядомы вынікі замежных даследаванняў адносна найбольш удалых метадаў працягу жыцця анкалагічным хворым?

— Характэрным паказчыкам у анкалогіі лічыцца 5-гадовая выжывальнасць. Дык вось, паводле колішніх замежных даных, пры выкарыстанні хірургічнага метаду лячэння гэтага парога дасягаюць каля 57 працэнтаў хворых на рак печані. Усе астатнія метады забяспечваюць больш сціплы вынік. Аднак у апошні час на Захадзе некаторыя спецыялісты загаварылі пра аблацыю як пра альтэрнатыву хірургіі. Шырокай медыцынскай грамадскасцю такі пункт гледжання пакуль толькі абмяркоўваецца. Тым не менш, паводле некаторых даных за 2005 год, 5-гадовая выжывальнасць сярод хворых на рак печані, якія перанеслі хірургічнае ўмяшанне, назіраецца ў 50 працэнтаў, сярод тых, хто перанёс аблацыю — у 33—50 працэнтаў.

ІШЭМІЮ — АБАВЯЗКОВА ЛЯЧЫЦЬ!

Юрый ПЯТРОЎ, загадчык рэнтгенааперацыйнага аддзялення эндаваскулярнай хірургіі Рэспубліканскага навукова-практычнага цэнтра «Кардыялогія»:

— На Захадзе 70 працэнтаў аперацый у каранарнай паталогіі — рэнтгенэндаваскулярныя. Абумоўлена гэта не толькі інтэнсіўным развіццём і актыўным укараненнем высокіх тэхналогій у медыцыне, але і раннімі звяротамі насельніцтва па ўрачэбную дапамогу. Мы пакуль толькі намагаемся рухацца ў гэтым накірунку. Сапраўды, кожны наш абласны цэнтр ужо атрымаў належнае абсталяванне, але не да канца яшчэ вырашана пытанне забеспячэння інструментарыем. А гэта, дарэчы, тая галіна медыцыны, у якой твае магчымасці як хірурга цалкам залежаць ад таго, на якім абсталяванні і з якім інструментарыем ты працуеш. Акрамя гэтага, у нашай краіне назіраецца дэфіцыт прафесійных кадраў, паколькі гаворка ідзе пра вельмі маладую спецыяльнасць.

— Аортакаранарнае шунціраванне — класічная аперацыя, пра якую, здаецца, усё ўжо вядома, а што ўяўляе сабой стэнціраванне — верагодна, значна менш затратная і менш траўматычная аперацыя?

— На бягучы момант шунціраванне і стэнціраванне, якое мы пачалі рабіць з 1996 года, каштуюць прыкладна адналькава. Сама ж методыка выканання апошняй працэдуры, — сапраўды, не траўматычная. Праз пракол на назе, руцэ, шыі ўводзяцца спецыяльныя прыстасаванні, па якіх у зону паражэння сасуда і трапляе стэнт. Ён здольны пашырыць сасуд і аднавіць кроваток. Пацыенту не робяць агульны наркоз — толькі мясцовае абязбольванне. Абавязкова ўводзіцца прэпарат, які дазваляе прадухіліць тромбаўтварэнне. Адпаведныя лекі прапісваюцца для ўжывання пасля выпіскі.

— І іх давядзецца прымаць усё жыццё?

— У любога чалавека можа наступіць момант, калі ён павінен пастаянна прымаць нейкі прэпарат. Напрыклад, аспірын пры ішэмічнай хваробе сэрца. Нічога страшнага тут няма. Страшна, калі пасля стэнціравання пацыент кажа: а піць і курыць я змагу? Такім пацыентам неабходна проста забыць на гэтыя «звычкі»! Шклянка віна — вось тая доза, якая спрыяльна ўздзейнічае на стан эндатэлію, і тое для тых, у каго няма гастрыту. Сапраўды, любы алкаголь пашырае сасуды, але ў вялікай колькасці на наступны дзень наступіць адваротная рэакцыя.

— Калі мэтазгодна рэкамендаваць пацыенту стэнціраванне?

— Часцей за ўсё інтэрвенцыйная радыялогія прымяняецца ў каранарнай хірургіі ў выпадках атэрасклератычнага паражэння сасудаў, калі халестэрынавая бляшка закрывае ў сасудзе прасвет. Аднойчы гэта прыводзіць да інфаркту міякарда. Але такія наступствы можна папярэдзіць з дапамогай стэнтаў. Стан сасудаў, колькасць, памер бляшак дазваляе ацаніць дыягнастычная каранараграфія, калі праз спецыяльны катэтар у сасуд уводзіцца кантрастны прэпарат.

— Што ж павінна «прымусіць» чалавека зрабіць каранараграфію?

— Тая ж ішэмічная хвароба сэрца, якая праяўляецца сціскаючым болем за грудзінай, задышкай — у стане спакою, падчас нагрузак ці ў начны час. Болі гэтыя здымаюцца нітрагліцэрынам. Бо ўвогуле вядома каля 40 захворванняў, якія праяўляюцца менавіта такім болем, таму лепей за ўсё не ставіць сабе самому дыягназ і не займацца самалячэннем. Калі ўрач западозрыць ішэмію, вам будуць прызначаны дыягнастычныя тэсты — электракардыяграма, нагрузачныя тэсты, напрыклад, велаэргаметрыя. Робіцца радыяізатопнае сканірованне, калі ў вену ўводзіцца спецыяльны прэпарат, і па тым, як ён размяшчаецца па сасудах, можна меркаваць аб іх паражэнні. У стацыянары выконваюць дыягнастычную каранараграфію. Ёсць электратапаграфія, якая паказвае, у якой менавіта зоне мае быць ішэмія, холтар-манітарыраванне дапамагае ўбачыць, як ішэмія праяўляецца ў стане нагрузкі.

На Захадзе дыягнастычныя працэдуры, можна сказаць, вельмі шырока распаўсюджаны, а ў нас — наадварот: многія трываюць да інфаркту і нават інфаркт пераносяць на нагах. Калі ішэмію не лячыць лекавымі прэпаратамі, не рабіць стэнціравання і г.д., мы атрымаем інфаркт за інфарктам, у выніку чаго з'явіцца сардэчная недастатковасць. У лепшым выпадку спатрэбіцца сур'ёзнае хірургічнае ўмяшанне.

— Пасля інфаркту таксама робіцца стэнціраванне?

— Пасля інфаркту варта абавязкова рабіць каранаграфію, якая дапаможа зразумець, што пацыенту патрэбна далей — прыём прэпаратаў, стэнціраванне або перасадка сэрца, якая ў нас пакуль не робіцца. Наогул паказанняў у рэнтгенэндаваскулярнай хірургіі больш, чым проціпаказанняў: той жа перанесены інфаркт, ішэмія, нестабільная стэнакардыя... Іншае пытанне, ці ёсць у нас магчымасць зрабіць стэнціраванне ўсім, каму гэта неабходна. У развітых краінах на 1 мільён насельніцтва ў год робіцца каля 5 тысяч каранараграфій, значыць, у Беларусі павінна выконвацца каля 50 тысяч, а мы робім пакуль каля 3 тысяч. Разам з тым неабходна сказаць пра адкрыццё рэнтгенваскулярных хірургічных цэнтраў у Віцебску, Магілёве і Брэсце. Нагадаю, што актыўна працуюць такія ж цэнтры ў Гродне і Гомелі. Значыць, у бліжэйшы час мы можам чакаць паляпшэння сітуацыі і вышэйпамянёных паказчыкаў. Тым больш, у магілёўскім, брэсцкім і віцебскім цэнтрах выконваюцца не толькі такія складаныя дыягнастычныя працэдуры, як каранараграфія, але выкананы і першыя аперацыі каранарнага стэнціравання. Так што прагрэс відавочны.

— Стэнціраванне здольнае прадухіліць першы ці наступныя інфаркты, ці яно толькі адцягвае час?

— Калі пацыент выконвае ўсе нашы рэкамендацыі, прымае належныя прэпараты, то верагоднасць паўторнага ўзнікнення бляшкі вельмі нізкая. Але яна ёсць, паколькі мы не пазбавілі чалавека ад захворвання — атэрасклерозу.

Ёсць пацыенты, якім стэнты ставіліся 4—5 разоў. Бляшкі растуць у іншых месцах сасудаў. Адбываецца гэта па розных прычынах — з-за курэння, стрэсу, высокага халестэрыну, няправільнага харчавання, наяўнасці некаторых інфекцый — хламідый, напрыклад, і г.д. Што «спрацоўвае» ў кожным асобным выпадку, сказаць цяжка. Відавочна адно: трэба своечасова звяртацца да ўрача, праходзіць абследаванне і прымаць лекавыя прэпараты.

Гутарыла Святлана БАРЫСЕНКА.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

КУПАЛЬНЫ СЕЗОН КРУГЛЫ ГОД

Нарказалежнасць

Жыццё кароткае... «на іголцы»

Толькі пяць чалавек з трох тысяч жыхароў, што залежаць ад наркатычных рэчываў, жывуць больш як пяцьдзесят гадоў. У сярэднім жа працягласць жыцця наркаспажыўца ад пачатку ўжывання атруты складае 10—12 гадоў.

Паводле слоў галоўнага нарколага Мінска Сяргея Малочкі, у большасці выпадкаў наркаманы паміраюць ад перадазіроўкі. Па гэтай прычыне летась абарваліся жыцці 25 мінчан.

Тым жа, хто хоча пазбавіцца ад нарказалежнасці, урачы-нарколагі прапаноўваюць прайсці курс рэабілітацыі, якая ў адпаведнасці з сусветнай практыкай цягнецца ад шасці месяцаў да двух гадоў. «Звычайна да нармальнага жыцця вяртаюцца 10—12 працэнтаў ад агульнай колькасці асобаў, якія знаходзяцца на ўліку», — удакладніў Сяргей Малочка. Пры гэтым бясплатнае лячэнне і рэабілітацыю атрымліваюць тыя, хто пастаўлены на ўлік Мінскага гарадскога наркалагічнага дыспансэра.

Калі хворы вырашыў лячыцца ананімна, то адзін дзень знаходжання ў стацыянары абыдзецца яму ад 35 да 40 тысяч рублёў — у залежнасці ад лекаў, якія выкарыстоўваюцца.

Вольга ГРЫГОР'ЕВА, «Мінск—Навіны».

БЕЛУЮ ЦАРКВУ З СІНІМІ КУПАЛАМІ ЁН ПАДАРЫЎ ЖОНЦЫ

Рыгор Максімавіч і Марыя Міхайлаўна Бондзічы з вёскі Ганчары Пінскага раёна пражылі разам 51 год. Траіх дзяцей выгадавалі. Жылі годна, з верай у Бога, працавалі, як усе вясковыя людзі, ад зары да зары. І гэткі ж, як большасць вяскоўцаў, не асабліва схільны да сантыментаў галава сям'і, усё ж любіў часам рабіць жонцы падарункі. Так, у 1970 годзе акурат пад 8 Сакавіка Рыгор Максімавіч напісаў партрэт на палатне. І сёння з той карціны Марыя выглядае маладой і прыгожай. Захацеў і напісаў, хоць да гэтага ніхто і сам ён сябе мастаком не лічыў. А ён такі — за што возьмецца, усё ў руках гарыць. Дом свой пабудаваў сваімі рукамі. І сталярку, і печы — усё чыста сам зрабіў. Хата, здавалася б, звычайная, сялянская, але маленькія арыгінальныя штрышкі паказваюць на гаспадара, на ўсе рукі майстра. З гарышча выглядае акуратны мініяцюрны балкончык. А вуллі ў агародзе падобныя на вясёлыя казачныя церамкі. І нават буры снег апошняга лютаўскага дня, што распаўзаўся ў шэрыя лужыны, не перашкодзіў заўважыць, як дагледжаны двор, які навокал парадак у 82-гадовага гаспадара, што шэсць гадоў таму застаўся без сваёй палавінкі — Марыі Міхайлаўны.

— Цяпер тут нецікава, — нібы апраўдваецца Рыгор Максімавіч, — каб вы летам прыехалі, наўкол кветкі цвітуць, як гаспадыня мая любіла...

А царква — гэта была яе ідэя. Гадоў дваццаць таму сядзелі яны на вуліцы, а яна раптам кажа: «Ты па ўсёй акрузе цэрквы будуеш. Зрабіў бы і мне цэркаўку вось тут, а то далёка хадзіць у Ахова». Спачатку ён успрыняў гэта як жарт. Нідзе не чуў, каб людзі ў сваім дварэ цэрквы ўзводзілі. А жонка на сваім настойвала: у агародзе цэгла ляжыць са старой разабранай пабудовы, вось табе і матэрыял. «Стаў пярэчыць, — успамінае Рыгор Максімавіч, — таго, што ёсць, не хопіць. А яна паказала на неба. Маўляў, Бог паможа ў добрай справе. Так яно і выйшла».

Вопыт у справе пабудовы храмаў Рыгор Бондзіч меў багаты. Па некалькі месяцаў працаваў на ўзвядзенні цэрквы ў Жыткавічах, у вёсцы Махро Іванаўскага раёна. Быў там і за цесляра, і за галоўнага кансультанта, тлумачыў, паказваў, як зрабіць усё па правілах, па канонах. Ну і рызыкнуў, так бы мовіць, паўтарыць у мініяцюры. Пакуль рабіў падмурак, сцены, на пытанні цікаўных суседзяў адказваў: «Лазню будую». Баяўся, кажа, прызнавацца. У часы дзяржаўнага атэізму ўсё магло здарыцца. А калі пачалі ўгадвацца абрысы будынка і суседзі здагадаліся, што будзе ў агародзе ў Бондзічаў, то сталі прапаноўваць сваю дапамогу. Але ён адмовіўся, рашыў, што гэты храм павінен пабудаваць сам, ад пачатку да канца.

І ў 1990 годзе белая цэркаўка з сінімі купаламі была завершаная. Па памерах яна і сапраўды крыху большая за звычайную лазню. Але ўсё там зроблена і ўладкавана як ў сапраўдным храме: і алтар, і абразы, і свечкі. Парадак і прыгажосць з самага пачатку наведзены клапатлівай рукой Марыі Міхайлаўны.

Праўда, першы варыянт сямейнай царквы быў крыху меншы. Потым, па просьбе суседзяў, Рыгор Максімавіч пабудову пашырыў. У яго царкву пачала хадзіць, лічы, уся вёска. А на святы, паводле слоў гаспадара, тут проста не павярнуцца. Прахалодай дыхаюць цагляныя сцены гэтай незвычайнай царквы. Вокны маленькія, але ўнутры няцёмна. А як толькі крышку выглянула сонца, у цэркаўцы ўсё літаральна зайграла нейкім светлым адчуваннем. «А як тут добра летам, у спёку, — падхапіла мае думкі старшыня сельсавета Марыя Белавежа, — выходзіць не хочацца».

Любіць сваю царкву і Рыгор Максімавіч. Цяпер гэта яшчэ і памяць пра яго Марыю. У свой час царкву асвяціў епіскап Пінскі і Лунінецкі Стэфаній у гонар Успення Божай Маці. Уладыка Стэфаній доўга жыў у доме Бондзічаў, як толькі прыехаў у Пінск на службу. Можна сказаць, кватараваў. Яму падабаўся побыт простых набожных людзей. А яго да гэтай пары гаспадар успамінае добрым словам.

Ведае Бондзіча і Мітрапаліт Мінскі і Слуцкі Філарэт. У свой час ручыў Рыгору Максімавічу ордэн Прападобнага Сергія Раданежскага. Ёсць і граматы ад Патрыярха Маскоўскага і ўсяе Русі Алексія II. Разам з праваслаўнымі ўзнагародамі заўважаю юбілейныя медалі ў гонар Перамогі.

— Ваявалі? — пытаюся.

— Не — адказвае, — быў малалетнім вязнем.

Падлеткам працаваў у няволі на чужой зямлі. Вярнуўшыся, некаторы час займаўся сельскай гаспадаркай, потым больш за дваццаць гадоў працаваў на чыгунцы. Пасля выхаду на пенсію жыццё прысвяціў служэнню Богу, якое ўвасобілася ў любімай справе. У цэрквах навакольных вёсак назаўсёды застанецца часцінка яго працы. І вось гэтая — свая — пабудаваная на радасць жонцы і на карысць суседзям, аднавяскоўцам. На святы або напярэдадні сюды, па традыцыі, прыязджае айцец Сергій з вёскі Стаўкі правесці службу, паспавядаць прыхаджан. Некаторыя з іх пры ўсім жаданні не могуць па стану здароўя дабрацца ў Ахова за 10 кіламетраў і нават у Кашавічы, дзе апошнім часам пад культавую пабудову пераабсталявалі звычайны чыгуначны вагон. А сёлета чамусьці святар не прыехаў перад вялікім постам, і гэта вельмі непакоіць Рыгора Максімавіча, а таксама некаторых яго аднавяскоўцаў.

Ганчары — цікавая вёска. Тут здаўна жылі працавітыя людзі. Старшыня сельскага Савета кажа, што яны вельмі дружныя. Калі адзін паставіў прыгожую агароджу, то і ўся вуліца стараецца не адстаць. Калі ў Бондзіча двор акуратны, дагледжаны, іншым быццам бы і нямёмка не падтрымліваць парадак. А двор у яго сапраўды незвычайны. Першы раз пачула пра такое, каб у вясковым дварэ пад вокнамі грыбы раслі. Не дзіва, калі тое здараецца ў вёсках Белавежскай пушчы. Але тут, дзе няма ніякага лесу, за паўтара кіламетра ад горада! «Гэтай восенню больш за сто белых грыбоў сабраў вось тут», — паказвае гаспадар на лапік зямлі ну можа ў паўсотні квадратных метраў. Растуць уздоўж плоту тры вялікія бярэзіны, елка, сюды выходзіць яго разны балкончык. І ўсё тут дыхае нейкім ціхім спакоем. Я разумею ўнучку Рыгора Максімавіча, якая захацела вянчацца не ў гарадскім велічным храме, а ў маленькай дзядулевай цэркаўцы. Фотаздымак вянчання маладой прыгожай пары стаіць зараз на дзедавым стале.

Святлана ЯСКЕВІЧ.
Фота аўтара.

Пінскі раён.

Дзённік Вікі Ц.

«Твой дзённік трэба перайменаваць у «злабадзённік», — напаўжартам, напаўсур'ёзна параілі некаторыя калегі-канкурэнты, хто не паленаваўся прачытаць першую калонку. Я хацела было запярэчыць, што, маўляў, уся такая добрая, белая (недзе глыбока ў душы) і пушыстая. Але тут якраз здарыўся чарговы прыступ барацьбы з нежаданнем працаваць, памножаны на авітаміноз і складаныя асабістыя адносіны — і злоснасць сапраўды рэзка абвастрылася. Астапа, што называецца, панесла...

МАЎЧЫ, ЖАНЧЫНА!

07.03.2007

«Ну, ты ж дзяўчынка!» — з дакорам паўтарала мне мама кожны раз, калі я, па яе разуменню, выкідвала чарговы фортэль, за які нармальнай дзяўчынцы павінна было быць сорамна. Мне сорамна не было, але з тым фактам, што я дзяўчынка, даводзілася пагаджацца.

«Ты дзяўчынка! Дзяўчынак не бяром!» — катэгарычна перапынялі аднакласнікі ўсе мае спробы ўлезці ў «хлапечыя» гульні. Я крыўдавала і лезла біцца. Прычым, калі нават добра атрымлівала, дарослым не скардзілася, за што пазней атрымала мянушку «Зоя Касмадзям'янская». Так што права лічыцца «сваім хлопцам» літаральна выбіла.

«Ат, ты дзяўчына, табе не зразумець!» — раздражнёна адмахваліся сябры мужчынскага полу, абмяркоўваючы галоўную трагедыю дарослага жыцця — неабходнасць штодня галіцца. Наша дзявочая кампанія абуралася і ўступала ў доўгія міжплавыя спрэчкі, але адназначнага адказу, што горш — армія альбо цяжарнасць — так і не знаходзілася.

А вось з першым месцам працы мне пашанцавала. Проста нас, паненак, там было занадта многа, каб праводзіць нейкую дыскрымінацыю і высвятляць, ці не замужам я выпадкова, а калі замужам, то ці не збіраюся хутка змыцца ў дэкрэтны водпуск. І ўсё адно гэта «ну, ты ж дзяўчына» — у сэнсе не справішся, не зразумееш, не разбярэшся — перыядычна лунала ў паветры і будзіла ўва мне махровую феміністку.

«Дзевачко, не хвалюйся, ты ж Вічка, а не істэрычка», — адстуквае мне па Інтэрнэт-пейджару модны «падонкаўскай мовай» сябар у адказ на ўсе перажыванні. Гэты бесклапотны хлопец усё схільны тлумачыць маёй павышанай экспрэсіўнасцю і жаночай уніклівасцю. Але гэта, бадай, адзін з нямногіх наіўных шавіністаў, на якіх я не крыўдую. Чаго яшчэ чакаць ад чалавека, для якога на 25-м годзе жыцця я зрабіла адкрыццё — паказала, што талеркі ў рукавіне неабходна мыць з двух бакоў?..

«Ты — дзяўчына». Гэта часта гучыць як прысуд. Дзяўчына — значыць клуша-капуша, хворая на ўсю галаву шопінгам, фанатка шмотак і касметыкі, дрэнны вадзіцель і патэнцыяльная пагроза ўсяму офісу. З іншага боку, дзяўчына — значыць, абавязана добра выглядаць (о, як мне падабаецца слухаць гэтыя сентэнцыі ад Апалонаў з піўнымі жывоцікамі!), умець гатаваць 132 стравы з бульбы і тушонкі, падтрымліваць чысціню і парадак нават у мядзведзевай бярлозе, мыць, прасаваць, вязаць, шыць і вышываць крыжыкам. Так, і яшчэ — ні ў кога на шыі не сядзець (чытай: працаваць і зарабляць грошы, а хатнія справы выконваць увесь вольны ад асноўнай работы час). І нарэшце — ну, ты жанчына або дзе? — трэба ўсё разумець, ні на што не скардзіцца і заўжды саступаць, як істота больш цярплівая і ласкавая. Яны — мужчыны, ім можна, а «ты, жанчына, маўчы — твой дзень 8 сакавіка!».

Так, я — дзяўчына. Але чамусьці гэты аргумент не дзейнічае, калі трэба перасунуць мэблю або збегаць на рынак за 10 кілаграмамі бульбы. Для выгляду паныўшы, усё адно іду і раблю, што трэба — бо пакуль тае моцнай мужчынскай рукі дачакаешся... Я ўмею мяняць ушчыльняльнікі ў кране і лямпачкі, і мне не сорамна ведаць, што такое дрыль з перфаратарам і ў чым розніца паміж пласкагубцамі і пасаціжамі (зрэшты, падазраю, што не абавязана ўсё гэта ведаць). Для мяне ўвогуле не існуе падзелу на «мужчынскія» і «жаночыя» абавязкі — як, між іншым, для многіх прадстаўніц майго пакалення. Ёсць толькі жаночы (эмацыянальны) і мужчынскі (пафігістычны) падыход да любой справы. І, ведаеце, гэтае 8 Сакавіка — ды гары яна гарам, такая нагода, калі ў гэты дзень ад нас, запіхаўшы ў рукі ў лепшым выпадку тры дзяжурныя мімозы, зноў будуць патрабаваць ідэальнасці і святочнай вячэры! Прычым свята, як і ў выпадку з Папялушкай, рызыкуе скончыцца яшчэ да раніцы — адгадайце з трох разоў, каму давядзецца прыбіраць стол...

Ой, нешта я зусім у песімізм скацілася. А гэта няправільна. Бо 8-ае сакавіка ўсё ж будзе святам. Прынамсі, для мяне. Не памятаю ўжо, каму з прадстаўнікоў моцнай паловы чалавецтва трэба дзякаваць за праведзеныя падлікі, але гэта дата — мой другі дзень нараджэння. Сёлета будзе 27,5 года роўна. Дарэчы, за свой узрост мне таксама не сорамна.

У «СЛУЦКУ» ЗАЎСЁДЫ ЎСЁ ПА-ЛЮДСКУ

У розныя часы ў знакамітым горадзе над Случчу былі кожны раз свае бясспрэчныя лідары ў клапатлівай сферы гандлю: то мясцовы рынак, заўсёды гаманлівы, прыветлівы і — сапраўды багаты. То гандлёвыя рады каля архітэктурнай адметнасці — «Косага маста», на іх месцы зараз — сучасны рэстаран і шырокая цэнтральная плошча, фарміраванне якой цалкам завершана падчас падрыхтоўкі да рэспубліканскага свята «Дажынкі-2005». Але за апошняе дзесяцігоддзе ў лік несумненных лідараў вырваўся ўнівермаг, які носіць назву роднага горада.

Па сутнасці, гэта не проста ўнівермаг, а цэлая сетка магазінаў, аб'яднаных рамкамі агульнага калектыву. Буйное гандлёвае прадпрыемства ўключае ў сябе і непасрэдна гандлёвыя залы на двух паверхах, якія рэалізуюць прамысловыя, гаспадарчыя і культтавары, і непрывычны для ранейшай структуры любога ўнівермага прадуктовы магазін, і кафэ «Беларускае бістро» з (паслухайце толькі) мясным цэхам і цэхам па вырабу хлебабулачных вырабаў, і кактэйль-бар. Пакупніка прыцягвае і тое, што на тэрыторыі ўнівермага размешчаны пункты па абмену валюты і друкаванню каляровых фотаздымкаў, невялікая майстэрня па рамонту гадзіннікаў і шэраг іншых зручных для людзей бытавых службаў. Скажам, можна аформіць банкаўскі крэдыт і купіць жывыя кветкі. А ў горадзе працуюць філіялы ўнівермага — прамтаварны магазін «Усё для дома», магазіны, якія гандлююць прадуктамі харчавання, і нават магазін камісійнага гандлю.

— У рознічным тавараабароце прадпрыемстваў камунальнай формы ўласнасці горада ўнівермаг, які сёлета адзначыць сваё пятнаццацігоддзе, займае другое месца (27 працэнтаў ад агульнага аб'ёму), — расказвае кіраўнік калектыву, дэпутат Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь Наталля Віктараўна БЛАХІНА. — На працягу многіх гадоў прадпрыемства працуе стабільна, выконвае прагнозныя паказчыкі тэмпу росту рознічнага тавараабароту ў супастаўных цэнах і мае прыбытак.

Летась універмагам атрыманы рознічны тавараабарот у суме 21 358 млн рублёў. Тэмп росту рознічнага тавараабароту ў дзеючых цэнах склаў 125 працэнтаў, у супастаўных — 120 працэнтаў, пры прагнозным паказчыку 110 працэнтаў. Значна перавышаны прагнозны паказчык тэмпаў росту і ў першым месяцы новага года.

Пракаментуем словы дырэктара. На наш погляд, адзін з галоўных сакрэтаў такой эфектыўнасці — па-сучаснаму арганізаваны гандаль якаснымі таварамі. Універмаг адказвае за высокую якасць вырабаў, якія рэалізуе праз сваю сетку, усе яны — сертыфікаваныя. Патрэбна зазначыць, што калектыў аддае прыярытэт гандлю айчыннымі таварамі, у агульным аб'ёме тавараабароту іх удзельная вага ўжо не першы год складае 90 працэнтаў. Не дзіўна, што добрыя, часта нават сяброўскія адносіны звязваюць яго з беларускімі таваравытворцамі. Такімі, як ААТ «Гарызонт», ЗАТ «Атлант», ААТ «Брэстгазаапарат», фабрыка «Славянка» з Бабруйска, ААТ «Беларускія шпалеры» і іншымі знакамітымі фірмамі. Спецыяльная камерцыйная служба ўнівермага пастаянна праводзіць работу па абнаўленню асартыменту і пошуку новых груп тавараў. За мінулы год было заключана 735 дагавораў з пастаўшчыкамі, з іх — 120 па харчовых тварах. Гэта вынік вельмі напружанай работы.

Асаблівая ўвага — укараненню прагрэсіўных формаў продажу тавараў, павышэнню культуры абслугоўвання пакупнікаў, аблегчыў пакупніку доступ да тавару, павысіў інфарматыўнасць і прывабнасць вітрын. Мы падлічылі, што пасля перапланіроўкі гандлёвай залы і замены абсталявання продаж некаторых відаў тавараў павялічыўся ад паўтара да трох разоў. Да слова сказаць, замене абсталявання — дакладней, папаўненню асноўных вытворчых фондаў новым абсталяваннем, набыццю новага вытворчага інвентару ўдзяляем пастаянную ўвагу. Зараз праводзіцца вялікая работа па ўкараненню сістэмных касавых падсумоўваючых апаратаў, спецыяльных камп'ютарных сістэм і тэрмінальнага абслугоўвання.

Што гэта дае? Напрыклад, работа са спецыяльнымі камп'ютарнымі сістэмамі ў лакальнай сеткі ўнівермага намнога паляпшае і паскарае працэс атрымання і апрацоўкі інфармацыі аб рэалізацыі і рэштках тавараў. Наяўнасць неабходнай інфармацыі і аптымальная работа з таварнымі запасамі дазваляе, у прыватнасці, скарачаць тэрмін абарачальнасці тавараў.

Цяпер, калі чытач можа ацаніць сістэмнасць і мэтанакіраванасць усёй работы, што праводзіцца ва ўнівермагу «Слуцк» у інтарэсах пакупніка, скажам, што асноўнай рухаючай пружынай тут лічаць свайго дырэктара. Наталля Віктараўна ўзначальвае ўнівермаг з першага дня, усе 15 гадоў. Дзякуючы яе няўрымслівасці, ён ператварыўся ў такое вось буйное прадпрыемства з разгалінаванай гандлёвай сеткай. Менавіта яе настойлівасць, пачуццё новага, іншыя высокія якасці чалавека і кіраўніка не даюць калектыву супакоіцца на дасягнутым, садзейнічаюць яго згуртаванасці ў дасягненні пастаўленых мэтаў.

У мінулай сваёй публікацыі са «Слуцка» ў 2004 годзе наша газета называла лічбу працуючых тут супрацоўнікаў: каля 300 чалавек. Зараз — 358 работнікаў, прычым 315 з іх жанчыны. Лічбы гавораць пра тое, што дзейнасць калектыву пашыраецца, а яго аснову складаюць тыя, хто па сваёй прыродзе лепш прыстасаваны да работы ў такой спецыфічнай галіне, як гандаль,сутнасцю якога з'яўляецца работа з людзьмі і дзеля людзей. Рыхтуючыся сустрэць Міжнародны дзень 8 Сакавіка, жаночы ў большасці сваёй калектыў робіць зямлячкам такі прыемны падарунак, як магчымасць познаёміцца з мадэлямі адзення веснавога асартыменту. Летась было праведзена пяць такіх тэматычных паказаў і 90 (!) пашыраных выстава-продажаў.

Яшчэ адзін прынцып, якога прытрымліваюцца тут — мінімальныя гандлёвыя надбаўкі на тавар. Таму цэны заўсёды прымальныя, што прываблівае і жыхароў навакольных раёнаў, а нярэдка і жыхароў беларускай сталіцы.

Кар. «Звязды».
Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

— Калектыў аднаго з найбольш буйных гандлёвых прадпрыемстваў сталічнай вобласці — КУП «Універмаг «Слуцк», — гаворыць у заключэнне Наталля БЛАХІНА, — віншуе жанчын Беларусі з наступаючым святам 8 Сакавіка і жадае ім здароўя, шчасця, поспеху, аптымізму і — прыгажосці. Запрашаем наведаць наша гандлёвае прадпрыемства, мы дапаможам вам падабраць неабходныя пакупкі.

Маці «зоркі»

Ніна ПАДОЛЬСКАЯ:

«ЗОРКАМІ» НАРАДЖАЮЦЦА!»

Магіляўчанка Ніна Падольская паказвае новыя часопісы з артыкуламі і фотасесіямі яе дачкі, цяпер вядомай спявачкі Наталлі Падольскай. На здымку ўсміхаюцца ў камеру Наташа, яе маці і Уладзімір Праснякоў. На нядаўнім святкаванні юбілею Алены Прасняковай у Маскве Ніна Антонаўна пазнаёмілася з бацькамі абранніка дачкі. «Магчымасці пазносіцца па-сямейнаму на вялікім свяце не было, — тлумачыць яна. — Але мне Прасняковы заўсёды падабаліся: абаяльныя людзі, з пачуццём гумару, добрыя музыканты. А Алена — дык проста «жыўчык»...»

А вось яшчэ большая сямейная каштоўнасць: папка з рознымі дробязямі з дзяцінства трох дачок Ніны Падольскай. Сярод іх любімыя фотаздымкі двайнятак Наташы і Юлі — абаяльныя дзяўчынкі, аказваецца, зусім розныя. Там запіска Наташы, якую яна адрасавала бацькам з піянерскага лагера з просьбай тэрмінова прыехаць, а «то ваша дачка памрэ». А крыжыкі двайнятак Ніна Антонаўна захоўвае з хрышчэння ў Смаленскім саборы: тады яна патлумачыла 3-гадовым Наташы і Юлі, што гэта прыгожы музей, а дзядзька, які незразумела гаворыць, — экскурсавод. Яна баялася, што дзяўчынкі раскажуць лішняе ў дзіцячым садку і ў бацькоў будуць непрыемнасці.

А вось фота Наташы (дарэчы, прычоска не адрозніваецца ад цяперашняй) з рамонкамі. З гэтымі кветкамі звязана іншая гісторыя. Аднойчы на лецішчы Наташа і яе сястра знянацку паставілі маці перад пытаннем: «Адкуль мы ўзялі-ся?» Збянтэжаная Ніна Антонаўна прыдумала гісторыю: з'ела рамонак — нарадзілася Наташачка, з'ела званочак — нарадзілася Юлечка. Дзеці засталіся задаволеныя, у адрозненне ад свекрыві, якая ніяк не магла зразумець, чаму дзяўчынкі сталі актыўна есці кветкі...

Сама Ніна Антонаўна ўсё жыццё працуе ў сферы культуры Магілёва. Ураджэнка Брэсцкай вобласці, яна прыехала па размеркаванню пасля заканчэння аддзялення літаратуры і музыкі Мінскага педагагічнага інстытута. Абласны цэнтр ёй моцна не спадабаўся, яна маліла адпусціць яе, але маладой жанчыне пагражалі адпраўкай у райцэнтр ва ўсходняй глыбінцы, і яна скарылася.

У Магілёве Ніна Антонаўна вядомая тым, што некаторы час узначальвала гарадское ўпраўленне культуры, а цяпер — выставачную залу ў цэнтры горада. Тут яна выйшла замуж за Юрыя Падольскага. Вядомы адвакат мінулым летам загінуў у аварыі. Хоць у апошнія гады іх шляхі разышліся, аднак Юрый Аляксеевіч заставаўся блізкім сябрам і бацькам для сваіх дачок. Пра яго Ніна Антонаўна і цяпер гаварыць не можа: цяжка, падступаюць слёзы...

А Магілёў яна ўрэшце палюбіла. Пасля адной вандроўкі ва ўзбекскі Андыжан, дзе экзотыка перамяшалася з непразлазным брудам, беларускі горад падаўся Ніне Антонаўне, як яна цяпер кажа, раем зямным. І з тых часоў яна канчаткова вырашыла, што Магілёў — гэта яе горад, тут нарадзіліся яе дзеці. І «зорка» Наташа Падольская таксама час ад часу вяртаецца сюды...

— Ніна Антонаўна, як выгадаваць «зорку»? Дайце некалькі каштоўных парад.

— Я лічу, што «зоркамі» нараджаюцца. У мяне тры дачкі, але тое, што Наташа будзе «зоркай», я разумела ледзь не з яе нараджэння. Мы за тым часам з мужам працавалі на Поўначы: двайняткі нарадзіліся ў Магілёве, а першыя гады іх жыцця прайшлі ў Нар'янмары. Дарэчы, чакалі хлопчыка, а атрымаліся дзве дзяўчынкі. Муж зусім не адразу зразумеў тэкст віншавальных тэлеграм, якія прыходзілі з Магілёва.

Дык вось, нянек у Нар'янмары не было. Для малых зрабілі з дрэва «вальерчык», дзе яны гулялі. Я ўключала ім тэлевізар альбо магнітафон і ішла на кухню займацца хатнімі справамі. Аднойчы я вярнулася ў пакой, а Наташа стаіць, трымаючыся за поручні, гойдаецца і спявае: «Па Дорну (так яна пачула Дон) гуляе казак малады...» Мы з мужам разам пасмяяліся: маўляў, спявачкай будзе дакладна.

— А потым атрымалася, што ваш сямейны жарт спраўдзіўся.

— Так. У дзяцінстве любая масажная шчотка ці ручка ад скакалкі пераўтвараліся ва ўмоўны мікрафон. Апраналіся мае канцэртныя строі, і закатваліся цэлыя прадстаўленні ў дварэ. Стрымаць артыстычныя памкненні мы не маглі. А таму аддалі двайнятак спяваць у студыю. І дасюль у рэпертуары Наташы ёсць беларуская песня «Рэчанька», аранжыроўку якой зрабіў кіраўнік студыі «Дубль В» Васіль Сянькоў.

А як гадаваць «зорку»? Урэшце, не трэба перашкаджаць самавыяўляцца і дамагаць, накіроўваць. І больш абсалютна ніякіх сакрэтаў. Наташа сама вельмі хацела спяваць! А я радавалася яе захапленню.

— Але па-сапраўднаму Наташа стала вядомая пасля «Фабрыкі зорак-5», ці не так?

— Гэта быў «чорны» час у маім жыцці. Штодня я назірала на экране за тым, як да яе прыдзірліва ставяцца настаўнікі. Нават Ала Пугачова папракнула, што Падольская надта інтэлігентная. Не разумею, як інтэлігентнасці можа быць занадта? Аднак Наташу моцна падтрымлівалі гледачы. І калі спачатку яна хацела пакінуць «Фабрыку», то потым прачнуўся азарт перамагчы. Гэты праект стаў для Наташы сур'ёзнай школай выжывання ў жорсткай барацьбе. І мне не было за яе соромна. Яна выканала бацькоўскі запавет: трымацца дастойна, што б ні здарылася.

— Цяпер ваша дачка — любіміца свецкай хронікі. Пра яе шмат пішуць і яшчэ больш фатаграфуюць.

— Мне падаецца, што тут падкупляе шчырасць Наташы. Яна — не фальшывая. Я ўвесь час прасіла яе быць натуральнай. Таму што фальшывасць адразу пазнаецца, асабліва не схаваць яе на экране. Яна заўсёды была нашым сямейным «сонейкам», добрай і вясёлай дзяўчынкай. Такой яна і засталася цяпер.

— А Наташу не сапсавала маскоўскае жыццё, тусоўкі і свецкае «выпендрыванне»?

— Абсалютна не. І яна ўсё такая ж уважлівая да сваіх сябровак, якія ніякага дачынення да тусовак не маюць. Я мяркую, яна мае імунітэт. Яна рана пайшла на сцэну — у 9 гадоў. І ў яе не знесла «дах», таму што яна ўсё жыццё на сцэне, і сцэна — гэта яе жыццё. А па-другое, для жанчыны усё роўна самае галоўнае — сям'я, дзеці. А кар'ера? Выдатна, калі ў цябе паспяхова складваецца кар'ера, але жыць дзеля яе — гэта няправільна. Мы з Наташай дамаўляліся, што яна будзе жыць нармальным, паўнавартасным жыццём, дзе важна не толькі кар'ера, але і «тылы».

— Дарэчы, накот «тылоў». Ці падабаецца вам Уладзімір Праснякоў?

— Я пазнаёмілася з ім у Маскве, а потым ён прыязджаў у Магілёў разам з Наташай на пахаванне Юрыя Аляксеевіча. Канешне, не магу сказаць, што я была на сёмым небе ад шчасця ад абранніка дачкі: у іх розніца ва ўзросце, Валодзя — чалавек знакаміты і мае вопыт сямейнага жыцця. Аднак пры знаёмстве з ім я была ўражана розніцай паміж чалавекам, якога мы бачым на экране тэлевізара і тым, які ёсць у рэальным жыцці. Ён — вельмі абаяльны, вельмі інтэлігентны, вельмі выхаваны. Я моцна не выношу пахабшчыну тусовак, хамства і маты. І хоць усё падаецца пад гламурным соусам, але агіднага смаку гэта не мяняе. Ён пяшчотна ставіцца да Наташы. У іх цяпер перыяд узаемнага захаплення і кахання, і за іх можна толькі парадавацца. Дай Божа ім шчасця.

— Як Наташа адчувае сябе ў Маскве?

— Як рыба ў вадзе. Гэта яе горад, яна адразу прызвычаілася. А я часта езджу ў Маскву. З Наташай мы бачымся раз на месяц дакладна. Праўда, жыць у гэтым мегаполісе я б не змагла. Ад маскоўскіх рытму і энергетыкі ў мяне кружыцца галава. Масква — горад для маладых.

Цяпер там жыве і яе сястра Юля. Яна самастойна знайшла сабе працу менеджара ў фірме і задаволеная. Наташа цяпер жыве з Прасняковым, а Юля здымае кватэру. Канешне, было адзінока, калі Юля з'ехала, але я разумею, што сёстрам проста неабходна жыць побач, у адным горадзе. Добра, што старэйшая дачка Таццяна жыве ў Магілёве, я цяпер шмат часу аддаю ўнучцы. 7-гадовую Наташу назвалі ў гонар сястры-«зоркі», у іх узаемная любоў. Наташа закідвае пляменніцу падарункамі: я нават і не ведала, што на свеце існуюць такія цацкі, якія дачка перадае для малой.

— У вас у сям'і адны дзяўчынкі...

— Я ведаю, як выхоўваць дзяўчынак. Іх проста трэба любіць і песціць. У нас з мужам на гэты конт узнікалі спрэчкі: ён быў прыхільнікам строгага выхавання, а я не прымаю любы гвалт над бездапаможнай істотай. Мне падаецца, што любоўю нікога нельга сапсаваць, асабліва дзяўчынак. З імі трэба сябраваць.

— А Наташа дасюль давярае вам свае сакрэты?

— Мы сябруем. Праўда, з цягам часу я зразумела, што дочкі імкнуцца абараніць мяне ад негатыўнай інфармацыі. І гэта для мяне вельмі дрэнна, таму што ў мяне моцна развіта інтуіцыя. Калі Наташа трапіла ў аварыю — пра гэту гісторыю шмат пісалі, то я пакутавала і мітусілася тут, як тыгрыца ў клетцы. Толькі калі праўду сказалі, супакоілася. Таму дамаўляемся з Наташай, што ад мяне нічога хаваць не будуць.

— У такім разе адкрыйце, ці сапраўды жанатыя Наташа і Уладзімір?

— Вяселле ў Лас-Вегасе зусім не было жартам. Шлюб мае законную сілу ў Амерыцы і за мяжой, а што датычыцца расійскіх законаў — ім вырашаць. Яны вянчаліся ў царкве ў Лас-Вегасе і лічаць сябе жанатымі. Гэта ўсё.

— Вам асабіста падабаецца, што Наташа спявае?

— Я не ад усяго ў захапленні. Нешта падабаецца больш, нешта — менш. Я ёй усё выказваю, і яна ставіцца да майго меркавання з павагай. Ведаеце, спачатку, у дзяцінстве, меркаванне маці было аўтарытэтным і не абмяркоўвалася. Потым у пераходным узросце дочкі сталі тузаць плячыма і казаць, што я састарэла. І мне даводзілася настойваць на сваім праве выказаць сваё меркаванне, а потым, маўляў, рабіце, як хочаце. Цяпер прыйшоў час, калі мне не трэба ўжо нагадваць пра гэта сваё права. Маё меркаванне могуць сустрэць усмешкай альбо каментарыямі, але часцей усё ж такі робяць так, як я параіла.

— А якія парады Наташы вы даяце ў сэнсе знешняга выгляду?

— Калі дочкі былі старэйшымі школьніцамі, я іх аддала ў школу прыгажосці, дзе іх вучылі правільна хадзіць, рабіць макіяж і прычоску. Мая маладосць прыйшлася на той час, калі людзі на вуліцы былі шэра-чорна-карычневымі, але я заўсёды любіла прыгожа апранацца. Са свайго вопыту публічнага ў Магілёве чалавека я казала дачцэ, што трэба заўсёды выглядаць так, каб на цябе было ўсім прыемна глядзець. У Наташы ёсць пачуццё стылю, і цяпер яна мне набывае адзенне ў маскоўскіх крамах. Што ж, я павінна адпавядаць статусу маці «зоркі».

Што датычыцца знешнасці, то ў нас добрыя гены. Мой бацька быў польскай крыві, заўсёды падцягнуты і маладжавы, і мы на яго падобныя. І з лішняй вагой у маіх дачок няма праблем. Хоць, канешне, я згодная з рухам, які ўзнік на Захадзе, супраць надта хударлявых мадэляў.

— Так. Магу падзяліцца вопытам. Дыета, якая гарантуе за 4 дні пазбаўленне ад 4-х кілаграмаў: раніцай — чай альбо кава без цукру, 10 гадзін — варанае яйка, 12 гадзін — плаўлены сырок, 14 гадзін — 100 грамаў варанага поснага мяса, курынага альбо ялавічыны, 16 — вялікі яблык, 18 — яйка, 20 — кубак таматнага соку. Пасля гэтых дзён не есці пасля 18 гадзін і паменшыць разавую дозу ежы да аб'ёму аднаго кубка. Праз два тыдні дыету можна паўтарыць.

— Ніна Антонаўна, да вас цяпер часта звяртаюцца з пытаннямі пра Наташу. Вам прыемная ўвага прэсы альбо не, скажыце шчыра?

— Калі шчыра, то не заўсёды прыемная. Я працуюнік таго, што пра творчасць гаварыць менш, чым пра асабістае жыццё. Я Наташы заўсёды кажу, што ў чалавека павінна быць сваё поле, куды, акрамя самых блізкіх, ніхто не павінен ступаць. У асабістае жыццё не трэба нікога пускаць. Але цяпер гэта немагчыма. Уладзімір Праснякоў — асоба вядомая, і іх пары проста немагчыма ізаляваць сваё жыццё ад прэсы.

— Што б вы пажадалі маці, якія хочуць выгадаваць сваіх дзяцей «зоркамі»?

— Самае галоўнае, каб дзеці выраслі здаровыя, разумныя, каб знайшлі сваё месца ў жыцці, былі шчаслівыя ў сям'і і ў працы. А ўжо стануць яны «зоркамі» альбо не — гэта зусім не галоўнае ў жыцці. Знешняя прыгожая карцінка «зорнага» жыцця не азначае ўнутранага шчасця. Любіце сваіх дзяцей!

Гутарыла Ілона ІВАНОВА.

Ёсць нагода

ПАДАРУНАК ДЛЯ МАМЫ... І НЕ ТОЛЬКІ

У часы даволі аддаленыя, яшчэ савецкія, па ўсеагульнай негалоснай традыцыі 23 лютага лічылася «татавым» святам, а 8 сакавіка — «маміным». Пачынаючы з дзіцячых садкоў і да старэйшых класаў школ, дзеці майстравалі сваімі рукамі ўсякія прыемныя (хоць збольшага і бескарысныя) дробязі, а потым ладзілі ці то ранішнік, ці то кірмаш самаробнай прадукцыі... Карацей, свята для любімых бацькоў.

Святочнай абстаноўкі і на сёння ніхто не адмяняў, але фармат віншаванняў істотна памяняўся. У асноўным цяпер гэта канцэрты — або самадзейныя-актавазальныя, або прафесійныя-тэлевізійныя. Напрыклад, спявачка Жанэт сабрала паненак айчыннай эстрады на «Дзявочнік», а тэлеканал АНТ, наадварот, склікаў пад свае сцягі выканаўцаў і калектывы мужчын дзеля канцэрта «Вясна прыходзіць з АНТ»... Карыстаючыся момантам, мы адцягнулі ўвагу артыстаў ад выступлення і папрасілі прыгадаць тыя самыя «мама-татавыя» традыцыі.

«Вы памятаеце, што ў дзяцінстве дарылі маме на 8 Сакавіка?» — з такім пытаннем «Звязда» звярнулася да беларускіх артыстаў.

Анатоль ЯРМОЛЕНКА, кіраўнік ансамбля «Сябры»:

— У нашым дзяцінстве былі падарункі, калі нешта напішаш на самаробнай паштоўцы. Любая дробязь была прыемнай — намаляваная, выразаная, галоўнае, мілая і шчырая. Зараз дзеці, мне здаецца, больш меркантыльныя — яны адразу ведаюць, што мэтазгодна або немэтазгодна дарыць. Сёння ў чалавечых пачуццях не хапае шчырасці... Найлепшы падарунак для кожнай жанчыны, я лічу — гэта адносіны. Адносіны мужчыны як абаронцы, апоры, надзейнага пляча. Здавалася б, банальная рэч — але гэта праўда. Жанчына без мужчыны нешчаслівая. На жаль, сёння збольшага не мужчыны, а мужчынкі, і нашых жанчын мне вельмі шкада... Яны вартыя самага лепшага.

Віншаваў... усіх жанчын Беларусі разам і асобна — жонку. «Жонкі публічных людзей, асабліва артыстаў — гэта гераіні, якіх рэдка бачыць публіка, але яны насамрэч самыя важныя для нас людзі, якія выконваюць каласальную працу», — лічыць Анатоль Ярмоленка. Дарэчы, унук і цёзка Анатоля Ярмоленкі таксама ўдзельнічаў у канцэрце — і віншаваў маму, спявачку Алесю.

Прысвяціў жанчынам... Песню «Каханая» — у суправаджэнні прафесійнага калектыву балетных танцораў.

Георгій КАЛДУН, спявак і вядучы радыё:

— Я памятаю толькі адзін падарунак, пасля якога адбіла ахвоту чымсьці падобным займацца — намаляваў дзядулю паветраны бой з самалётамі ў розных ракурсах, здаецца, якраз да 23 лютага. А потым знайшоў гэты малюнак далёка на шафе — і зразумеў, што лепей, відаць, віншаваць на словах, чым дарыць непатрэбныя дробязі. Маме «перапалі» нейкія самаробныя паштоўкі — у малодшых класах мы штосьці выразалі, клеілі (я ўжо слаба памятаю, што), усім класам пісалі пад лінейку «маёй дарагой мамачцы»... Карацей, было сумна. Самы каштоўны падарунак з тых, што я ўвогуле дарыў маме — напэўна, мабільны тэлефон. Увогуле, нават калі да нейкіх святаў яна просіць нічога не дарыць, мяне гэта толькі падштурхоўвае прыдумаць што-небудзь «гэткае».

Віншаваў... У першую чаргу якраз маму, Таццяну Барысаўну, якая выхавала адразу двух беларускіх артыстаў — Георгія і Дзмітрыя Калдуноў.

Прысвяціў жанчынам... Абноўленую версію песні Юрыя Антонава «Для меня нет тебя прекрасней».

Вячаслаў ШАРАПАЎ, кіраўнік Дзяржаўнага ансамбля «Песняры»:

— Кветкі або духі — гэта само сабой зразумела і банальна. Я часцей за ўсё браў пластылін у рукі і ляпіў сімпатычную маленечкую Бабу Ягу — у выглядзе своеасаблівага талісмана, абярэга. Дарыў гэтую статуэтку даволі часта — і, спадзяюся, яшчэ падару нямала. Ніхто з жанчын як быццам не крыўдаваў.

Віншаваў... урача вышэйшай катэгорыі, кандыдата медыцынскіх навук, дацэнта кафедры акушэрства і гінекалогіі Беларускай медыцынскай акадэміі паслядыпломнай адукацыі Любоў Віктараўну Вавілаву, якая дапамагла многім жанчынам стаць мамамі. У прыватнасці, менавіта яна «правяла ў свет» сына Вячаслава Шарапава.

Прысвяціў жанчынам... Песню з рэпертуару «Песняроў» — «За полчаса до весны».

Дзмітрый КАЧАРОЎСКІ:

— У дзіцячым садку, у агульных рысах памятаю, рабілі нейкія рукзачкі, унутр укладвалі паштоўкі. Шчыра кажучы, не памятаю нават, што дакладна я рабіў у дзяцінстве — так, выразаў нешта. Я навучыўся добра маляваць левай рукой, умею маляваць цэлыя пано, якія якраз і дарыў. Зараз ужо не абмяжоўваюся дробязямі, віншаваннямі на словах і нават кветкамі — калі дарыць, то нешта грунтоўнае, матэрыяльнае. Думаю, жонцы дам магчымасць выбраць, што яна хоча — неабавязкова нават на 8 Сакавіка, але вельмі хачу зрабіць ёй прыемнае. Як жэст павагі з нагоды свята, абавязкова падару нейкі сувенір. Мілую дробязь.

Віншаваў... Жонку, якая разам з сынам прыйшла на канцэрт і сядзела ў зале.

Прысвяціў жанчынам... Песню «Очарована, околдована».

Сяргей КАВАЛЁЎ, спявак, практыкуючы ўрач ультрагукавой дыягностыкі:

— Я выпальваў па дрэву. Зрабіў для мамы дошку для рэзкі ці то хлеба, ці то гародніны — пераніс на загатоўку малюнак, расфарбаваў, а потым пакрыў лакам. Зараз ужо разумею, што, відаць, лак па тэхналогіі быў не патрэбны — усё ж рэч не выключна дэкаратыўная, яна датыкаецца да прадуктаў. А тады ганарыўся — вось, сам зрабіў. У малодшым узросце таксама часта штосьці маляваў, а чым больш сталеў, тым больш практычныя падарункі рабіў.

Віншаваў... У першую чаргу, усіх сваіх пацыентак — а доўгачаканае «ў вас будзе дзіця» ад Сяргея пачулі многія жанчыны, у тым ліку і «зорныя мамачкі» Ларыса Грыбалёва, Тамара Лісіцкая, Ксенія Мінчанка, Аксана Вечар. «У гэты дзень, часта бывае, мяне проста нясе — кожную хочацца прыабняць, павіншаваць асабіста, зрабіць хоць штосьці прыемнае», — усміхаецца Сяргей. Акрамя таго, з 1 сакавіка для выканаўцы пачынаецца чарада дзён нараджэння родных людзей — вялізная святочная паласа.

Прысвяціў жанчынам... Не толькі песні. Збольшага Сяргей Кавалёў — адзіны супрацоўнік-мужчына ў жаночым калектыве. Калі малады доктар пасля заканчэння інстытута ў Магілёве трапіў у такое суквецце ўпершыню... ён аддаў на кветкі каляжанкам усю зарплату. У жанчын быў шок ад подзвігу інтэрна.

Распытвала Вікторыя ЦЕЛЯШУК.

Мая знаёмая, якая адна выхоўвае чатырохгадовага сына, абмовілася неяк, што параілі ёй незвычайную паслугу — «Тата на гадзіну». Як яна даведалася, у сталіцы створана агенцтва, якое, сярод іншага, займаецца і тым, што прапануе такія незвычайныя, на першы погляд, паслугі, як «Тата на гадзіну», «Бацька па выкліку», «Асоба для суправаджэння». Трэба толькі звязацца з прадстаўнікамі фірмы, і, напрыклад, да дырэктара школы замест выкліканай маці прыйдзе «заказаны» на некалькі гадзін «бацька». А самай незвычайнай падалася наступная паслуга — «праверка сілы пачуццяў каханага»...

Фота Марыі ЖЫЛІНСКАЙ.

ТАТА НА... ГАДЗІНУ

Я пажадаў сустрэцца з кіраўнікамі незвычайнай арганізацыі — «пад маскай», як чалавек, якому неабходна адна з паслуг. Але, патэлефанаваўшы, трапіў да старых знаёмых. І нават не вельмі здзівіўся — наша газета ўжо пісала пра агенцтва Bastet, якое прапаноўвае паслугу па стварэнню алібі. Дык вось, займаецца арганізацыя не толькі гэтым, яго кола дзейнасці значна шырэйшае. Дык што такое — бацька напракат? Ці так запатрабавана гэтая паслуга? Гэта высвятляў журналіст «Звязды» разам з супрацоўнікамі — кіраўнікамі агенцтва **Кацярынай і Паўлам.**

— Ммм... Незвычайная паслуга, ды і дзеля чаго гэта трэба?

Павел:

— Розныя бываюць сітуацыі ў жыцці. Часам маці выхоўвае свайго сына адна, без мужа. І вось выклікаюць яе ў школу да настаўніка з-за таго, што дзіця нешта нарабіла. Як павесці сябе? Можна пайсці самой, сапсаваць сабе настрой, а можна звярнуцца да нас — і ў школу пойдзе мужчына, які прадставіцца татам. Дарэчы, адбор кандыдатаў у нас строгі, абы-якога чалавека мы не прапануем.

— Ну, са школай разабраліся, і сапраўды, у асобных выпадках паслуга можа спатрэбіцца. А ў астатніх? Дзеля чаго яшчэ «купляць» тату?

Кацярына:

— Зноў жа, так могуць скласціся абставіны ў жыцці жанчыны, якая засталася з дзіцем на руках адна. Яно можа спытаць аднойчы, дзе яго тата. Альбо калі падрасце, маленькага чалавека пачнуць крыўдзіць аднагодкі. Адзіную дзейсную параду, што сказаць дзіцяці і што трэба рабіць у такіх момантах, ніхто пакуль не даў. Мы ж прапануем рэальную справу — напрыклад, падтрымаем «легенду» аб тым, што бацька знаходзіцца ў далёкай і працяглай камандзіроўцы, і раптам, на некалькі гадзін, прыехаў дадому. Наш супрацоўнік завітае дамоў да жанчыны, прадставіцца татам, пагуляе з дзіцем, а потым скажа, што яму трэба зноў ехаць. Можна «выклікаць» тату на выхадныя — ён сходзіць з «сынам» альбо «дачкой» у заапарк, кіно, забаўляльны цэнтр. Усе дробязі і пажаданні заказчыка ўлічваем...

— А вось, я даведаўся, што ёсць у вашага агенцтва паслуга, якая мае назву Accompanying person — суправаджэнне кліента. Напрыклад, запрашэнне на VIP-вечарыну прадугледжвае прысутнасць гасцей толькі ў пары — мужчына разам з жанчынай. А ў запрошанага паловы няма. І вы падбіраеце яму на час мерапрыемства прыгожую, разумную дзяўчыну...

— Ну і што? Такія сітуацыі сустракаюцца, і не толькі ў азначаным выпадку...

— Ну, асабіста я ведаю, але звычайна пад «службай суправаджэння» мужчыны разумеюць зусім іншае. Таксама «прыгажуня напракат» на некалькі гадзін, але з зусім не такімі мэтамі...

— Не! Ха-ха-ха! Мы ніколі не прапаноўваем інтымных паслуг, і не будзем гэтага рабіць! І потым, наша дзейнасць ні ў якім выпадку не парушае заканадаўства. Камусьці проста трэба знайсці суразмоўцу на некаторы час, хтосьці, асабліва прыезджыя, не ведаюць горада, і мы прапануем паслугу магазіннага гіда. Здараецца, што мужчыне на рыбалку аднаму не хочацца ехаць. На самай справе, людзей, якім проста патрэбен разумны кампаньён для нейкай справы, не так ужо і мала. І не толькі для вечарыны, карпаратыўнага банкету ці нечага падобнага.

— Хто карыстаецца большай папулярнасцю? Я думаю, што жанчыны!

— І жанчыны, і мужчыны — розных узростаў, заняткаў. І адзінокія, і сямейныя. Дарэчы, да нашых работнікаў мы прад'яўляем вельмі строгія патрабаванні, таму надзвычайных сітуацый ніколі не адбывалася.

— Місію, значыць, вы выконваеце... Ганаровую...

— Чаму ж не? Канешне, не місію выконваем, але працуем. Дапамагаем людзям, і гэта добра.

— Тады растлумачце, калі ласка, што гэта за паслуга — праверка пачуццяў каханага чалавека? Навошта?

Павел:

— Гэтая паслуга падыходзіць для прадстаўніц слабага полу, калі дзяўчына захоча праверыць, ці можа яна быць упэўнена ў маладым чалавеку. У адзін з дзён яна прадстаўляе яму некалькі фотаздымкаў ультрагукавога даследавання, па якім можна ўбачыць пэўны тэрмін цяжарнасці...

— Не вельмі сумленна з яе боку...

Кацярына:

— А што, калі дзяўчына збіраецца правесці з хлопцам усё жыццё, а ён паводзіць сябе не вельмі надзейна. Як праверыць, ці прыстойны чалавек знаходзіцца каля яе? Напрыклад, я на ўласным вопыце адчула, як гэта складана застацца адной «у становішчы». Вось гэта было і сапраўды, мякка кажучы, «несумленна» з боку мужчыны. Мы дапамагаем стварыць патрэбныя абставіны для таго, каб дапамагчы кліенту знайсці выйсце з, здаецца, бязвыхаднай сітуацыі, а не правакуем на «нядобрыя» ўчынкі.

Увогуле, межаў для чалавечай фантазіі не існуе. Камусьці можа падацца, што метады суразмоўцаў крыху экстрэмальныя, але, на маю думку, работа агенцтва прыносіць карысць тым, хто да іх звернецца. Тым больш, што аналагічныя арганізацыі існуюць і паспяхова працуюць ва ўсім свеце. Напрыклад, могуць людзі з Basteta дапамагчы вам пазнаёміцца з пэўнай асобай. Няма праблем. Адзін з варыянтаў — чалавека, з якім заказчык пажадае сустрэцца, запросіць на здымкі фільма, і кліент агенцтва будзе выконваць галоўную ролю ў стужцы. Канешне, на самай справе фільм здымацца не будзе, усё гэта проста распрацаваны сцэнарый. Такім жа чынам можна арганізаваць рамантычны вечар, зрабіць сюрпрыз сябрам. Карацей кажучы, у жыцці, як у кіно, і наадварот. Таму фантазіруйце, спадарства, самастойна ажыццяўляйце свае мары — як бачыце, спаўняецца ўсё, што толькі можна пажадаць.

Дзмітрый АЛЬФЕР.

Чэмпіёны

ЛЕГКААТЛЕТЫ СВЯТКАВАЛІ ПОСПЕХІ, СПЯВАЮЧЫ Ў КУПЭ

Пэўна, нікога так не сустракалі ўчора раніцай (дакладней у 6.40) на мінскім чыгуначным вакзале, як нашых легкаатлетаў, якія вярталіся з чэмпіянату Еўропы ў залах. Перон другой платформы ля пятнаццатага вагона маскоўскага цягніка нагадваў кветнік. Здымалі тэлекамеры, працавалі дыктафоны, успыхвалі фотаапараты. Беларускія спартсмены заслужылі такую ўвагу і пашану да сябе: на першынстве ў Англіі яны заваявалі чатыры медалі (залаты, два сярэбраныя і бронзавы).

— У нас у «Дынама» традыцыя заўжды сустракаць сваіх спартсменаў з кветкамі, нават раніцай, — паведаміў Уладзімір Калецкі, галоўны трэнер фізкультурна-спартыўнага таварыства «Дынама» і з гонарам дадаў. — Хто ў камандзе дынамаўцы? Павел Лыжын (служыць у пагранічных войсках), Андрэй Краўчанка і сёстры Усовіч (служаць у камітэце дзяржбяспекі).

Першым з вагона паказаўся галоўны трэнер нацыянальнай каманды Анатоль Бадуеў. Зразумела, я не магла не пацікавіцца ў яго, чаму перад стартам першынства ён папрасіў не чакаць ад нашых спартсменаў высокіх месцаў у гэтым сезоне, маўляў, легкаатлеты пачынаюць рыхтавацца да летняй Алімпіяды ў Пекіне, таму пік іх формы павінен прыйсціся якраз на час Гульняў-2008. На чэмпіянат Еўропы-2007 у памяшканнях Бадуеў планаваў толькі адзін медаль: «Затое я веру і ведаю, што абавязкова будзе залатая ўзнагарода», — трэнер быў задаволены поспехамі сваіх падначаленых, сярод якіх асабліва адзначыў бронзавага прызёра, сяміборца Андрэя Краўчанку, які ўпершыню здабыў медаль на дарослым турніры. Сам жа Андрэй пакуль яшчэ не верыць, што трапіў у прызёры на кантынентальным першынстве: «Нездарма нас называюць рыцарамі лёгкай атлетыкі, бо два дні на стадыёне — гэта вельмі складана псіхалагічна і фізічна. Перад сваім выступленнем я перахваляваўся, бо сачыў за нашымі спартсменамі, «хварэў» за іх. Калі сам выйшаў на старт, цудоўна зрабіў першы від, а далей пайшло-паехала. Самым цяжкім было змагацца з самім сабой. На сапернікаў нават не глядзеў. Медаль мне не прагназавалі і, калі я стаў трэцім, трэнер адразу да мяне падышоў, павіншаваў і сказаў, што ўсё цудоўна. Зараз тры-чатыры дні адпачну і зноў трэба рыхтавацца, на гэты раз да летняга чэмпіянату свету ў Японіі».

І ўсё ж галоўнай гераіняй у саставе беларускай зборнай трэба назваць Ілону Усовіч. Дзяўчына бегла ў эстафеце на самым адказным апошнім цачвёртым этапе і фінішавала першай (эстафетную палачку ёй хутка перадавала сястра Святлана). Акрамя «золата» ў камандзе, Ілона заваявала і асабісты медаль — сярэбраны ў бегу на 400 метраў. «Я не першы раз на чэмпіянаце Еўропы, таму ведала, які час трэба паказаць, каб трапіць у прызёры, — прызналася спартсменка. — Па выніках, якія я паказвала на сваіх трэніроўках, бачыла, што я гатова і буду змагацца за месца на п'едэстале. Чаму мне даверылі бегчы апошняй у эстафеце? У нас гэта нават не абмяркоўваецца, трэнеры вырашаюць, хто будзе на якім этапе бегчы, улічваючы нашы магчымасці. Мне лягчэй даганяць, таму і зараз «прычапілася» да больш хуткай сапернiцы і вырвала «золата».

«Залатыя» сёстры Святлана і Ілона УСОВІЧ.

— Увесь вечар у купэ мы разам з Андрэем Міхневічам спявалі песні, — расказаў штурхальнік ядра Павел Лыжын, які ў Бірмінгеме стаў уладальнікам «серабра». — Люблю спяваць, ды і настрой быў цудоўны ад таго, што я стаў сярэбраным прызёрам. Гэта мой першы медаль на дарослым турніры.

Андрэй Міхневіч не толькі падпяваў Пашы, але і дапамог ў нейкай меры настроіцца на барацьбу, хоць яны і сапернікі ў сектары: «Канешне, у час спаборніцтваў канкурэнцыя паміж намі існуе, але па-за сектарам Андрэй дае мне парады, кажа, што павінна быць упэўненасць у сваіх сілах, — дзеліцца Павел Лыжын. — Ён для мяне і сябра, і настаўнік, бо Андрэй — вопытны спартсмен».

Ірына ПРЫМАК.

Як скажаш, дарагая!

Кожнай жанчыне хочацца, каб ёй хоць зрэдку казалі такія словы. А вось актрысам тэатра сучаснай драматургіі «Тэатральны Каўчэг» даводзіцца чуць іх даволі часта, асабліва тым, што занятыя ў аднайменным спектаклі.

Рэпертуар тэатра вельмі разнастайны: пікантная камедыя «Сублімацыя кахання», любоўны трылер «Танга ўтраіх», трагіфарс «Няма такой краіны — Галандыя...», камедыя-гратэск «Карусель», вадэвіль «»Ці лёгка падмануць жанчыну?» і іншыя. Але ёсць тое агульнае, што, безумоўна, аб'ядноўвае спектаклі: асаблівы стыль, гумар, дабрыня, музычнасць, а яшчэ тое, што ў цэнтры ўвагі кожнай пастаноўкі — жанчына.

Аб тэатры і пра жанчын і пагутарым сёння з рэжысёрам-пастаноўшчыкам «Тэатральнага Каўчэга», які ставіць свае спектаклі на сцэне Дома літаратара ў Мінску, Яўгенам ВАЛАБОЕВЫМ.

— Яўген Аляксеевіч, раскажыце пра сябе, пра з'яўленне «Тэатральнага Каўчэга»?

— Нарадзіўся і вырас я ў Новасібірску. Потым з бацькамі пераехаў ва Узбекістан. Вучыўся ў Новасібірскім тэатральным інстытуце на акцёрскім аддзяленні, але ўжо тады зразумеў, што буду рэжысёрам. Таму пасля заканчэння і рэжысёрскія курсы. Паехаў ва Узбекістан у горад Наваі, дзе прапанавалі стварыць рускі драматычны тэатр. Далей працаваў у Ташкенце. А ў 1997 годзе па запрашэнню прыехаў у Мінск, удзельнічаў у стварэнні тэатральнага праекта «Віртуозы сцэны». У 2000 годзе ўзнік мой аўтарскі праект — тэатр сучаснай драматургіі «Беларускія сезоны», з лютага 2006 года ён называецца «Тэатральны Каўчэг». Калектыў — прафесіяналы высокага класа, якія сумяшчаюць супрацоўніцтва з «Тэатральным Каўчэгам» з працай у дзяржаўных тэатрах Мінска. Сярод іх Аляксандр Бяспалы, Анатоль Цярпіцкі, Анжэла Караблёва, Ірына Нарбекава (Тэатр-студыя кінаакцёра), Раман Падаляка, Ірына Рымарава (Купалаўскі тэатр), Яўгенія Пятрова, Алена Балашова (тэатр Беларускай арміі) і іншыя.

— Як падбіраеце рэпертуар?

— Галоўныя тэмы маіх спектакляў — узаемаадносіны паміж жанчынамі і мужчынамі, каханне. Лічу, што каханне — першаснова ўсяго, яно шматграннае і вечнае. А жанчына — мая муза. Праз жанчыну іду да творчасці, жанчынай захапляюся, яе абагаўляю, паважаю, вывучаю, разгадваю, імкнуся да яе.

— І гэтая жанчына ваша жонка?

— Безумоўна, яна. А таксама жанчыны майго тэатра. Гэта можа быць і проста знаёмая, і таямнічая незнаёмка. Мы павінны паважаць, цаніць, захапляцца жанчынай увогуле, а не толькі сваёй сяброўкай, жонкай, маці, сястрой...

— Каб сучасны мужчына не глядзеў на жанчыну, толькі як на біялагічны матэрыял, трэба...

— ...мужчыне быць моцным духам і розумным, каб разумець жанчыну ў яе недарэчнасці і нелагічнасці, навучыцца прабачаць, не баяцца адказнасці за сябе, за жанчыну, за тое, што адбываецца навокал.

— Ваш ідэал жанчыны?

— Тая жанчына, якую кахаю, адчуваю, пра якую думаю, да якой прыходжу.

— А якія жанчыны ў вашых спектаклях?

— Розныя. Напрыклад, Паола («Сублімацыя кахання») — разумная, таленавітая, хітрая, даволі вульгарная, гатовая прыняць каханне, чакае яго; Караліна («Як скажаш, дарагая!») знаходзіцца ў стане страху, панікі, яна вымушана захавацца сябе, тамусцях яе прыгнятае, але яна таксама хітрая...

— А што, на ваш погляд, аб'ядноўвае ўсіх жанчын?

— У кожнай жанчыны ёсць тое, чаго няма ў іншай.

— Дык ці лёгка падмануць жанчыну?

— Жанчыну падмануць нельга. І я сцвярджаю і даказваю гэта ў сваім спектаклі. Гэта недарэчная задума — паспрабаваць яе падмануць. Жанчына ўсё ўспрымае пачуццямі, а не розумам, як мужчына. У спробах падмануць мужчына прымітыўны, а жанчына — непрадказальная. Да таго ж яна заўсёды мае сваю думку.

— Вашы пажаданні ўсім жанчынам.

— Жадаю не губляць адчування Жанчыны (дастойнай кахання, павагі) і не дазваляць мужчыне забываць, што вы — Жанчына.

Гутарыла Лана ТАРАСЕВІЧ.

Карысна ведаць

МАЛОЧНЫЯ ПРАДУКТЫ: ТОЛЬКІ АБЯСТЛУШЧАНЫЯ!

Малако і малочныя прадукты займаюць важнае месца ў харчаванні як дзіцячага, так і дарослага насельніцтва. Аднак чым больш дарослымі мы становімся, тым менш тлустымі яны павінны быць.

Асаблівую каштоўнасць уяўляюць бялкі малака, якія ўтрымліваюць усе неабходныя для жыццядзейнасці арганізма незаменныя амінакіслоты. Малако, малочныя прадукты, асабліва кісламалочныя, з'яўляюцца добрым лячэбным сродкам для людзей, якія пакутуюць ад страўнікава-кішачных захворванняў. У тэхналогіі вырабу кісламалочных прадуктаў выкарыстоўваюцца бактэрыяльныя закваскі. Малочнакіслыя бактэрыі ствараюць у страўнікава-кішачным тракце кіслае асяроддзе, што перашкаджае развіццю гніласных бактэрый, якія выклікаюць распад бялкоў ежы з утварэннем таксічных рэчываў.

Зараз шырокае распаўсюджанне атрымалі кісламалочныя прадукты, узбагачаныя прабіётыкамі — прадстаўнікамі абарончай флоры арганізма і вітамінамі А, С, Д, Е. Сёння вырабляецца досыць шырокі асартымент як традыцыйных прадуктаў (смятана, кефір, сыракваша, ражанка), так і кісламалочных прадуктаў новага пакалення, узбагачаных біфідабактэрыямі, лактулозай, з выкарыстаннем фруктовых напаўняльнікаў (ёгурты, біяёгурты, біякефір, біфілін). Высокае ўтрыманне ў кісламалочных прадуктах біфідабактэрый спрыяе нармалізацыі мікрафлоры арганізма чалавека і павышае імунітэт. Асабліва карысныя «жывыя» ёгурты і біяёгурты, якія вырабляюцца без тэрмічнай апрацоўкі. Спалучэнне малочнай сыравіны з фруктова-ягаднымі напаўняльнікамі значна ўзбагачае прадукты прыроднымі біялагічна актыўнымі рэчывамі: вітамінамі, арганічнымі кіслотамі і мінеральнымі солямі.

Найбольш карыснымі з'яўляюцца абястлушчанае малако і малочнакіслыя прадукты, якія не саступаюць па сваёй біялагічнай каштоўнасці неразведзенаму малаку. Пры гэтым энергетычная каштоўнасць абястлушчанага малака амаль у 2 разы меншая, чым неразведзенага. У абястлушчанае малако пераходзіць з неразведзенага звыш 70 працэнтаў сухіх рэчываў, а бялкі і малочны цукар — поўнасцю. Мінеральныя рэчывы амаль усе пераходзяць з неразведзенага малака ў абястлушчанае.

Рубрыку вядзе Мікола ДЗЯБЁЛА.
аўта аматар

Аўтаадказчык
ДАІ ДАВЕДКУ НЕ ПАТРАБУЕ

Ці праўда, што з 1 сакавіка ўсім вадзіцелям абавязкова трэба прад'яўляць супрацоўніку ДАІ падчас праверкі дакументаў медыцынскую даведку?

Сяргей Чахоўскі, *г. Жлобін.*

Начальнік аддзялення ўпраўлення Дзяржаўтаінспекцыі МУС Ганна Банадык абвергла гэтыя чуткі. Паводле яе слоў, у Правілы дарожнага руху ніякіх змяненняў наконт пераліку дакументаў, якія трэба прад'яўляць супрацоўніку ДАІ не ўносілася. Гэта значыць, што ўсім вадзіцелям заўсёды вазіць з сабой медыцынскую даведку няварта.

Па-ранейшаму, памянёны дакумент абавязаны пастанна мець пры сабе толькі тыя асобы, ў вадзіцельскім пасведчанні якіх зроблены запіс: «Без медыцынскай даведкі несапраўднае».

Ганна Банадык таксама паведаміла, што Дзяржаўтаінспекцыя працягвае пільны кантроль за выкананнем ПДР. У мінулыя выхадныя дні супрацоўнікамі Дзяржаўтаінспекцыі выяўлена 2910 парушэнняў памянёных Правілаў. У тым ліку за перавышэнне хуткасці былі пакараны 518 вадзіцеляў, 209 — затрыманы за кіраванне транспартнымі ў нецвярозым стане.

Апроч таго «даішнікі» аказалі дапамогу 676 п'яным пешаходам, якія знаходзіліся паблізу праезнай часткі дарогі. Фактычна многіх з гэтых людзей міліцыянеры выратавалі ад смерці ці калецтваў.

Аўтапрафілактыка
СПЫНІЦЦА САБЕ ТАННЕЙ

Працягваем знаёміць аўтааматараў з некаторымі палажэннямі новага Адміністрацыйнага кодэкса. Сёння размова пойдзе пра выпадкі, калі вадзіцель адмаўляецца спыняцца на патрабаванне супрацоўніка міліцыі. За аднаразовае падобнае парушэнне прадугледжаны штраф у памеры ад 2 да 10 базавых велічынь. А вось, калі вадзіцель не адрэагуе належным чынам на некалькі патрабаванняў міліцыянера спыніцца, то памер штрафу ўзрасце ад 6 да 20 «базавых». Таксама за гэтае парушэнне прадугледжана і пазбаўленне правоў на тэрмін да 1 года.

Аўтапрагноз
НЕЦЯРПЛІВЫЯ І ВЕЛЬМІ НЕБЯСПЕЧНЫЯ

На гэтым тыдні захаваецца складаная сітуацыя на дарогах, якая будзе абумоўлена найперш неспрыяльнымі ўмовамі надвор'я і тэхнічным станам магістраляў. Аднак і «чалавечы фактар», вядома ж, будзе мець вялікае значэнне. Месцамі павышанай бяспекі для ўсіх удзельнікаў дарожнага руху будуць гарадскія магістралі і іншыя участкі, на якіх узнікаюць вялікія плыні транспарту. Асаблівую небяспеку будуць уяўляць аматары хуткай язды і нецярплівыя пешаходы.

7 сакавіка гарантыяй бяспекі на дарогах павінна стаць дакладнае падпарадкаванне агульнаму рытму руху, які можа рэзка змяняцца. Узрасце верагоднасць аварый з удзелам нецвярозых вадзіцеляў, а таксама сутыкненняў з нерухомымі перашкодамі на слізкіх участках дарог.

8 сакавіка найбольшая небяспека будзе падсцерагаць на хуткасных магістралях за межамі населеных пунктаў. Пешаходам у цёмны час сутак варта праявіць пільнасць на участках дарог, дзе адсутнічае святло.

9 сакавіка ў першыя гадзіны сутак павінна быць выключана з'яўленне дзяцей на праезнай частцы. Вельмі небяспечным можа аказацца перамяшчэнне на двухколавых транспарных сродках. Дадатковым фактарам рызыкі можа стаць рэзкая змена надвор'я.

10 сакавіка аварыйныя сітуацыі могуць быць выкліканы дрэннай бачнасцю на дарогах і няўважлівасцю вадзіцеляў. Калі ў такіх абставінах кіроўцы яшчэ будуць перавышаць хуткасць, то аварыі могуць мець сумныя наступствы для ўсіх удзельнікаў дарожнага руху.

11 сакавіка верагоднасць здарэнняў на дарогах будзе абумоўлена шэрагам прычын. Гэта і нездавальняючы стан праезнай часткі, і дрэнныя ўмовы надвор'я, і непрадказальныя паводзіны асобных вадзіцеляў і пешаходаў. У другой палове дня магчымы бакавыя сутыкненні з выездам за межы праезнай часткі.

Аўтапрам
ВЯСЕННІ VARIANT

На Жэнеўскім аўтасалоне адбудзецца сусветная прэм'ера новага Volkswagen Golf Variant. Гэта ўжо трэцяе пакаленне самага прадаваемага ў Еўропе ўніверсала. Паводле звестак афіцыйнага дылера «Volkswagen» у Беларусі «Atlant-M Fahrzeughandel», новы Golf Variant з'явіцца ў нашай краіне напрыканцы сёлетняй вясны.

Аўтакур'ёз
ДЗЯЎЧЫНКА ПА ІМЕНІ SLK

Жыхар аднаго з гарадоў Румыніі назваў сваю дачку SLK — у гонар мадэлі аўтамабіля сямейства «Mercedes». Ніякім угаворам служачых адмысловай установы бацька не паддаўся, заявіўшы, што з'яўляецца фанатам нямецкіх машын, і калі б у яго нарадзіўся сын, то абавязкова назваў бы яго BMW.

Аўтажарт

Ад новага беларуса збегла жонка. Сядзіць небарака, гарэлку п'е з гора. Завітаў сябар і спрабуе супакоіць:

— Не сумуй, братан, другую знойдзеш?

— Як жа яе шукаць буду, жонка на маім аўтамабілі з'ехала.

Крынічка

«Цякла тут з лесу невялічка
Травой заросшая крынічка».
Якуб КОЛАС.

Рубрыку вядзе Валянціна ШПІЛЕЎСКАЯ, тэл. 285-88-81 **№ 6 (224)**

Попел як сродак аховы

Драўнінны попел мы выкарыстоўваем у першую чаргу як найбольш каштоўнае і даступнае калійна-фосфарнае ўдабрэнне, а таксама для вапнавання глебы. У састаў драўніннага попелу ўваходзіць у першую чаргу калій, фосфар, кальцый, магній, бор, жалеза і многа іншых элементаў, аж да 30. Найбольшая колькасць мінеральных рэчываў знаходзіцца ў попелу дроў бярозавых і сасновых, менш — у попелу, які атрымліваецца пры спальванні торфу.

Вясной пад кусты парэчак падсыпаюць попел і прыкрываюць кавалачкамі плёнкі. Такім чынам шкоднікам, якія зімавалі ў глебе, нялёгка будзе выбрацца на паверхню.

Попел, які атрымліваецца пры спальванні торфу, змяшчае мала пажыўных рэчываў. Некаторыя яго віды змяшчаюць многа жалеза, што можа быць не вельмі карысным для агароднінных культур, а вось для садовых дрэў, асабліва вішні, чарэшні, слівы такі попел будзе дарэчы, бо вокіслы жалеза павышаюць марозаўстойлівасць раслін.

Трэба сказаць, драўнінны попел выкарыстоўваюць не толькі як удабрэнне.

- Яго выкарыстоўваюць у першую чаргу для прыгатавання пажыўных растворaў пры перадпасяўной падрыхтоўцы насення (у 1 л вады разбаўляюць 1\3 чайную л попелу і 1\3 ч.л. любога комплекснага удабрэння.
- Калі пры пасадцы суніц у ямкі насыпаць крыху попелу, расліны хутчэй прыжывуцца і будуць менш хварэць.
- Для барацьбы з крыжацветнай блошкай рэкамендуецца лісце капусных культур пасыпаць попелам.
- Прымяняецца раствор драўніннага попелу супраць тлі: 300 г попелу прасейваюць, заліваюць гарачай вадой і кіпяцяць на працягу 20 хвілін, адвар адстаіцца, потым яго працэджваюць, даліваюць да 10 л і апырскваюць расліны.
- Пры паяўленні прымет пашкоджання цыбульных кветкавых культур цыбульнай мухай неабходна іх паліць растворам попелу.
- У барацьбе з каларадскім жуком выкарыстоўваюць раствор попелу: двухлітровы слоік попелу разбаўляюць у вядры вады, дадаюць гаспадарчае мыла. Кожны літр раствору разводзяць у вядры і апырскваюць бульбу да паяўлення лічынак на бульбоўніку.
- Попел выкарыстоўваецца пры кампаставанні раслінных рэшткаў.

Дачныя падказкі

- Вопыт падказвае, што з буйнога насення перцу, тамацяў і баклажанаў усходы паяўляюцца больш хутка і больш дружна.
- Насенне фасолі, гароху, бабоў лепш захоўваць у стручках да вясны і выбіраць яго непасрэдна перад пасевам.
- Радыску і рэпу сеюць толькі сухім насеннем. Іншыя караняплоды — як сухімі, так і намочанымі.

Карчаваць — не карчаваць

Карчоўка пнёў — справа даволі працаёмкая, таму перш чым прыступаць да гэтай работы, падумайце, можа лепш будзе, калі пень пакінуць і выкарыстаць ў якасці століка, падстаўкі і да т.п. Калі ж вы рашылі, што ён усё-такі непрыгодны у такой якасці і яго неабходна выкінуць, паспрабуйце спосабы, якія не патрабуюць празмерных фізічных намаганняў.

Напрыклад, можна засяліць пень грыбамі — вешанкай, апенькамі. Гадоў праз пяць-шэс

НАПОЙ ДЛЯ ПАВАРОТНЫХ МОМАНТАЎ ЖЫЦЦЯ

ААТ «МЗІВ» — айчынны лідар у вытворчасці ігрыстых напояў у Беларусі і прызнаны ў блізкім і далёкім замежжы майстар інавацый. Яго прадукцыя экспартуецца ў Германію, ЗША, В'етнам, Ізраіль, Ліван, Вялікабрытанію і іншыя краіны



ЯКОЕ СВЯТА БЕЗ ІГРЫСТАГА

Ігрыстае — напой на ўсе выпадкі жыцця і ў любой прыемнай сітуацыі. Асабліва ў рамантычнай. Ён стварае прыўзняты і ўрачысты настрой на вяселлях, у час святкавання дзён нараджэння, юбілеяў, розных дат і знакавых падзей. І, зразумела, гэта лепшы напой, каб адзначыць цудоўнае вясновае свята — 8 Сакавіка. Ігрыстае лепш за ўсё адпавядае цёплай інтымнай атмасферы.

Напой аднолькава прыемны як у абстаноўцы сціплага застолля, так і на шыкоўным банкеце. Ён цудоўны і для дваіх і ў вялікай кампаніі. Ігрыстае прыемна піць са старымі сябрамі, а яшчэ лепш — з жанчынамі. Лічыцца, што як ні адзін іншы напой ігрыстае спрыяе ўзаемапаразуменню з прыгожай палавінай чалавецтва. Невыпадкова жанчыны ўнеслі свой важкі ўклад у стварэнне і папулярызацыю гэтага чароўнага напою.

ЖАНОЧЫ СЛЕД

Існуе шмат легендаў аб паходжанні ігрыстага. Але напярэдадні 8 Сакавіка прыгадаем наступную. Кажуць, што пальма першынства вынаходніцтва ігрыстага належыць жанчыне. Некалі жонка аднаго вінаградара стала заўважаць, што муж перастаў звяртаць на яе ўвагу і пачаў усё часцей заглядвацца на маладых дзяўчат. Хрэстаматыйны выпадак крызісу ўзросту ў мужчын.

Жанчына, каб ніхто не бачыў яе слёз, у роспачы пайшла ў склеп, дзе з гора вырашыла атруціцца. З гэтай нагоды выпіла сапсаванага, як ёй здалося, віна. За атруту яна прыняла перабрадзіўшы вінаградны сок, але вынік атрымаўся зусім процілеглы. Жанчына літаральна памаладзела: яе постаць набыла ранейшую гібкасць і рухавасць, твар пружавеў, скура разгладзілася, зніклі маршчыны. Муж быў здзіўлены пераўтварэннямі сваёй палавіны і зноў пачаў кахаць яе з ранейшым імпэтам. Аднак неў-забаве скончыўся «сапсаваны» напой і жанчына ва ўсім прызналася мужу (вельмі разумны ўчынак. — **Заўв. Аўтара.**). Так, дзякуючы каханню, быў знойдзены спосаб вырабу ігрыстага.

Жанчынам гэты напой абавязаны сваёй вялікай папулярнасцю ў Еўропе. І ў першую чаргу так званай «шампанскай удаве» — слыннай мадам Кліко. У 1805 годзе 28-гадовая Клемянціна Кліко пасля смерці мужа Франсуа была вымушана ўзначаліць яго вінаробную кампанію. Яна так павяла справу, што ўвайшла ў гісторыю як адна з самых паспяховых бізнэс-лэдзі сваёй эпохі.

За мінулыя стагоддзі ігрысты напой стаў, бадай, самым папулярным святочным напоем. Нездарма заўзятыя знаўцы і самыя фанатычныя прыхільнікі ігрыстага параўноўваюць яго з музыкай. А. Пушкін у адным з вершаў нават правёў паралель з каханкай...

Вельмі шанавала ігрыстае знакамітая ў свой час фаварытка французскага караля мадам дэ Пампадур. Жонка Напалеона імператрыца Жазэфіна таксама была сярод прыхільніц гэтага напою. Злыя языкі казалі, што яна часам «забывала» разлічвацца з яго пастаўшчыкамі. Відаць, жанчыне пасля келіха пеністага было не да банальных грашовых разлікаў, даруем ёй гэта.

Праўда, некаторыя даследчыкі сцвярджаюць, што ўсё ж упершыню ігрысты напой у 1693 годзе вырабіў французскі манах-бенедыктыец Дом Перэньён з правінцыі Шампань. Але гэта, хутчэй, праявы мужчынскага шавінізму, лічаць прыхільнікі жаночай лініі.

ГУСАРЫ П'ЮЦЬ СТОЯЧЫ

Існуе некалькі версій аб тым, як ігрыстае пад назвай «шампанскае» трапіла да нас. Кажуць, што гэта заслуга Пятра Першага. Можа і так. Але шырокае прызнанне ігрыстае атрымала ў час Айчыннай вайны 1812 года і асабліва пасля славутага паходу рускіх войскаў на Парыж.

Тады царскія афіцэры грунтоўна прадэгуставалі гэты незнаёмы для большасці насельніцтва Расійскай Імперыі напой. І засталіся вельмі задаволеныя. У выніку плыні шампанскага пацяклі ў Расію. Тады яно яшчэ не лічылася дамскім напоем, яго ўжывалі пераважна гусары, любімым тостам якіх быў «за мілых дам!».

Гэту абставіну — піць шампанскае за прыгожых жанчын — удала выкарыстала вынаходлівая і прадпрымальная мадам Кліко. У 1814 годзе яна на сваю рызыку без звыклых сёння кантракта і перадаплаты накіравала ў Расію вялікую партыю ігрыстага. Камерцыйны поспех быў ашаламляльны. Мадам Кліко набыла велізарны рынак збыту і вядомасць не толькі ў гусарскіх колах. За ёй у Расію пацягнуліся іншыя вытворцы шампанскага.

Але не вельмі доўга яны там манапольна правілі баль. Расійскія арыстакраты, напрыклад, граф Варанцоў, упарта метадам спроб і памылак шукалі рэцэпт вырабу ігрыстага. Больш за іншых пашанцавала князю Льву Галіцыну. У яго крымскім маёнтку «Новы свет» пасля шматгадовых эксперыментаў нарэшце было вырабнена айчыннае ігрыстае, не горшае за французскае. Князь засяродзіўся на ўдасканаленні напою і настолькі прасунуўся ў сваіх вопытах, што ў 1900 годзе ў Парыжы на Сусветнай выставе (аналаг цяперашніх ЭКСПА) атрымаў вышэйшую ўзнагароду — Гран-пры. Французы былі і здзіўлены, і засмучаны адначасова: з'явіўся сур'ёзны канкурэнт.

АД ЛЕГЕНДАЎ ДА НАШЫХ ДЗЁН

Сапраўды, французы — выдатныя вытворцы напояў. Але і беларусы ў гэтай справе дасягнулі пэўных вышынь. Хоць выраб ігрыстага — надзвычай тонкая і даволі затратная справа.

Прыкладна з адной тоны вінаграду атрымліваецца максімальна 750—800 літраў матэрыялу. На вытворчасць ігрыстага ідуць толькі першыя 380—480 літраў. Бо яны самыя чыстыя — як слёзы, астатнія літры ўжо ўтрымліваюць вінаградныя завісі. Такім чынам, найбольш празрыстая частка маладога матэрыялу ў велізарных цыстэрнах завозіцца на завод. І над гэтай сыравінай пачынаецца карпатлівая праца.

Не будзем падрабязна пераказваць усю тэхналогію вытворчасці ігрыстага. Адзначым, што у нечым гэты працэс нагадвае працу ювеліра: ідзе шліфоўка, агранка, даводка грубай сыравіны. І ў выніку на выхадзе атрымліваецца неабходная гармонія і той унікальны смакавы букет, які заўсёды адрозніваe сапраўднае ад іншых напояў, у прыватнасці, шыпучых. Прадукцыя мінскага завода мае светла-саламяны, з лёгкім зеленаватым адценнем колер, чысты, гарманічны смак і тонкі суладны водар.

Заключная стадыя вытворчасці напою — мастацкае афармленне бутэлькі. На мінскім прадпрыемстве гэтаму ўдзяляюць вялікую ўвагу. Ігрыстае разліваецца толькі ў новую бутэльку. У старую, якая была ў карыстанні, яно проста «не ідзе». У такую бутэльку можна заліць толькі шыпучае віно. Прадукцыя мінскага завода ўпрыгожыць любы святочны стол, і асабліва — 8 Сакавіка. Без тоста за каханых і дарагіх жанчын з келіхам гэтага без перабольшвання элітнага напою сапраўдныя мужчыны не ўяўляюць гэтага цудоўнага свята.

Ігрыстае — цудоўны напой для вялікай кампаніі і для дваіх.

Дарэчы, нямала натуральных напояў завода носяць жаночыя імёны: «Ізабэла», «Лідзія», «Земфіра» і г. д.

Слова генеральнаму дырэктару завода Л. Д. КРАЎЧУКУ

ААТ «Мінскі завод ігрыстых вінаў» — гэта сучасныя тэхналогіі плюс традыцыі роднасных прадпрыемстваў з векавой гісторыяй і сусветнай вядомасцю. Прадукцыя завода вось ужо амаль трыццаць гадоў карыстаецца ўстойлівым попытам у айчынных і замежных спажыўцоў. Гэтаму ў многім садзейнічае высокакваліфікаваны персанал і інвестыцыі ў сучаснае абсталяванне. Тэхналогія вырабу ігрыстых і іншых напояў, сучасныя імпартныя лініі разліву цалкам адпавядаюць еўрапейскім стандартам.

Якасць вінаградных напояў таксама забяспечваецца лепшымі матэрыяламі з адборных гатункаў вінаграду. Яны дастаўляюцца з паўднёвай кліматычнай зоны Малдовы.

Пра ўзровень якасці вырабаў сведчыць сертыфікацыя завода ў адпаведнасці з STB ISO 9001-2001 у нацыянальнай сістэме сертыфікацыі і ў нямецкай сістэме TGA DAR, а таксама ў сістэме кіравання якасцю прадуктаў харчавання на падставе прынцыпаў аналізу рызыкі і крытычных кантрольных пунктаў (HACCP).

Мы задаволены тым, што ўсё большай папулярнасцю ў насельніцтва карыстаюцца сталовыя вырабы, лёгкія гатунковыя вінаградныя напоі «Кабернэ», «Кадарка», «Мерло», «Савіньён», «Сапераві», «Піно Фран», «Шардонэ», «Алігатэ», «Кабернэ-Савіньён». Кожны з іх выпускаецца трох марак: сухое, паўсухое і паўсаладкае. Такім чынам, ёсць магчымасць выбраць свой напой. Хутка ў асартыменце завода будуць прысутнічаць вінаградныя натуральныя спецыяльныя паўдэсертныя і дэсертныя напоі.

ВЫБЕРЫ СВОЙ НАПОЙ

Найстражэйшае захаванне тэхналагічнага працэсу, творчы падыход, які заключаецца ў асэнсаванні і выкарыстанні вопыту лепшых папярэдніх і сучасных вытворцаў, дае плён. Аб гэтым сведчаць шматлікія ўзнагароды, у тым ліку 95 медалёў — вынік удзелу ў міжнародных конкурсах-дэгустацыях у Маскве і Санкт-Пецярбургу, Ялце і Кішынёве.

Чатыры гады запар завод перамагае ў конкурсе «Выбар года» ў намінацыі «Айчынны вінароб №1», сем разоў станавіўся лаўрэатам конкурсу «Прадукт года». У конкурсе «Лепшыя тавары Рэспублікі Беларусь» у розныя гады пераможцамі выходзілі ігрыстыя напоі «Леў Галіцын», «Троіцкае», «Князь Вітаўт», «Савецкае ігрыстае», «Сталічнае».

Па-ранейшаму самым запатрабаваным брэндам прадпрыемства з'яўляецца серыя «Савецкага шампанскага»: «Залатое», «Хрустальнае», элітнае «Радзівіл». Апошняе п'юць з задавальненнем англічане.

Леанід ТУГАРЫН.

Штогод папаўняецца багатая заводская калекцыя медалёў. Зараз іх ужо амаль сотня.

VIVASAN — ВОЛШЕБНОЕ ПРИКОСНОВЕНИЕ ПРИРОДЫ

Компания «Вивасан» является Генеральным представителем в России, СНГ, Прибалтике, Европе и Азии ряда крупных швейцарских фирм — производителей косметических средств и натуральных ароматических масел, а также итальянской декоративной косметики, изготавливаемых только из натуральных компонентов.

Vivasan — 10 лет на рынке.

ТЕЛЕФОН: 37517-290-22-92.

Запрашальнік

Для мілых і родных

20-годдзе творчай дзейнасці спявак Аляксандр Саладуха адзначае з размахам. Прэзентаваў 6-ы па ліку кампакт-дыск «Кахаць цябе, родная». Арганізаваў вялізны гастрольны тур. А 7 сакавіка яшчэ дасць сольны канцэрт у КЗ «Мінск», сумяшчаючы першае і другое: парадак песень у праграме адпавядае трэк-лісту альбома.

На канцэртах Аляксандра звычайна ўсё адбываецца строга паслядоўна: два выхады па 8 песень. Кожны выхад, у сваю чаргу, складзены з дзвюх частак — лірычная і шансон. У другім выхадзе спявак змяняе касцюм і вобраз, прадстаўляючы слухачам найбольш «фарматную» частку творчасці — хіты «Вінаград», «Чужая мілая», «Сотні кіламетраў да кахання», «Не перажывай», «Няроўны шлюб» і г.д.

Прыкладна гэтак і будзе на гэты раз у аднайменным з дыскам канцэрце. Толькі да песень яшчэ абавязкова дададуцца цёплыя словы ў адрас жанчын — іх (у сэнсе, словы) спявак заўжды прамаўляе з уменнем і вялікай ахвотай. Білеты на выступленне, дарэчы, ці то ў гонар свята, ці то як знак любові да прыхільнікаў нават па беларускіх мерках недарагія — ад 15 да 60 тысяч беларускіх рублёў. Словам, было б жаданне слухаць, а песень хопіць...

Вікторыя ЦЕЛЯШУК.

7 сакавіка

Дзве даты

321 год — па рашэнню рымскага імператара Канстанціна Вялікага нядзеля аб'яўляецца выхадным днём.

1768 год — па дагавору Расіі і Польшчы праваслаўныя і католікі атрымалі роўныя правы на тэрыторыі Рэчы Паспалітай.

Цытата дня:

«Войска бараноў, якое ўзначальвае леў, заўсёды атрымае перамогу над войскам ільвоў, якое ўзначальвае баран».

Напалеон Банапарт (1769—1821), французскі імператар.

*Сардэчна віншуем нашу мілую, дарагую сястрычку, любячую матулю і клапатлівую бабулю **Зінаіду Цімафееўну ФІЯЛКОЎСКУЮ** з г. Бялынічы з 60-годдзем.*

Мы шчыра жадаем у дзень юбілею:
Хай радасць і шчасце сэрца сагрэюць,
Хай добрыя весткі прыходзяць у хату
І стол на прысмакі хай будзе багатым.

З павагай сем'і Мазжаравых, Паслядовічаў, Корань.

ВІНШУЕМ!

*з 50-годдзем паважанага чалавека, добрага сябра, дзелавога кіраўніка **ПУЧКО Уладзіміра Уладзіміравіча.***

Жадаем юбіляру добрага здароўя, жыццёвага шчасця і новых творчых поспехаў.

Сябры.

У сувязі са святамі наступны нумар газеты «Звязда» выйдзе ў суботу, 10 сакавіка.

РУП «Белспецконтракт» реализует:

Автомобильную технику: ГАЗ, ЗИЛ, КРАЗ, «УРАЛ», КАМАЗ, МАЗ, УАЗ, ремкомплекты и запчасти к ним, прицепы и полуприцепы, дорожно-строительную технику, краны башенные, электрокары, спецтехнику: топливозаправщики, автоцистерны, маслозаправщики, авиационно-подвижные электроагрегаты, унифицированные компрессорные станции, кузовы-фургоны, кунги, прицепы-цистерны, погрузчики и самопогрузчики, ремонтные мастерские и станки, электростанции и электроагрегаты, медицинскую технику и имущество, технику и имущество ветеринарного управления, технику и имущество продовольственного управления, технику и имущество СА вещевого управления, технику и имущество химического управления, приборы, лодки резиновые, палатки, парашюты и купола, связные и радиочастотные кабели, бочки, канистры, перекачивающие станции, ЖД-цистерны и многое другое — всего более 1000 наименований.

Полный перечень реализуемой техники/имущества будет опубликован в газете «Звязда» 14 марта.

Прайс-лист (полный перечень) можно посмотреть в Интернете по адресу: www.belspeckontrakt.com

Справки по телефонам в отделе реализации: (017) 224-20-01, 278-06-97.

Сёння

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	6.45	17.57	11.12
Віцебск —	6.36	17.46	11.10
Магілёў —	6.35	17.48	11.13
Гомель —	6.30	17.46	11.16
Гродна —	7.00	18.13	11.13
Брэст —	6.59	18.15	11.16

Месяц

Поўня 4 сакавіка.
Месяц у сузор'і Скарпіёна.

Імяніны

Пр. *Ірыны, Апанаса, Віктара, Івана, Іосіфа, Леаніда, Міхаіла, Пятра, Уладзіміра, Фёдара.*
К. *Пярпетуі, Феліцыты, Паўла, Тамаша.*

Надвор'е на заўтра



…у суседзяў

ВАРШАВА	+12 — +14 °C	МАСКВА	+1 — +3 °C
ВІЛЬНЮС	+7 — +9 °C	РЫГА	+4 — +6 °C
КІЕЎ	+7 — +9 °C	С-ПЕЦЯРБУРГ	+2 — +4 °C

Без ападкаў

Усміхнёмся!

Ёсць два спосабы кіраваць жанчынамі. Але іх ніхто не ведае…

☺

— Што значыць для мужчыны «дапамагаць па гаспадарцы»?

— Падымаць ногі, калі жанчына мяце.

☺

Для каханай жанчыны шчаслівейшым за дзень 8 Сакавіка можа быць толькі ноч на дзевятае.

☺

«Дарагая Марыя Мікалаеўна! Тэлеграму аб вашым прыездзе атрымалі. Чакаем. У астатнім усё добра. Зяць, які вас любіць».

☺

Матывацыя паводзінаў жанчыны ў магазіне даволі простая: «Я не бачу тое, што хачу, і не хачу тое, што бачу».

☺

Без жанчыны я ніколі б не даведаўся, што USB-кабель цудоўна падыходзіць у Ethernet-раз'ём.

*Віншуем са светлым жаночым днём 8 Сакавіка абаяльную, прыгожую, пяшчотную жанчыну, любячую маці **Людмілу Казіміраўну МАЦЯСОВІЧ,** а таксама ўсіх яе сябровак і супрацоўніц, прыгажунь-навапалачанак. Добрага вам здароўя, узаемнага кахання, шчаслівых сонечных дзён.*

Сябры, калегі па працы.

*Віншую бабуль **Зінаіду, Галіну, маму Святлану,** сястрычак **Вераніку і Стафанію** з 8 Сакавіка! Зычу здароўя і ласкавага сонейка. Я вас усіх люблю!*

Ігнат Цехановіч.

ЗВЯЗДА
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ:
Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь
РЭГІСТРАЦЫЙНЫ НУМАР 1.

Галоўны рэдактар У. НАРКЕВІЧ.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: І. БАРАНОЎСКІ, С. ГРЫБ, У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, Л. ЛАХМАНЕНКА, А. МЯСНІКОЎ, Т. ПАДАЛЯК, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, І. ШЧУЧЭНКА.

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287-19-19; аддзелаў: пісьмаў — 287-18-64, падпіскі і распаўсюджвання — 287-18-51, юрыдычнага — 287-19-68, сакратарыята — 292-05-82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292-44-12; «Мясцовае самакіраванне» — 292-21-03, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20-37-98, Віцебску: 24-31-92, Гродне: 43-25-29, Гомелі: 74-13-92, Баранавічах: 7-26-02, Магілёве: 32-74-31; бухгалтэрыі: 292-22-03; даведкі па рэкламе і аб'явах тэл./факс: 287-17-79, *e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by*, рэдактар рэкламнага аддзела — тэл./факс 292-04-52.

html: www.zvyazda.minsk.by **E-mail:** info@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя пакідае за сабой права не ўступаць у перапіску з аўтарамі. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку».
Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.
Тыраж 37.095. Індэкс 63850. Зак. № 1314. Нумар падпісаны ў 19.30.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12